74.3(С
Л 52

ЛЕТНІЯ СВЯТЫ





Бібліятэчка
народных
святаў
і прысвяткаў





Укараненне ў практыку адукацыі традыцый народнай педагогікі

Добры пачатак укаранення ў працэс навучання і выхавання народных педагагічных традыцый быў закладзены ў 20-ых гадах XX ст. Гэтаму плённа садзейнічала палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва адраджаемай Беларусі, што ўвайшла ў гісторыю пад назвай беларусізацыі. У адукацыйнай сферы быў узяты накірунак на развіццё працоўнай школы і роднай мовы навучання. Дзеля падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі новых педагагічных кадраў пашыралася сістэма курсаў і гурткоў беларусазнаўства. У Менску і Маскве, напрыклад, яны праводзіліся з 1918 года. Акрамя таго, у 1921 годзе адкрыўся БДУ і ў наступным — Інстытут беларускай культуры. Беларусізацыяй было ахоплена амаль усё насельніцтва: працоўныя калектывы, войска, урад...

Сярод педагогаў ішоў працэс пошуку шляхоў стварэння нацыянальнай школы на аснове ідэй народнай педагогікі, з улікам вопыту Цёткі, К. Каганца, Я. Коласа і іншых. Станоўчым прыкладам выкарыстання прагрэсіўных ідэй народнай педагогікі ў навучальна-выхаваўчым працэсе з'явіліся "Программы советской единой трудовой школы 1-й и 2-й ступени" (Мн., 1919). Так, у планах па вуснай народнай славеснасці ўпершыню ў дакуменце рэкамендавалася вывучаць народную творчасць на роднай мове, самастойна адбіраючы з багатай спадчыны найбольш карыснае і прагрэсіўнае, выкарыстоўваючы рэгіянальны фальклорны матэрыял, вывучаючы прадмет паводле "працоўнага года-календара". Падкрэслівалася, што ў навучальна-выхаваўчы працэс уводзіцца "прынцып этнаграфічны, прынцып жывога бытавання з'яў вусна-народнай славеснасці" (с. 14). У прыватнасці, у гэтых планах значылася: "Знаёмства (заснаванае на асабістым вопыце вучняў) са з'явамі вуснай народнай творчасці. Жыццёвае бытаванне яе ў рамках народнага календара. Знаёмства з народным календаром...

Сустрэча вясны, вясенняя абрадавая лірыка (гульнёвая і карагодная), вясенніе святы.

Абрады пахавання і памінання памёршых. Радуніца. Сямік, пахавальнае галашэнне.

Летнія святы, абрады і абрадавая лірыка, звязаная з земляробствам. Назіранні над адлюстраваннем асобы выканаўцы ў творах народнай славеснасці. Некаторыя назіранні над традыцыйнымі прыёмамі творчасці ў лірыцы, у эпасе..."[1].

Пры гэтым культурна-нацыянальны кампанент таксама ўлічваўся ў праграмах іншых прадметаў, напрыклад гісторыі, матэматыкі, геаграфіі, музыкі і спеваў. Вялікая ўвага надавалася народным гульням і гульнёваму элементу ў навучанні і выхаванні. Разглядаемыя "Программы" (1919 г.) выглядаюць даволі прагрэсіўнымі нават для сучаснай педагагічнай навукі. Даводзіцца цяпер толькі шкадаваць, што курс на беларусізацыю, які станоўча ўплываў на развіццё і выкарыстанне народнай педагогікі і этнапедагогікі, як дэмакратычныя галіны эмпірычных ведаў беларусаў, якія паслядоўна выцякаюць з жыццёвага вопыту народа і здольныя на гарманічнае спалучэнне нацыянальных і міжнацыянальных педагагічных дасягненняў, быў гвалтоўна перарваны антынацыянальнымі рэпрэсіямі 30-ых гадоў. Такім чынам, этнапедагогіка, і беларуская педагагічная навука ў цэлым, страціла ў сваім развіцці паўстагоддзя.

Новы перыяд беларусізацыі ў пачатку 90-ых гадоў XX ст. адзначаецца паваротам да спрадвечных педагагічных традыцый нашага народа. Поруч з агульным нацыянальна-адраджэнскім уздымам у розных галінах дзейнасці спаквяля развіваецца ідэя стварэння сапраўды нацыянальнай школы. Зноў, як і раней, пачалося з курса беларусазнаўства. Дарэчы, падобныя дысцыпліны былі ўключаны ў школьныя праграмы некаторых рэспублік былога СССР. На Украіне, дзе лепш, чым у беларусаў, захаваліся народныя традыцыі і родная мова, з 1991/92 навучальнага года "Народазнаўства" ўводзіцца ва ўсіх класах. Крыху пазней руская мова пераводзіцца ў разрад факультатыўных курсаў.

З 1990 года ў асобных школах Беларусі пачало эксперыментальна вывучацца "Беларусазнаўства". Затым былі выпушчаны праграмы і метадычныя распрацоўкі курса ў чатырох зборніках[2] для 1—11 класаў. Адзін толькі пералік іх раздзелаў красамоўна гаворыць аб насычаным змесце навучальных дапаможнікаў: "Беларускія народныя гульні, карагоды", "Фальклор, яго літаратурная апрацоўка", "Беларуская лялька", "Старажытныя абрады, звычаі, забавы. Беларускі народны каляндар", "Легенды і паданні зямлі беларускай", "Народнае мастацтва", "Краязнаўства", "Этнаграфія беларусаў", "Беларуская музыка", "Народнае дойлідства Беларусі".

Шэрагам дапаможнікаў вылучаецца новая серыя "Бібліятэчка народных святаў і прысвяткаў"[3] для настаўнікаў і выхавальнікаў, якія знаходзяць у ёй матэрыялы як для падрыхтоўкі традыцыйных святаў, так і для выкарыстання твораў народнай культуры, сродкаў народнай педагогікі на ўроках, у пазакласнай і пазашкольнай рабоце.

У праграмы навучальна-выхаваўчых устаноў пачаў уводзіцца нацыянальна-культурны кампанент, і ў гэтым накірунку абнаўляўся змест падручнікаў. Стала вядома дзейнасць беларускіх педагогаў, цэлых калекты-

---

[1] Больш падрабязна аб "Программах" можна даведацца з кнігі Г. Арловай "Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы" (Мн., 1995. С. 23—31).

[2] Беларусазнаўства / Кір. творч. калект. А. Лозка. Зб. № 1. Мн., 1992; Зб. № 2. Мн., 1993; Зб. № 3. Мн., 1993; Зб. № 4. Мн., 1994.

[3] Восеньскія святы / Уклад. А.Ю. Лозка. Мн., 1995; Зімовыя святы / Аўт.-укл. А. Аляхновіч, А. Лозка. Мн., 1999; Веснавыя святы / Аўт.-укл. А. Аляхновіч, А. Лозка. Мн., 2000.

ваў, якія нямала дасягнулі ў нацыянальна-патрыятычным выхаванні, эфектыўным выкарыстанні сродкаў і метадаў народнай педагогікі. Такім з'яўляецца заслужаны работнік культуры Алесь Белакоз з Мастоўскага раёна, які ў сваёй Гудзеевіцкай школе яшчэ ў 1965 годзе заснаваў цэлы комплекс вясковых музеяў. У ім няўрымслівы настаўнік разам з вучнямі аформіў этнаграфічную экспазіцыю ў выглядзе сялянскай хаты, асобныя музеі (будынкі) ільну і народнага ткацтва, народнай медыцыны, літаратурна-краязнаўчы, гісторыі школы. І ўсё гэта плённа працавала на навучанне і выхаванне школьнікаў.

Такой жа арыгінальнай і па-свойму адметнай установай з'яўляўся Дулебскі дзіцячы дом-школа-сад Бярэзінскага раёна, якім кіраваў выдатнік асветы Мікалай Грудзінскі. Па вызначэнні лідэра ўстановы, галоўнай задачай яе з'яўляецца "выхаванне самасвядомых дзетак-беларусаў, адраджэнне беларускай народнай культуры, вывучэнне гістарычнай нацыянальнай і культурнай спадчыны роднага краю, адраджэнне народных промыслаў, вывучэнне народных гульняў, што азначае выхаванне дзяцей на народных традыцыях, сродкамі народнай педагогікі"[1]. Дзеля вырашэння яе школьнікі вывучаюць факультатыўны курс "Спадчына роднага краю", які складаецца з шасці раздзелаў: старажытная Беларусь, гістарычная спадчына Бярэзінскага раёна, культурная спадчына раёна, экалогія раёна, Бярэзіншчына-партызанка, вёска Дулебы — старажытная вёска. Ва ўстанове працуе лялечны тэатр, секцыя "Беларускія народныя гульні", гурткі пляцення, якімі кіруюць вясковыя ўмельцы, дзейнічае гурт народнай песні "Дулебцы", у якім удзельнічаюць дарослыя і дзеці, і танцавальны калектыў "Лявоніха", працуе школьны завод "Дулебскія ўмельцы", што выпускае кухонныя наборы, драўляныя лыжкі, хлебніцы і інш. Педагагічны калектыў актыўна прапагандуе сваю дзейнасць, выпускае метадычныя дапаможнікі ("Беларускія народныя гульні", "Народны лячэбнік" і інш.). Выхаванне нацыянальнай свядомасці і музычна-эстэтычных схільнасцей пачынаецца з дзіцячага садка, што знаходзіцца ў адным комплексе са школай і дзіцячым домам.

Як яскравы прыклад нацыянальна-патрыятычнага выхавання ў пазашкольнай рабоце стала вядома з 1990 года дзейнасць першага беларускамоўнага не піянерскага летніка "Грунвальд", які арганізаваўся Гарадскім бацькоўскім камітэтам Мінска (існаваў з 1988 г.) у Дзяржынскім раёне[2].

На агульным фоне ўсё-такі недастатковай працы, на нашу думку, органаў адукацыі па развіцці роднай мовы і ўкараненні традыцый народнай педагогікі ў навучальна-выхаваўчы працэс цяпер усё ж маюцца ў кожным абласным цэнтры, сельскіх раёнах і гарадах узорныя дзіцячыя садкі, школы і іншыя ўстановы асветы, што працуюць у згаданым накірунку, дзейнасць якіх трымаецца на самаахвярным энтузіязме сапраўдных педагогаў.

Былі спробы аб'яднання аднадумцаў у грамадскую асацыяцыю "Беларуская народная педагогіка", якая вылучала ў будучай дзейнасці наступныя прынцыпы: падтрыманне гуманістычных і дэмакратычных ідэалаў народа, прызнанне прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, гарманічнае спалучэнне нацыянальных і міжнацыянальных інтарэсаў, пераемнасць народнай і навуковай педагогікі ў сістэме няспыннага выха-

---

[1] Грудзінскі М. Як "буслы" вярнуліся ў гняздо: Адкрыўшы дзіцячы сад, школа вырашала праблему сацыяльную // Наст. газета. 1993. 10 лістап.

[2] Гл.: Лозка А. Беларускі скаўтынг. Мн., 1997; ён жа. Скаўтынг у летніку "Грунвальд" // Роднае слова. 1992. № 3. С. 59—62.

вання і адукацыі, дыялектычнае адзінства традыцый і наватарства ў стварэнні педагогікі будучыні, арыентацыя на падрыхтоўку падрастаючага пакалення да жыцця і працы з улікам прагрэсіўных нацыянальных педагагічных традыцый і прыродаадпаведнасці выхавання[1]. Шкада, што добрая ідэя пакуль не ўвасобілася ў актыўнае жыццё.

Гэты прабел у сілу сваіх магчымасцей, на нашу думку, запаўняе канкрэтнай справай Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай школы", створанае ў 1996 годзе на базе пашырэння Гарадскога бацькоўскага камітэта. ТБШ, у прыватнасці, апякуецца дзейнасцю педагагічных пляцовак "Этнашкола", канцэпцыя якіх была распрацавана ў 1991—1992 гадах кандыдатам мастацтвазнаўства Іллёй Сучковым. "Этнашколаўцы" маюць на мэце стварэнне магчымасцей для выхавання нацыянальна свядомага школьніка, які акрамя базавай атрымлівае эстэтычную адукацыю, грунтам якой з'яўляецца народная культура. Сродкі яе авалодання — дысцыпліны этнамастацкага цыкла: фальклорны тэатр, харэаграфічны фальклор, фальклорныя спевы і музыка, традыцыйнае ўжытковае мастацтва. Вялікая ўвага надаецца традыцыйным каляндарным святам і абрадам, народным гульням, выкарыстанню рэгіянальнага фальклору. Вопыт дзейнасці грунтоўна выкладаецца ў спецыяльнай серыі дапаможнікаў для настаўніка "Беларускі фальклор у школе"[2], аўтарамі якіх сталі педагогі Сенніцкай СШ імя Я. Купалы Мінскага раёна і СШ № 89 г. Мінска, дзе ўпершыню эксперымент і быў праведзены. Актыўна і паспяхова пачалі дзейнічаць "Этнашколы" ў розных кутках Беларусі: Мінску, Гомелі, Магілёве, Вілейцы, Наваполацку, Дзяржынскім раёне і інш.

Педагогі Беларусі Г. Арлова, Г. Барташэвіч, В. Ліцьвінка, А. Грымаць, С. Снапкоўская, І. Калачова і інш. пачалі паспяхова распрацоўваць розныя пытанні народнай педагогікі.

Былі адкрыты кафедры беларусазнаўства ў ВНУ. З'явіліся адпаведныя дапаможнікі па гэтаму курсу[3]. У БДПУ імя М. Танка сталі рыхтаваць педагогаў па спецыяльнасці "Сусветная і айчынная мастацкая культура і фальклорнае мастацтва". Можна было б шмат прыводзіць падобных прыкладаў, але праблем, звязаных з развіццём беларускай традыцыйнай культуры і мовы, таксама дастаткова. Тут мы хочам засяродзіць увагу на некаторых дыскусійных пытаннях методыкі ўвасаблення традыцыйнай каляндарнай культуры ў навучальна-выхаваўчым працэсе.

Той, хто карыстаецца нашымі дапаможнікамі, павінен ведаць, што ў іх змешчаны фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, якія прызначаюцца для: 1) тэарэтычнага вывучэння розных пытанняў беларускай народнай культуры і 2) практычнага асваення лепшых здабыткаў традыцыйнай спадчыны дзіцячымі і маладзёжнымі калектывамі. Менавіта **асваенне**, якое накіравана на ўзнаўленне традыцый, — так неабходна называць тую працу, што вядзецца ў розных навучальна-выхаваўчых установах па арганізацыі святаў народнага календара. Такі фальклор спецыялісты называць другасным. Таму што тут нельга гаварыць пра аўтэнтыку, бо цяпер дзеці не з'яўляюцца сапраўднымі носьбітамі вуснай народнай творчасці ў бытавых умо-

---

[1] Арлова Г. Збіраем аднадумцаў // Наст. газета. 1991. 14 снеж.

[2] Беларускі фальклор у школе. 1—3 класы: Дапаможнікі для настаўніка / І.І. Сучкоў і інш. Мн., 1996; 2000; 2001.

[3] Беларусазнаўства: Навучальны дапаможнік БДУ /Навук. рэд. П. Брыгадзін. Мн., 1997; 1998; Саракавік І. Беларусазнаўства. Мн., 1998.

вах. А тое, што яны атрымліваюць ад сваіх педагогаў, па аб'ектыўных прычынах схільна да трансфармацыі. Дарэчы, у педагагічнай і фальклорнай літаратуры пытанні фальклярызму ў навучальна-выхаваўчым працэсе, звязаным з асваеннем народных святаў, абрадаў і звычаяў, вывучаны недастаткова.

Лепш распрацаваны пытанні пераасэнсавання народнай песні на самадзейнай сцэне, вызначаны крытэрыі яе фальклорнасці, тыпы фальклярызму ў харавой самадзейнасці. Найперш гэта працы А.М. Аляхновіча[1], В.Е. Гусева[2] і іншых. Так, пры дапамозе шасці тыпаў фальклярызму ў харавой самадзейнасці, вызначаных Алегам Аляхновічам (с. 41), можна вылучыць і тыпы па ступені складанасці асваення народных святаў, абрадаў і звычаяў, што бачна ў наступнай табліцы.

Тыпы фальклярызму

У харавой самадзейнасці *(паводле А. Аляхновіча)*	**У школьных калектывах** *(адносна святаў)*
1	2
1. Традыцыйны фальклор, прадстаўлены жывымі носьбітамі традыцый.	Не існуе. Часткова назіраецца ў быце, як удзел дзяцей праз гульні, некаторыя звычаі ў народных святах.
2. Другасны фальклор, які асвойваецца маладзёжнымі калектывамі, зарыентаванымі на ўзнаўленне традыцыйнай народнай творчасці.	Свята, у якім выкарыстоўваецца другасны фальклорна-этнаграфічны матэрыял, што засвойваецца школьнымі калектывамі, зарыентаванымі на рэгіянальнае ўзнаўленне народных традыцый дарослых.
3. Апрацаваны фальклор з улікам нацыянальных і мясцовых песенных традыцый.	У сцэнарыі свята — не толькі апрацаваныя песні, абрады, звычаі, гульні не заўсёды з улікам рэгіянальных асаблівасцей, але з беражлівымі адносінамі да іх нацыянальнай спецыфікі.
4. Песні самадзейных аўтараў і кампазітараў, асобных калектываў і іх удзельнікаў, якія прайшлі працэс фальклярызацыі.	Не існуе.
5. Стылізаваны фальклор, дзе песенная традыцыя выкарыстоўваецца не самастойна, а ў сінтэзе слоўных, музычных, драматычных, харэаграфічных, этнаграфічных элементаў.	У стылізаваным школьным свяце падкрэсліваюцца характэрныя рысы народнага звычаю, выкарыстоўваецца апрацаваны і стылізаваны фальклор у тых межах, што дазваляюць умоўнае пазнанне народных традыцый без скажэння іх сутнасці.

[1] Аляхновіч А.М. Народная песня ў мастацкай самадзейнасці. Мн., 1991.

[2] Гусев В.Е. Фольклорные ансамбли как форма современного фольклоризма // Традиции и современность в фольклоре. М., 1988.

1	2
6. Рэстаўрыраваны і рэканструяваны фальклор, які знік з ужытку.	Аднаўленне (рэстаўрыраванне) народнага свята ў першапачатковым выглядзе калі можа быць, то толькі ўмоўна. Рэканструяванне мае на мэце аднаўленне толькі агульных мастацкіх, эстэтычных, стылістычных і функцыянальных уласцівасцей народнай традыцыі.

Мы лічым, што вельмі важным момантам у аднаўленні народных традыцый школьнымі фальклорна-этнаграфічнымі, як і ў цэлым самадзейнымі, калектывамі з'яўляецца правільнае вызначэнне формаў і тыпаў фальклярызацыі народнай песні, свята, абраду. І абавязковае агучванне назвы адноўленай традыцыі і тыпу калектыву.

Тыпы калектываў вызначаюцца па адносінах да фальклорнай спадчыны. Калектывы бываюць:

- аўтэнтычныя (жывыя носьбіты фальклору ў натуральным бытаванні);
- фальклорныя і этнаграфічныя (у складзе маюцца жывыя носьбіты народных традыцый і ў рэпертуары — рэгіянальныя творы);
- мастацкай самадзейнасці;
- школьныя і маладзёжныя.

Існуюць наступныя віды выканальніцкага твора (песні, свята, абраду і г.д.):

- аўтэнтычны (не існуе ў мастацкай самадзейнасці і школьных калектывах);
- народны, традыцыйны, фальклорны (максімальна дакладнае ўзнаўленне традыцыі калектывамі мастацкай самадзейнасці ці школьным, маладзёжным калектывамі з улікам рэгіянальных, каляндарных і іншых асаблівасцей, напр. народнае свята "Багач" у выкарыстанні школьнага фальклорнага калектыву);
- на аснове народных традыцый, сцэнічны (найбольш ужывальны, які дапускае пэўную апрацоўку, адыход ад рэгіянальных асаблівасцей, але з захаваннем нацыянальных);
- апрацаваны;
- стылізаваны;
- рэстаўрыраваны;
- рэканструяваны.

Уключэнне ў свята літаратурных і іншых мастацкіх твораў (нават фальклорных з іншых пазакаляндарных і пазаабрадавых жанраў) не можа лічыцца народным святам, а проста школьным (напр., свята ўраджаю ў выкананні школьнага фальклорнага калектыву).

Наогул катэгарычна не дапускаецца змешванне і перанясенне з іншых святаў (прысвяткаў) пэўных звычаяў, абрадаў, гульняў, песень, танцаў, прыкмет, прымавак і г.д.

Працэс асваення школьнымі калектывамі народных святаў непазбежна прыводзіць да пэўнай трансфармацыі народнай традыцыі і страты асобных фальклорных якасцей. Гэта неабходна ўсвядоміць. Але гэты працэс

павінен звязвацца з сучаснасцю, кампенсавацца павышэннем мастацка-эстэтычных функцый інтэрпрэтуемага.

Для дзяцей народнае свята — гэта вясёлая забава, натуральны, без назойлівай дыдактыкі, урок. Абрад таксама цяпер для іх згубіў магічныя функцыі і ўспрымаецца як гульня.

Шкада, што аб'ектыўныя заканамернасці ў пераасэнсаванні народных традыцый поўнасцю не ўсвядомлены некаторымі педагогамі і фалькларыстамі. Гэтаму сведчанне — асобныя дыскусіі, што ўзнікаюць у прэсе і навуковай літаратуры, выхад дапаможнікаў з павярхоўным адлюстраваннем праблем і скажоным разуменнем крытэрыяў фальклорнасці, з яўнымі памылкамі ў падачы традыцыйнага матэрыялу, яго адаптацыі дзеля навучальна-выхаваўчых патрэб.

У якасці падагульнення вылучым асноўныя прынцыпы арганізацыі і правядзення школьнага свята на аснове фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу, якія спатрэбяцца педагогу ў актыўнай практычнай дзейнасці.

1. У сцэнарыі святаў лепш уключаць разнажанравы матэрыял адпаведнага свята ці прысвятка народнага календара, з іншага — не дапускаецца дзеля захаванасці межаў абрадаў і звычаяў.

2. У мэтах узбагачэння традыцыі дапускаецца тэматычны адбор матэрыялу з іншых некаляндарных жанраў і ведаў народнай культуры (прыказкі, загадкі, песні, гульні, танцы, паданні і г.д.). Некаторая частка тэкстаў можа мець літаратурнае паходжанне, асабліва словы вядучага, калі ён прадугледжаны сцэнарыем.

3. Уключаецца адпаведная святочная атрыбутыка, іншы этнаграфічны матэрыял, прылады дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

4. Вельмі прыдатна выкарыстанне ў сцэнарыях святаў рэгіянальнага прынцыпу, іх напаўненне слоўна-музычным і іншым этнаграфічна-мастацкім зместам, г. зн. максімальнае ўжыванне разнастайнага мясцовага матэрыялу.

5. У назве свята не могуць ужывацца прамыя азначэнні тыпу "аўтэнтычнае", "народнае". Трэба выкарыстоўваць такія азначэнні, як "школьнае", "дзіцячае", "на аснове (паводле) народных традыцый", "з выкарыстаннем фальклорнага матэрыялу" і г.д. Гэта тлумачыцца адпаведным узроўнем фальклярызацыі свята, якое звязана з абавязковай трансфармацыяй традыцыі, звычаю пры пераносе іх у дзіцячае (маладзёжнае) ці іншае асяроддзе. Для дзяцей абрад часцей ужо выступае ў якасці гульні і забавы.

6. Сцэнарый павінен быць напісаны на роднай мове і адпаведна на ёй жа праводзіцца.

Алесь Лозка





ЛЕТНІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

Летам бывае самы вялікі дзень і самая кароткая ноч. Гэта — 22 чэрвеня, калі святло пануе больш за 17 гадзін. Сонечныя прамяні ў гэтую пару ўтвараюць з паверхняй зямлі найбольшы вугал — у Мінску амаль 60 градусаў.

Да дня сонцастаяння прымеркавана асноўнае летняе свята Купалле, якое перасунута больш на начны час, 23—24 чэрвеня ў католікаў, 6—7 ліпеня ў праваслаўных. Беларускія назвы месяцаў адпавядаюць прыродна-кліматычным умовам краю, не зведалі лацінскага ўплыву, захавалі сваю самабытнасць і старажытнасць (назвы месяцаў многіх народаў можна параўнаць па табліцы — гл. с. 137).

Прадстаўляючы наступны народны каляндар, мы імкнуліся падаць кароткую характарыстыку летніх святаў і прысвяткаў, параўноўваючы іх з каляндарнымі традыцыямі народаў Еўропы. Важнае значэнне ў ім надаём пытанням язычніцтва і хрысціянства.

Даты прыводзяцца па новым і старым стылях (напр., 1/19—1 чэрвеня па н. ст., 19 мая па с. ст.; 28/15—28 чэрвеня па н. ст., 15 чэрвеня па с. ст.). Назвы святаў і прысвяткаў, якія бытавалі ці бытуюць сярод праваслаўных беларусаў, выдзелены паўтлустым шрыфтам, а сярод католікаў-беларусаў — курсівам. Зорачкай (*) абазначаны святы і прысвяткі, якія пададзены адвольна, прыблізна, што залежыць ад месца Пасхі ў праваслаўным і каталіцкім "рухомых" календарах. У дужках прыведзены назвы варыянтаў святаў з розных рэгіёнаў. Пасля імя хрысціянскага святога ў дужках падаецца арабскай лічбай год, у які ён памёр, рымскай — стагоддзе, у якім жыў. Апісанні святаў і прысвяткаў у асноўным робяцца ў дзень па праваслаўным календары. Калі ж маюцца нейкія адрозненні ў этнаграфічных тэкстах, то даюцца апісанні варыянтаў каталіцкага і праваслаўнага свята ці прысвятка. Прыклады падаюцца з захаваннем дыялектных асаблівасцей рэгіёна.

ЧЭРВЕНЬ

1/19. Людзі прыкмячалі: калі ў першы і другі дзень чэрвеня лье дождж — увесь месяц будзе сухі (Санько, 1990)[1].

2/20. Тры Мучанікі. Пра дзень памяці хрысціянскіх пакутнікаў Фалалея, Аляксандра, Асцярыя (каля 284 г.) у нас замацавана прыкмета: "Да Трох Мучанікаў — заледзянелых старцаў — няма лета, але пасля іх не бывае зімы" (БК, 1943).

У рускіх гэты дзень больш звязаны з агуркамі, таму прысвятак і называюць "Фалалей Огуречник", "Фалалей Тепловей" (Усаў, 1997).

3/21. Алёна (Алёны, Ульяна) — дзень ільну. Лічылася: як пасеяць лён на Алёну (Ульяніцу), то добры "удасца" (Пяткевіч, 1938; Дамбавецкі, 1882). У Бельскім павеце Смаленскай губерні зафіксавана: "Лён хто пасеіць на дзісятый ад Іллі нядзелі — са льном; а на восьмый — у васьму (атрымае восьмую частку), на сёмый — із поля вон" (Дабравольскі, 1894).

Вось як апісвалі фальклярысты ў пачатку XX ст. абрад сяўбы: "Сяўба лічыцца асабліва ўдалай, калі гэты дзень прыпадае на панядзелак. Сейбіт абавязкова павінен апрануць чыстую бялізну — каб лён быў чысты. Акрамя таго, вараць курыныя яйкі і кладуць іх у кашолку з насеннем. Прыехаўшы на ніву, сейбіт падкідвае яйкі ўгору, каб лён быў высокі і з буйнымі галоўкамі — галавісты" (Раманаў, 1912. С. 190). Народная культура ўтрымлівае розныя жанры і творы, звязаныя з ільном, у якіх выяўляўся працэс яго вырошчвання і апрацоўкі, у тым ліку папулярныя карагод "Лянок" і песня "Ох і сеяла Ульяніца лянок". У Рэчыцкім павеце нездарма гаварылі: "Каля святой Алёны гароды ўжо добра зялёны" (Пяткевіч, 1928), таму што сапраўды агародніна да гэтага часу ўзыходзіла.

Народныя звычаі і традыцыі добра сумясціліся з імем Алёны, якое даў гэтаму дню царкоўны каляндар. Маці імператара Рымскай імперыі Канстанціна, які ў 323 годзе аб'явіў хрысціянскую веру пануючай ва ўсім уладарстве, прызначана разам з сынам роўнаапостальскай за заслугі, прыраўняныя да дзеянняў Хрыстовых апосталаў. Яна ў 326 годзе знайшла крыж Гасподні, а таксама рэшткі трох вешчуноў, што абвясцілі аб вялікім нараджэнні, і здзейсніла шмат іншых гістарычных хрысціянскіх учынкаў.

Тыповым вясенніім святам лічыўся дзень Канстанціна і Алёны (21 мая) у балгараў. Акрамя звычайных гулянняў існаваў у адным з рэгіёнаў звычай "нести на рство" або гульня "Поогън" — беганне басанож па гарачых вуголлях (КЗ, 1977. С. 290).

Не толькі ўсходнія славяне звязваюць Алёну з ільном, але і немцы. "Helene — wachst der Flachs gar schöne" — "На Гелену вырасце прыгожы лён" (Ярмолаў, 1901. С. 275).

4/22. Васіліск. "Ад Васіліска і салавей блізка" (Паўлюкоўскі, 1934), — сведчыць народная прыкмета, уводзячы ў свой каляндар памяць аб святым пакутніку Васіліску, пляменніку вядомага бага-

---

[1] Крыніцы падаюцца ў скарочаным варыянце. Поўныя іх назвы гл. на с. 157.

слова Ф. Цірона. Два браты Васіліска былі крыжаваны ў час ганенняў Максіміяна, а самому пакутніку пасля адсеклі галаву (каля 308 г.) за ўчыненыя цуды і непахісную веру ў Хрыста.

Цікава, што нават і ў Сібіры "Василиск — соловьиный день" (Ярмолаў, 1901. С. 275).

5/23. Дзень памяці **Ефрасінні Полацкай** (Прадславы) — князёўны, манашкі-асветніцы XII ст. З блізкіх і далёкіх ваколіц людзі пешшу хадзілі ў Полацк пакланіцца "сваёй Ефрасінні" і "абракацца", каб дапамагала ў зямных нягодах (Шумілінскі р-н).

Прападобная Ефрасіння (1173 г.) — унучка полацкага князя Усяслава Чарадзея, заснавальніца першых школ і летапісных майстэрняў, нябесная заступніца беларусаў. Па яе замове выраблены Святы Крыж — нацыянальная рэліквія Беларусі.

7/25. Ян. "Калі рой выйдзе перад Янам, будзе пчаляр панам" (Паўлюкоўскі, 1934). У іншых мясцінах Беларусі гэтую прыкмету адносілі да Яна Купалы.

У царкоўным календары — Трэцяе адшуканне галавы Прадцечы і Хрысціцеля Гасподня Іаана (каля 850 г.).

Восьмы тыдзень перад Ілліёю. На Смаленшчыне заканчвалі сеяць авёс. Там гаварылі: "Сей авёс, як паявіцца іўсяный камар. Сей авёс, як расцвяцецца казелец. Када суніца красна, ня сей іўса напрасна. Када Фаміна нядзеля будзіць хараша, то і авёс, і ўсякый хлеб будзіць харош. Када на Усяёднай нядзелі ідзець бальшая мяцель, сей авёс раньшы, а мяцелі нет — сей авёс пазней" (Дабравольскі, 1894).

***Дзевятнік** — чацвер на дзевятым тыдні пасля Пасхі. Не працавалі ў полі, засцерагаліся грому. Ва Усходнім Палессі прыкмячаюць: "Трэ, коб на Дзевятнік було дзеўяць ягодзін на ветцы" (Тураўскі сл., 1982). Збіраючы ягады, грыбы і арэхі, спявалі песні. У валачобных песнях з гэтым днём звязваюць рост жыта. Дзевятнік "красу здымаець", "краску кладзець", "красуець", "у пукі бярэць".

Дзевятнік — народная назва свята. Яна ўзнікла ў канцы XIX стагоддзя ў гонар пераводу беларускіх уніятаў пад лона праваслаўнай царквы. Каталікі і уніяты адзначалі яго як свята Цела Божага. Святар Іван Берман (1873) сведчыў, што "тутэйшая заходнеруская царква праводзіць у гэты дзень хросны ход; ставяць бярозкі для ўпрыгожвання царквы, а прыхаджане прыносяць з сабою на малебен зелле, гэта значыць кветкі, вянкі з траў, якія захоўваюць да Іванавага дню" (Ашмянскі пав.).

***Божае Цела (Цела Гасподня).** У Віленскай губерні быў зафіксаваны звычай сярод беларусаў-каталікаў. "Расстаўленыя ў касцёлах бярозкі ў дзень св. Тройцы, ці на свята Цела Гасподня, старанна збіралі, абломвалі галіны і вадзілі імі па капусце на градах, а потым клалі ў пукі пад снапамі. Верылі, што гэта аберагае капусту ад вусеняў, а хлеб ад мышэй" (Корава, 1861. С. 616). Існуюць народныя паданні.

Восьмы і дзевяты чацвяргі пасля Пасхі ў Румыніі лічыліся цяжкімі і страшнымі. Згодна з павер'ямі, злыя сілы тады вельмі процідзейнічаюць чалавеку. Таму шмат што забаранялася.

У Італіі Corpus Domini ("Цела Гасподняе"). Адно з самых позніх каталіцкіх святаў было ўведзена папам Урбанам IV 8 верасня 1264 г., каб адзначаць памяць пра бальсенскі цуд (у царкве г. Бальсена на аблатцы для прычасця выступіла кроў Хрыста).

Асаблівыя святкаванні наглядаюцца ў Іспаніі, бо там шмат стагоддзяў дзень Корпус-крысці (Corpus Christi) быў нацыянальным сімвалам. Даследчыкі не звязваюць яго паходжанне з язычніцкімі традыцыямі, хаця ён стаў вельмі развітым, народным, і некаторыя яго элементы царква стала забараняць (КЗ, 1978. С. 40—41).

Нямала ўстойлівых рыфмаваных прыкмет бытуе ў Польшчы: "Jaki dzień jest w Boże Ciało, takich dni potem nie mało" — "Які дзень на Божае Цела, такіх потым нямала"; "Na Boże Ciało żyto zagęściało" — "На Божае Цела жыта зацвіло" (Ярмолаў, 1901. С. 298).

***Дзевятуха** — пятніца на дзевятым тыдні пасля Пасхі. У Добрушскім раёне лічаць, што Дзевятуха, як і Дзесятуха, — гэта свята ад навальніцы, а ў Лельчыцкім кажуць: "Дзевятуха — то польскае сьвято, а Дзесятуха — нашое" (Талстая, 1986). У валачобных песнях побач з Дзесятнікам яна з'яўляецца адным з этапаў росту жыта:

Дзевятушка-памяжаначка
Па межах хадзіла, жытцо абзірала,
Жытцо абзірала да й раўнавала...

Іншы раз святы не размяжоўваліся.

13/31. Ерамей. У беларусаў прысвятак вядомы па выслоўі: "Прыйшоў Ерамей — больш не сей" (Цітоў, 1994. С. 163). Рускія яго ведаюць яшчэ як "Еремея Распрягальника".

У царкоўным календары — Апостал ад 70-ці Ерм (I ст.); пакутнікі Ермая (II ст.), Філосаф (III ст.).

Антоній. Апякун гандлю, дзяцей, школьнікаў і абаронца ад зладзеяў. Цікавую гісторыю, звязаную са святым, расказаў нам краязнавец Антон Бячко падчас наведвання славутых мірскіх старажытнасцей.

У цэнтры мястэчка Мір Гродзенскай вобласці знаходзіцца гандлёвая плошча, на супрацьлеглых баках якой — праваслаўная Троіцкая царква XVI ст. і Мікалаеўскі касцёл, пабудаваны ў 1599—1605 гадах міласцю фундатара Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі. Акрамя таго што ў тыя часы ў касцёле пад шклом знаходзіўся бівень маманта, увагу наведвальнікаў прыцягваў яшчэ адмысловы алтар з абразом святога Антонія, які, на жаль, не захаваўся. З ім звязаны мясцовыя паданні.

Раней мястэчка славілася сваімі кірмашамі. Асабліва добра ішоў гандаль коньмі. Пакупнікі прыязджалі з Польшчы, Германіі і нават Францыі. Ну і, зразумела, там, дзе коні, — там не абыходзілася без цыганоў. Святы Антоній лічыўся апекуном гандлю, яму маліліся і тыя, хто страціў якую-небудзь рэч. Цыганы прыходзілі да св. Антонія 13 чэрвеня, калі ім удавалася ўкрасці каня і выгадна яго збыць, і прымацоўвалі на раме абраза маленькую ўпрыгожаную выяву коніка дзеля замольвання граху і ахвяравання для храма Божага. Пасля аднаго здарэння такіх ахвяраў значна павялічылася.

Аднойчы прыйшоў у касцёл селянін, у якога ўкралі жывы тавар, стаў на калені перад абразом святога і давай прасіць: "Святы Антоній, аддай мае коні". А тут побач аказаўся той самы злодзей-цыган. Шкада яму стала чалавека. Падкраўся ён за алтар і адказвае адтуль селяніну: "Ну то ідзі ўжо, аддам, вунь на вуліцы стаяць".

Пагалоска пра гэты выпадак хутка разнеслася па наваколлі. Святому Антонію сталі ахвяраваць усе пацярпелыя ад крадзяжоў. Сёння святы лічыцца апекуном дзяцей і школьнікаў, для якіх у касцёлах у дзень Антонія наладжваюцца святы.

14/1. Усцін (Юстын і Харытон). З прысвяткам звязаны прыкметы пра рост збожжавых раслін. "Юсцін цягне ўверх каноплі. Харытон — лён" (Паўлюкоўскі, 1934); "На Усціна лета ўдаецца — жыта добрым коласам нальецца" (Ляснічы, 1990).

Царкоўны каляндар падае звесткі на гэты дзень пра пакутнікаў за хрысціянскую веру Іусціна Філосафа і другога Іусціна і з імі Харытона, Валяр'яна (166 г.) і іншых.

Сёмы тыдзень перад Іллёю. Пасля аўса браліся сеяць ячмень. Дакладны дзень сяўбы вызначалі па прыкметах: "Сей ячмень, як загудзець сляпень", "Сей ячмень, як каліна ў крузе", "Сей ячмень з зімы, калі рож ня всыпала і яшчэ ячмень у пучках", "Ячмень сей на сядзьмой нядзеле ад святога Іллі, у тэй дзень, када на Усяеднай нядзелі (тыдзень перад Вялікім постам. — *А. Л.*) была вея ("сплашніцы")" (Дабравольскі, 1894).

16/3. Лук'ян. Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых, а калі падзьме паўночна-заходні — сырое лета прынясе (Ляснічы, 1990). У сувязі з тым што існавала нямала прыкмет, звязаных з ветрам, у Расіі дзень называлі Лук'янам Ветранікам.

У ліку кананізаваных пакутнікаў і святых на гэты дзень царкоўны каляндар змяшчае Лукіліяна (270—275 гг.) і Лукіяна (81—96 гг.), якіх народнае асэнсаванне магло перайменаваць у Лук'яна.

20 — 21. Дзень астранамічнага сонцастаяння.

21/8. Тодар (Хвёдар). Па надвор'і ў гэты дзень стараліся прадказаць надвор'е і ўраджай на лета: "На Тодара раса — канапель паласа" (Паўлюкоўскі, 1934); "На Тодара раса — лета сухое і ўраджайнае" (Сахараў, 1937); "Навальніца на Хвёдара — падвядзе надвор'е ў час жніва"; "Хвёдар з навальніцай сенакос спартачаць"; "Росы з Хвёдара — лён уродзіць" (Ляснічы, 1990). У Расіі — Фёдар Летні і Фёдар Калодзежнік (асабіва ў чувашоў).

22/9. Кірыла. У некаторых мясцінах адзначаўся як дзень летняга сонцастаяння. Лічылі, што на Кірылу з усяе моцы зямля імкнецца да сонца і пачынаецца лета (Анічэнка, 1992). На Паазер'і да таго дня пачыналі касавіцу (Ляснічы, 1990).

У царкоўным календары два Кірылы — гэта свяціцель архіепіскап Александрыйскі (444 г.) і прападобны ігумен Белазерскі (1427 г.).

23/10. *Купала*. "На Купала раса — будуць агуркі"; "У каго Купала пракосы ўбача — таго баба жнівом не заплача" (БСК, 1937). (Шырэйшае апісанне нацыянальнага свята гл. 6 ліпеня.)

24/11. *Ян (Ян Купальны, Янаў дзень)* — працяг Купалы ў некаторых каталіцкіх раёнах Беларусі. Добра ахарактарызаваны ў фальклоры. Беларусы ў Латвіі спявалі:

Ходзіць Ян па вуліцы,
Завець дзяўчат у купаллю:
— Пойдзем, дзеўкі, ў купаллю,
Пойдзем у зялёну!

(Сахараў, 1940)

Пра свята гаварылі: "Калі выйдзець рой перад Янам, будзець зямец панам", "Калі не выліняў конь да святога Яна, няхай ідзець да другога пана" (Барысаўскі пав.; Тышкевіч, 1847); "Яны правяць ільны" (Шырма, 1947); "Святы Ян пчолы садзіць", "Часамі Ян дасць ягад збан", "На Яна сонца гуляе" (БСК, 1937); "На Яна нажала, на Пятра напякла" (Ашмянскі пав.; Шэйн, 1893). Немцы гавораць: "Vor Johannistag man Gerst und Hafer nicht Loben mag" — "Да Янава дня не хваліся ячменем і аўсом".

25/12. Анапрэй (Нупрэй) — прысвятак. Спрыяльны дзень для сяўбы грэчкі. "Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ" (Паўлюкоўскі, 1934). У Магілёўскай губерні яшчэ да абеду сеялі "белае зерне" (авёс), а пасля абеду — "чорнае" (грэчку). Лічылася, што ўжо паспелі суніцы. "Калі суніца красна, не сей аўса напрасна" (Дамбавецкі, 1882), гэта значыць, што авёс не паспее да маразоў. На Смаленшчыне даўней гаварылі: "Святэй Анопры, радзі каноплі" (Дабравольскі, 1894), а ў Свіслацкім раёне зараз кажуць: "Анопрэй, сей канопель".

Апроч іншых імён царкоўны каляндар утрымлівае прападобнага Ануфрыя Вялікага (XV — XVI стст.).

***Дзесятнік** — чацвер на дзесятым тыдні ад Пасхі, адзін з этапаў даспявання жыта ("Дзесятнік гнаі возіць, Дзесятуха косы точыць").

26/13. Акуліна (Акуліна Грачышніца, Акуліна Задзярыхвост) — прысвятак. У некаторых раёнах сеялі грэчку, падрыхтаваўшы глебу на Нупрэя. На Смаленшчыне гэты дзень быў вядомы як "Акуліна Задзярыхвост", ці "Кароўі зык". Тлумачыліся назвы так: на тую пару з'яўляецца шмат аваднёў і каровы на пашы "зыкуюць" — бегаюць, задраўшы хвост (Дабравольскі, 1914). У харватаў, якія адзначаюць па каталіцкім календары Антона, прысвятак таксама звязаны з жывёлагадоўчай магіяй, што накіравана на дабрабыт свіней (КЗ, 1978. С. 206).

У народзе Акулінай была празвана хрысціянская пакутніца Акіліна з фінікійскага горада Бібле, што была замучана за веру Хрыста ў 293 годзе.

***Дзесятка (Дзесятуха, Дзесятуха Мучаніца)** — пятніца на дзесятым тыдні пасля Пасхі; адзін з этапаў даспявання жыта. "Дзесятка — жыту пятка", "Дзесятуха зярно поўніць", "Дзесятуха жыта паспявае" (з валачобных песень). Засцерагаліся маланкі і грому, не працавалі.

"Аброчны" дзень абаронцы свойскай жывёлы. "Абракаліся людзі, шоб худоба не гінула". На Усходнім Палессі праводзілі абрады ля "святых" крыніц, асвячалі з папом ваду ля вадаёмаў з абразом Параскевы (Талстая, 1986. С. 115).

9541
БІБЛІЯТЭКА
СШ № 219
г. Мінск

Пяценка — час, калі завязваецца зерне ("пятка"). Не мае пастаяннага дня ў календары.

Дзесятуха красу давала,
А Пяцінка красу здымала,
Красу здымала, пятку стаўляла;
А Дзесятуха ды, вой, наліваець,
А святы Іван і ён пятку спяліць...

28/15. Амос. За прысвяткам замацавалася прыкмета: "Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс" (Паўлюкоўскі, 1934).

Прарок Амос жыў у VIII стагоддзі да Нараджэння Хрыстова.

29/16. Ціхан — прысвятак. На Смаленшчыне гаварылі: "Не поле корміць, а ніва" (Цэбрыкаў, 1862). Зямля прыпавольвае свой рух на арбіце, і ў народзе Ціхан наводзіць асацыяцыі на ціхі дзень: "На Ціхана і пеўчыя птушкі заціхаюць", "На святога Ціхана сонца ледзьве дыхае" (Ляснічы, 1990), "ідзе ніжэй" (Анічэнка, 1992).

Царкоўны каляндар на 16 чэрвеня сабраў некалькі Ціханаў: свяціцеля, епіскапа Амафунтскага (425 г.), прападобнага Калужскага (1492 г.) і Лухаўскога (1503 г.), што быў родам з Літоўскага княства.

Пятро і Паўла (Пятрок) — земляробчае свята. Характэрныя прыказкі і прыкметы: "Святы Пётра ў косы звоніць, а святы Паўла граблі робіць", "Калі на Пятра пойдзе дождж — жыта, як хвошч; уродзіць мятліца — хлеба палавіца; зарадзіў званец — жыту канец", "Калі зязюля будзе кукаваць да Пятра — восень харошая, а калі на Пятра — лета доўгае і харошае, снег ня хутка выпадзе", "Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілля — ападуць і два, а па Усіх Святых — ня будзе іх" (БСК, 1937).

Святкаванне Пятра ў беларусаў-католікаў мала чым адрозніваецца: праводзяцца такія ж масавыя гульні з танцамі і песнямі, наладжваннем арэляў, як у праваслаўных (гл. 12 ліпеня).

30/17. *Данат.* Католікі-беларусы Латвіі захавалі памяць аб ім у валачобнай песні, як сведчыць запіс 1940 года С. Сахарава з Каплаўскай воласці Ілукстэнскага павета:

Святы Данат коскі точыць,
Сянцо косіць, Бога просіць:
"Дай жа, Божа, ды на нашу
На работку ды пагодку..."

У аўстрыйцаў атрыбутам святога Даната, якога адзначалі 30 чэрвеня, быў сноп.

ЛІПЕНЬ

5/22. За тыдзень да Пятра садзілі рэпу на Смаленшчыне.

6/23. Купала (Купалле) — старажытнае абрадавае свята сонца і агню, божышчаў урадлівасці і росквіту зямлі. Прымяркоўвалася да дня летняга сонцастаяння. "Дня адбаўленне, ночы прыбаўленне", — кажуць у народзе, і нездарма захаваўся звычай наглядаць за свяці-

лам, як "сонца грае". "Сёння Купала, заўтра Іван..." — спяваецца ў песнях. Гэтыя і іншыя факты даюць падставу сцвярджаць, што Купала — язычніцкае свята, да якога прыстасавана пазней святкаванне царквою (у другі дзень, 24 чэрвеня) "Рождества честного славного Пророка, Предтечи и Кристителя Господня Иоанна". Язычніцкае Купала ўпамінаецца ў летапісах 1175 года.

У некаторых раёнах Беларусі гэты дзень звязваюць з Агрыпінай і свята называюць **Агрыпінай Купальніцай** (каля 253 — 260 гг.). Дзень пачынаўся ў нашых продкаў з наведвання лазні, дзе адным з купальных атрыбутаў быў люцік, празваны купальніцай.

Дзяўчаты збіралі кветкі для вянкоў, лекавыя зёлкі для прыгатавання лекаў і варажбы, якая нагадвала таемную забаву. Дзяўчаты з вянкамі вадзілі карагоды ля вогнішча, затым купаліся на зары і пускалі вянкі на ваду, наглядаючы за іх рухам, у якім імкнуліся разгадаць свой лёс. Дзеля гэтага таксама ўтыкалі краскі і зёлкі ў шчыліны сцен будынкаў.

Асноўнай купальскай кветкай лічыцца папараць-кветка, якая, згодна з легендай, зацвітае апоўначы на свята і якую адпраўляюцца шукаць. Хлопцы пад вечар сцягвалі старыя рэчы, галлё для вогнішча. Месца для яго часцей выбіралася на высокім беразе ракі ці возера, на паляне, каля жыта. Праводзілі абрад здабывання жывога агню — церлі асінавыя палкі. "Сягоння ў нас Купала, сам Бог агонь раскладаў", — спявалі ўдзельнікі свята (Тышкевіч, 1847). Палівам для вогнішча таксама служылі дровы з дуба — сімвалічнага дрэва Перуна, што бачна з купальскіх песень: "Пажарам дуб'е гарэла...", "Гарэла дуброва, гарэла..." і інш.

У купальскіх песнях распавядаецца: "Не дзеўка агонь клала, Сам Бог агонь раскладаў", "Святое Пятро ў поле ходзіць, Святы Купала агонь кладзе", "Ой, месяцу, месяцу, узыдзі раненька і раскладзі купаллейка". Галавешкай ад вогнішча можна было выгнаць ведзьму з жыта і прагнаць іншую пачварную сілу.

Над купальскім вогнішчам высока на жэрдцы ўздымалі запаленае кола. Звычайна яго бралі са старога воза, прасмальвалі або аблівалі дзёгцем, каб ярка гарэла. Згарала адно — ладзілі другое. Вакол купальскага вогнішча вадзілі гульнёвыя карагоды, спявалі песні. Палаючае кола таксама пускалі ўніз з узгорка.

Песнямі суправаджаліся абрады на свяце, карагоды і гульні, завадатарамі якіх з'яўляліся Купалінка і Купаліш. Ля вогнішча ўсе часталіся абрадавай стравай, моладзь пераскоквала цераз агонь — ён лічыўся ачышчальным ад злых духаў. Спальванне прасмаленых колаў на шчасце ці спусканне іх, палаючых, з гары — адгалоскі пакланення свяцілу ("А на гарэ калясо, гарыць яно харашо...").

У звароце да агню ў індаеўрапейскіх народаў даследчыкі бачаць абрадавае адлюстраванне салярных (сонечных) матываў, "прадуцыравальны і ачышчальны — ахоўны пачатак" (Ліс А. Земляробчы, 1990. С. 56).

У звычаях скакання цераз вогнішча, а таксама кідання галавешак у жыта (адпуджванне ведзьмаў), спальвання сарочак хворых дзяцей праглядаецца акт, які носіць ахоўна-ачышчальны абрадавы сэнс.

Моладзь скача цераз агонь з перакананнем, што русалкі не будуць нападаць і прыходзіць даіць кароў, што ачысцяць сябе і засцерагуць ад хвароб, чараў.

Запісы рэдкай купальскай забавы збівання конскага чэрапа на шасце вядомы толькі з Кобрынскага павета мінулага стагоддзя. Даследчык быту і фальклору ўсходніх славян Дз. Зяленін выказваў меркаванне, што яна магла прыйсці з Захаду разам з Русаллямі, дзе конь адлюстроўвае дух расліннасці.

Дзяўчаты на Купалле варажылі аб будучым замужжы. Наогул, гэта свята маладосці і кахання. У далёкім мінулым яго называлі "бясоўскім ігрышчам", "ігрышчам межу сёламі", пра якія Несцераў летапіс сведчыў: "Схожахуся на игрыща, и ту умыкаху (выкрадалі. — *А.Л.*) жены собе, с нею же кто совещашеся; имяху же по две и по три жены".

Вобразы Купалля добра адлюстраваны ў народным мастацтве. Даследчык беларускага арнаменту М. Кацар, напрыклад, вышыты ручнік Н. Вальковіч з Лідскага раёна называе "купальскай паэмай". "Тут мы бачым усе атрыбуты свята, размешчаныя па пяць у радзе: Купалінка ў танцы, купальскі вянок, купальская трава з трыма кветкамі, галінка папараці, агонь-жыжа, карагод" (Кацар. С. 87—88). Беларускі купальскі абрад і яго паэзія добра ахарактарызаваны даследчыкамі, асабліва Арсенам Лісам (гл.: 1974, 1985, 1992 і інш.).

Якое ж месца займае беларуская купальская традыцыя ва ўсходнеславянскай і еўрапейскай спадчыне? Самую першую ўражліва пахвальную адзнаку даў рускі славяназнавец П.А. Бяссонаў: "Беларусь захавала ў абрадзе купальскай ўрачыстасці і ў песнях, што яе суправаджаюць, адгалоскі самай сівой даўніны, як нідзе ў славян" (1871. С. 28). Гэты тэзіс яскрава пацвердзіла сваімі даследаваннямі на прыкладзе ўсходнеславянскіх народаў другі рускі навуковец В.К.Сакалова. Яна прыйшла да высновы: "Найбольш архаічны характар свята захаваўся ў беларусаў. Украінцы таксама захавалі асноўныя старажытныя элементы, але ў XIX ст., калі Купала стаў вясёлым маладзёжным гуляннем, яны відазмяніліся і пераасэнсаваліся. Рускімі ж асноўныя элементы купальскага рытуалу былі або забыты, або перанесены на іншыя святы..." (1979. С. 230).

Даследчыца справядліва заўважыла, што ўкраінская традыцыя адрозніваецца выкарыстаннем абрадавага дрэва Мараны (Марэны, Мары), вакол якога распальвалася вогнішча, вадзілі карагоды з песнямі: "Ходили дівочки коло Мареночки" і інш. Можна пагадзіцца з тым, што сімвал расліннасці на свята трансфармаваўся з ранейшых абрадаў, напрыклад сёмушна-траецкіх, як у беларусаў і рускіх. У Беларусі часцей у сярэдзіну вогнішча ўстаўляўся шост з колам, бочкай, саломай, чэрапам жывёлы, што носіць больш архаічны характар.

У рускіх купальская абраднасць аказалася больш беднай. Адсутнічалі такія агульныя элементы рытуалу, як вогнішча, абрадавыя песні, найбольш захаваліся ў XIX—пачатку XX ст. толькі купанне і збор зёлак.

Купальская традыцыя шырока вядома ўсім еўрапейскім народам. Папулярнае і вялікае свята Сан-Джавані здаўна адзначалі рымляне. У

адным з календароў яго называлі Solstitium (сонцастаянне) і Lampas (факел, светач, дзённае свяціла, сонечнае святло, дзень). Італьянскія даследчыкі лічаць, што ў гэты дзень рымляне пакланяліся сонечным і аграрным боствам — Фартуне і Царэры, а затым ужо святому Іаану. Вось характэрныя элементы Сан-Джавані, што маюць падобнасць з Купаллем: паленне вогнішчаў і дзеянні, звязаныя з вадою, якія носяць адценне ачышчэння і прапіцыяцыі (замілоўванне); павер'і пра ведзьмаў (КЗ, 1978. С. 9—10). У адрозненне ад нашага вясковага свята, у Італіі больш шырока святкавалі ў гарадах, дзе наладжваліся вялікія вогнішчы на плошчах. Таксама выганялі жывёлу на расу і дзяўчаты раніцай бегалі басанож, заключалі саюзы з хлопцамі.

Падобныя традыцыі бытавалі і ў іншых краінах. У Францыі на дзень Іаана Хрысціцеля (Жан Баціст, Jean Baptiste), або, па-народнаму, Сен-Жана (Saint-Jean), таксама палілі вогнішчы і перасковалі цераз іх, спальвалі пудзіла, акурвалі зёлкамі і кветкамі і г.д. Існавалі і свае асаблівасці.

У Югаславіі мыюцца не толькі людзі, але і жывёла. Харваты нават свята назвалі Іван Купальшчык (Ivan Kupavac). Магчыма, назва звязана са старажытнаславянскім боствам Купадла (с. 209).

Не ва ўсіх народаў былі абрады, звязаныя з вадою. Напрыклад, фальклярысты не фіксуюць іх у лужычан і іх суседзяў немцаў Ніжняй Лужыцы. Затое там існаваў гульнёвы звычай "Ян", у якім праглядваліся рысы духу раслін. Напад вяскоўцаў на вершніка Яна, які быў абвешаны кветкамі і з берасцянай маскай (с. 197—198).

У Францыі царква не забараняла вогнішчы, а толькі некаторыя "памылкі": звычай пераганяць ля кастроў жывёлу, забіраць галавешкі, вуголле і попел, акурванне зёлкамі і інш.

Скаканне праз агонь у чэхаў і славакаў таксама азначала ачышчэнне; скакалі на "доўгі лён" (na dlonhy len) (с. 185).

У Іспаніі на свята Сан-Хуана, або Сан-Жуана, праводзілі даўні звычай хаджэння басанож па гарачых вуголлях, існавалі іншыя падобныя звычаі, у тым ліку купанне моладзі ў рацэ (с.47). Бельгійскія дзеці яшчэ за некалькі дзён да Яна (st. Jan — галандск.) ходзяць з песнямі па вуліцах, выпрошваючы дровы для вогнішча. У Нідэрландах, як і ў Бельгіі, распаўсюджаны звычай вывешваць на 24 чэрвеня вянок з кветак і зёлак, з якім звязана нямала прыкмет і павер'яў (с. 58—59).

Нямала падобнага ў святкаванні дня святога Джона (Іаана Хрысціцеля) у народаў Брытанскіх астравоў. Даследчыкі (І. Граздова і інш.) лічаць, што "і ў англічан, і ў кельтскіх народаў Брытаніі св. Іаан застаўся ўбаку ад перанесеных на яго дзень народных абрадаў і ніякіх функцый у абраднасці дня летняга сонцастаяння не выконваў" (с. 70). Да царкоўнага свята былі прымеркаваны і перанесены язычніцкія традыцыі культу сонца з 21 чэрвеня. У Германіі пасля першай сусветнай вайны святкаванне пачатку лета на Іаагана Хрысціцеля з 24 было перанесена на 21 чэрвеня — астранамічна больш дакладны дзень летняга сонцастаяння. І запальвалі вогнішча ад агню, атрыманага пры дапамозе трэння.

Як і ў нас, у Брытаніі існуюць павер'і аб нячыстай сіле, аб папараць-кветцы, раскладваюцца рытуальныя вогнішчы (на вуліцах, плошчах, дарогах), наладжваецца катанне запаленых колаў (у шатландцаў і ўэльсцаў), надаецца ўвага зеляніне (бярозе), кветкам (святаяннік) і інш.

У скандынаўскіх народаў Іванаў дзень самае любімае свята: святы Ханс (st. Hans) — па-нарвежску, Мідсамар (Midsommar) — па-шведску, Ійнсок (Jonsok) — па-дацку. Існуюць звычаі, як і ў іншых еўрапейскіх народаў, якія не маюць нічога агульнага з Іаанам Хрысціцелем. У народаў Швейцарыі на дзень сонцастаяння (Sunnawend) існуюць павер'і пра папараць і легенды, у якіх адкрываюцца клады з-пад зямлі, запальваюцца "агні Іаганіса", традыцыя якіх перанесена і на іншыя народныя і дзяржаўныя святы.

У Венгрыі свята называецца днём святога Іаана, а агні — святога Івана. Гэты і іншыя факты даюць падставу даследчыкам (с. 165) сцвярджаць аб перайманні даўніх традыцый ад славян.

У некаторых рэгіёнах Югаславіі (Харватыі, Славеніі, Македоніі) хадзілі рытуальныя працэсіі, па форме і змесце падобныя да зімовых калядак. Дарэчы, адна з назваў рытуальнага купальскага агню — "koleda" (с. 209, 211).

Найбольш поўна захаваўся абрад (Еньовден, Янювден) у паўднёва-ўсходняй Балгарыі, у іншых раёнах краіны рытуалы свята былі перанесены на Новы год, Юр'е, а на захадзе зусім не лічыцца святам (с. 228). Мала чым адрозніваецца дзень Іаана (Shengjinat), дзень Пламені (Flakadajt) у албанцаў ад агульнаеўрапейскай традыцыі. Адметным было тое, што дзеці з вянкамі хадзілі ад хаты да хаты з песнямі-заклічкамі (с. 260). У грэкаў можна вылучыць цікавы абрад варажбы на "нямой вадзе" і інш.

Падобнасць хрысціянскіх абрадаў, асабліва звязаных з сонцастаяннем, у многіх народаў Еўропы тлумачыцца даследчыкамі як падобнымі формамі мыслення, звязанымі з раннім земляробствам (Проп, 1963), так і агульнасцю індаеўрапейскай асновы, у выніку чаго адзін народ мог пераймаць традыцыі другога (Ферле, Філімонава. КЗ, 1978. С. 125).

У сваім грунтоўным даследаванні "Боствы старажытных славян" А. Фамініцын яшчэ ў 1884 годзе вытлумачыў, што беларускі і ўкраінскі Купала — гэта Лада (Ліга, Ладо), Ярыла, Ян, Іван, што сустракаецца ў розных народаў, які замяніў сабою больш старажытнае імя другога якога-небудзь сонечнага бога, мажліва Ярылу (Тура?) (с. 277).

Рускі даследчык У. Проп зусім не лічыў Купалу боствам. Хаця прызнаваў, што пытанне можа стаяць пра Ярылу. Ён пісаў: "Можна сказаць, што істоты, якія прадстаўляюць сабой раслінную сілу, недаразвітыя боствы. Тэорыя запазычання нашых святаў з антычнасці не пацвярджаецца, таму што рускі матэрыял значна архаічней" (Проп, 1963. С. 98).

Даследчык рускага і славянскага календара В. Уласаў на аснове купальскага дрэва (шаста) і іншых фактаў прыходзіць да вываду, што дзень 24 чэрвеня ў славян перыяду палеаліту быў сярэдзінай пэўнага прамежку часу, калі згарала "нябеснае дрэва (Млечны

Шлях)"; "абраднасць гэтага свята ладзілася на пакланенні сімвалічнаму дрэвападобнаму аб'екту, які ў выніку спальваўся" (1993. С. 108—110), а таксама лічыць, што многія факты Купалля ўказваюць на перыяд дзявочых ініцыяцый (с.115).

Нават гэты беглы агляд дае падставу сцвярджаць, што Купалле — язычніцкае свята, на якое пазней часткова была накладзена хрысціянская плынь, і часава-прасторавая трансфармацыя развіла купальскую традыцыю са сваімі рэгіянальна-нацыянальнымі асаблівасцямі. Да ранейшых высноў даследчыкаў (напр. В.К.Сакаловай) аб большай архаічнасці купальскіх традыцый у беларусаў (напр., паленне вогнішчаў, абрадавая песеннасць, павер'і і г.д.), у параўнанні з украінцамі і рускімі, у нейкай ступені можна далучыць тое ж адносна ўсіх славян і еўрапейскіх народаў у цэлым. Згодна з купальскай спадчынай, беларусы больш еўрапейцы, чым рускія і нават украінцы, больш таго, у разглядаемым аспекце яны еўрапейцы больш некаторых саміх еўрапейскіх народаў з іх асучасненай народнай культурай.

7/24. Іван Купала (Іван Купальны, Іван, Пятроўскі Іван, Іван Летні, Іван Вялікі, Іван Посны, Іван Злосны, Іван Ведзьмін, Ян) — працяг купальскага свята , якое доўжылася ўсю папярэднюю ноч. "Учора была Купала, а сёння Іван..." — спяваецца ў народнай песні. "На Пятроўскага Івана павінны быць гуркі ў мужыка, не толькі ў пана", — распавядае даўняя прыкмета (Пяткевіч, 1928).

У купальскім святе найбольш удала зліліся дзве традыцыі (язычніцкая і хрысціянская). Другі дзень больш адпавядае царкоўным звычаям, бо адзначаецца нараджэнне Іаана Хрысціцеля.

Бяздзетнаму святару Захарыю, што жыў у Хеўроне (Іудзейскія горы), аднойчы архангел Гаўрыіл паведаміў, што яго жонка Елісавета народзіць сына, якога неабходна назваць Іаанам і які затым многіх з сыноў Ізраілевых паверне да Госпада Бога. Анямеўшы за сваё сумненне Захарый загаварыў на восьмы тыдзень нараджэння Прадцечы, калі даў імя яму, як і прадказвалася, — Іаан, што азначала "дар Божы". Іаан Хрысціцель прадказаў прыход Месіі — Ісуса Хрыста і прапаведаваў яго вучэнне. Ён распачаў абрад хрышчэння (мыцця) у вадаёмах і прымяняў яго ў Іардане ў самога Ісуса Хрыста.

Абрад з вадою супаў з язычніцкім купаннем у расе і вадзе, у якой, як лічылася, само сонца купалася.

У французаў бытуе прымаўка аб тым, што ў народным календары існуе чатыры Іваны: на аднаго стрыгуць (24 чэрвеня), на другога косяць (6 мая), на трэцяга малоцяць (24 жніўня), на чацвёртага топяць (27 снежня). На гэты конт рускі даследчык А. Ярмолаў (1901. С. 353) трапна заўважаў, што ў Расіі па календары больш шасцідзесяці Іванаў, і на ўсіх яшчэ рускі народ прымавак не склаў, нават на Іаана Хрысціцеля прыкмет менш, чым на святых Пятра і Паўла.

10/27. Самсон (Сямён, Самсон Сенагной) — прысвятак, звязаны з дажджамі. "На Самсона дождж — сем тыдняў то ж" (БСК, 1937); "На Самсона дождж: да бабінага лета мокра будзе" (Ляснічы, 1990).

Сем братоў. "Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды" (Паўлюкоўскі, 1934).

Самсон — прападобны Сампсон Страннапрыімец (памёр каля 530 г.), што нарадзіўся ў Рыме і стаў лекарам ад Бога, які вылечыў нават імператара Юстыніяна.

12/29. Пятро (Пятроў дзень, Пятро-Павел, Пятрок, Паўлюк, Павел, Пятра) — старадаўняе земляробчае свята, па сутнасці, завяршэнне Купалля. Селянін заўважаў: "Святы Пятро — у жыце ядро" (Крачкоўскі, 1874); "Пятрок у касу звоніць" (Слупскі, 1892); "Калі высыплецца ячмень, зязюля падавіцца зернем і больш не кукуе". Вядома, што зязюля куе ад Магдалены да Пятра ці Купалы, калі і заканчваюцца гулянні моладзі. На Брэстчыне спяваюць:

Да Пятра зязюльцы кукаваці,
Да восені дзеваньцы пагуляці.
Пятро пройдзе — зязюля ў вырай пойдзе,
Восень прыйдзе — дзеванька замуж выйдзе...

Дзяўчаты хадзілі ў лес "развіваць вянкі", якія былі "завіты" імі на Сёмуху, "кумаваліся" (выбіралі сяброўку на год). Палілі кастры, елі абрадавыя стравы, гушкаліся на арэлях, спявалі пятроўскія песні:

Пятрова ночка маленька,
Не выспалася паненка,
На новым ганку седзячы,
Міламу кашульку шыючы...

(Смаргонскі р-н)

Лічылася, што пасля Пятра лета ідзе на спад. "Прыйшоў Пятрок — апаў лісток" (Берман, 1869); "Пётр і Павел на гадзіну дзень убавіў, Ілля-прарок два ўвалок" (Анічэнка, 1992). Заканчваўся Пятроў пост.

Пра Пятра і Паўла таксама хадзіла нямала легендаў і казак, у якіх святыя паказваюцца ў выглядзе простых сялян ("Як Мікола і Пётр лашадзей на Украіне закуплялі", "Святы Пётра і скупая баба", "Як кулак зрабіў дзень доўгім" і інш.). Гэта гаворыць аб папулярнасці першавярхоўных апосталаў, якія не былі звязаны адзін з адным у жыцці, але былі пакараны ў адзін дзень як самаадданыя праваднікі Хрыста па загадзе імператара Нерона каля 67 года. На хрысціянскіх абразах іх часта паказваюць разам, а ў народным календары яны наогул зліліся ў адзін вобраз (Пятро-Павел).

Цесная сувязь Купалля з пятроўскімі традыцыямі наглядаецца ў многіх краінах. У Францыі гавораць, што "св. Жан кладзе хвораст, а св. Пятро яго падпальвае" або "св. Жан запальвае кастры, а св. Пятро іх тушыць" (КЗ, 1978. С. 21). Асабліва весела раней дзень Пітэра і Паўля (29 чэрвеня) адзначаўся ў Бельгіі: раскладваліся вогнішчы, як і на Яна. Цяпер свята забываецца і нават пераносіцца на бліжэйшую нядзелю. Тады ж яго адзначаюць і бельгійскія рыбаловы, лічачы св. Пітэра сваім апекуном (с. 59—60). Немцы гавораць: "Am Peterstag staht der Bauer mit der Sichel da" — "У дзень Пятра стаіць селянін з сярпом падрыхтаваным" (с. 128).

Швейцарскія прымаўкі сведчаць, што "ўсе тыдні ад Пятра да Барталамея (24 ліпеня) косяць і прыбіраюць сена". Зразаючы апошні

пучок травы, гаварылі: "забіць сабаку" або "зарэзаць казу" (с. 157). Гэта павер'е існуе і ў іншых народаў Еўропы, што сведчыць аб наяўнасці вегетатыўнага духа, які хаваецца ў раслінах.

Фальклорна-этнаграфічны матэрыял аўстрыйцаў сведчыць (с. 147) аб наяўнасці ў святых Пятра і Паўла рысаў гаспадароў маланак, якія, асабліва першы, замянілі міфалагічны вобраз боства грому. Гэты вобраз супярэчлівы і нічога не мае агульнага з хрысціянскім апосталам. Пра "гаспадара надвор'я" (Wetterherr) гавораць: "Пятро кідае кеглі".

У славакаў дзень Пятра і Паўла — традыцыйнае свята рабочых-гарнякоў. Шырока адзначаўся Пятро ў румын. Святога лічылі абаронцам дзікіх жывёл. Сваё свята адзначалі горныя пастухі, наладжваліся кірмашы, праводзіліся гульні і танцы. У адрозненне ад іншых еўрапейскіх народаў дзень не меў значэння ў аграрным календары грэкаў.

13/30. Паўпятро — дзень талакі.

Пасля Пятровага дня не дазвалялася працаваць (грэх), можна было толькі дапамагаць іншым, але не за плату, а за частаванне. Нават наймалі музыкаў. Пятроўская талака адлюстравана ў песнях: "А што ў полі шуміць, гудзе? Шуміць, гудзе. Там талака дамоў ідзе...", "Святы Пётра талаку збіраў копы сена вадзіць, стагі мятаць".

Падобныя звычаі знаходзім у балгараў, дзе ў Пятроў дзень забаранялася жаць, складваць снапы ў крыжы, паліць агонь, але можна рабіць "тлаку" (талаку), што не каралася (КЗ, 1978. С. 234).

Сымон і Юда. Сымон і Іуда — два з дванаццаці апосталаў, якіх вылучыў народ і замацаваў у выслоўі: "Сымана й Юды конь баіцца груды" (Слупскі, 1892).

14/1. Кузьма і Дзям'ян (Касьма і Даміан, Кузьма Сякач) — свята кавалёў і шаўцоў. "У дзень святога Касьмы і Даміана кузні не куюць і бабы не п'юць". Песню "Кузьма" спявалі тым, хто вянчаецца першы раз (не выконвалі ўдовам і ўдаўцам):

Скуй нам свадзебку,
Свадзебку крэпкую,
Даўгавечную,
На векі неразлушную...

(Дабравольскі, 1914)

Кузьма і Дзям'ян вядомы і як апекуны земляробства: "Кузьма сярпы зубіў, ідзя згубіў", "На Кузьму і Дзям'яна касіць ня рана", "Святы Пятро жыта спеліць, святы Кузьма сярпы робіць, а святы Дзям'ян сена грабіць" (Паўлюкоўскі, 1934).

На Палессі гавораць: "У Гарадку богато было сапожнікаў. Сапожнікі сьвяток свой робілі" (Столінскі р-н; Талстая, 1986. С. 188).

Беларусы Чарнігаўскай губерні называлі свята "Кузьма Сякач" і тлумачылі: "Ён, не шкадуючы, пасячэ ўсё градам, калі ў гэты дзень працаваць" (Косіч, 1901).

У легендзе "Кузьма-Дзям'ян", зафіксаванай Е. Раманавым (1891) у Гомельскім павеце, распавядаецца пра галоўных герояў, што зма-

галіся з ненажэрнай змяёй, як пра кавалёў, так і пра земляробаў. Царкоўная ж гісторыя сведчыць пра пакутнікаў-бяссрэбранікаў Касму і Даміана як пра лекараў, што дапамагалі людзям без платы, прапагандуючы ім Хрыста. І былі забіты з зайздрасці ў 248 годзе іх вучнем-лекарам.

Рускія жанчыны праводзілі Летнія Кузьмінкі (жаночыя братчыны), якія лічыліся бабіным, дзявочым і "курыным" святам (Усаў, 1997. С. 139).

17/4. Андрэй (Андрэй Наліва) — адзін з апекуноў земляробства, пра яго пяецца:

Трэці празнік — святы Андрэй,
Святы Андрэй, за ўсіх мудрэй,
Саху ладзіць, каня гладзіць...

Да Андрэя завяршаўся працэс выспявання жыта. Аб гэтым народная мудрасць сцвярджае: "На Андрэя азімыя наліліся, а таткаавёс да палавіны дарос", "Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма", "Зерне ў каласку, не валяйся ў халадку".

Хрысціянскі каляндар адзначае ў гэты дзень адразу трох Андрэяў: свяціцеля Андрэя, архіепіскапа Крытскага (712 —726 гг.), благавернага вялікага князя Андрэя Багалюбскага (1174 г.) і прападобнага Андрэя Рублёва, іканапісца (XV ст.).

18/5. Свята Месяца, Лампады. У ім, як сцвярджаў А. Кіркор, ёсць рэшткі культу Вялеса — "бога статка, апекуна пастухоў".

Як вынікае з іншых крыніц, у гэты дзень вечарам выходзілі людзі глядзець, як "гуляе месяц" (поўня). Па яго змяненнях, колеры прадказвалі будучы ўраджай. У Расіі таксама ведаюць, што "Афанасьев день — месяцев праздник" (Ярмолаў, 1901. С. 371).

21/8. Градавы дзень (Казанская). Засцерагаў ад нябесных стыхій, ад хвароб вачэй і галавы. У некаторых раёнах пачыналі касіць, праводзіць зажынкі. Гаварылі: "У дзень Казанскай увесь чарвец збіраецца пад адзін куст" (Ярмолаў, 1901. С. 373). Згодна з павер'ем, у гэты дзень чарвец (насякомае Cocaus), з якога раней рабілі фарбу, заносіцца вятрамі з цёплых краін на нашы палі і звіваецца ў клубок; трапляецца шчасліўцу, якому напісана ў родзе такая рэдкая ўдача. Назву Казанская прысвятку даў праваслаўны каляндар, які адзначае з'яўленне Казанскай Божай Маці (1579 г.), усталяваны пасля завявання ў 1522 годзе Іванам IV Казані.

Пракоп — прысвятак, звязаны з цёплымі ліпеньскімі днямі, бо гавораць у народзе: "Пракоп бок прыпёк". Царкоўны каляндар, акрамя з'яўлення абраза, прысвячае дзень вялікапакутніку Пракопію (303 г.) і праведніку Пракопію, Хрыста дзеля юродзівага, Усцюжскага (1303 г.).

У Югаславіі святы Пракоп лічыцца абаронцам чалавека і жывёлы ад змей, грому і ветру. Пчаляры Сербіі прымяркоўвалі да гэтага дня збор мёду.

У палякаў бытуюць прыкметы і прымаўкі: "Źle na Prokopa, jak zmoknie kopa" — "Бяда на Пракопа, калі змокне копа" (Ярмолаў, 1901. С. 373).

25/12. Прокл — прысвятак, звязаны з засцярогаю ад вялікіх рос, якія перашкаджалі сушцы сена, яно гніло (Невяровіч, 1859).

Шэраг імёнаў царкоўнага календара на гэты дзень пачынаецца пакутнікамі Проклам і Іларыем (XI ст.), Фядорам-варагам і сынам яго Іаанам ... "Вараг" быў забіты раз'яраным натоўпам у Кіеве (983 г.) разам з бацькам Фядорам, які не аддаў народу свайго сына дзеля прынясення яго ў ахвяру язычніцкаму Перуну.

Якуб. Прысвятак усебакова характарызуюць прыказкі і прымаўкі з Заходняй Беларусі: "На Якуба грэе люба", "Які Якуб да паўдня, такая да снежня зіма" (Паўлюкоўскі, 1934); "На Якуба хлеба поўна губа" (Смаргонскі р-н).

У Іспаніі (Кастыліі) захавалася прыкмета: "Каб рэпа была добрая, сей на св. Якава" (КЗ, 1978. С. 39). Больш вялікае свята там з бітвай быкоў, арэлямі, кірмашамі наглядаецца ля мясцовасці Сант'-яга-дэ-Кампастэла, бо Якаў (па-іспанску — Santiago) з'яўляецца іх апекуном. У народаў Бельгіі і Нідэрландаў свае прымаўкі: "Калі ліпа цвіце на св. Яна, то жыта спее на св. Якаба" (с. 59). Першы дзень жніва адзначалі раней урачыста. Там жа ўшаноўваюць св. Хрыстофеля, прызначаючы яго абаронцам ад грому. Дарэчы, у нас таксама ў гэты перыяд існуе некалькі дзён, звязаных з нябеснымі стыхіямі. Цяпер у некаторых краінах Еўропы вобраз Хрыстофеля некалькі мадэрнізаваўся. Ён лічыцца абаронцам аўтамабілістаў, і абраз яго красуецца на сучасных транспартных сродках (с. 61).

Скандынаўскія народы таксама звязваюць дзень Якоба (Yakob våthatt — па-шведску, Jakobsok — па-нарвежску) з дажджом і гавораць, што "прыйшоў Якоб у шляпе" (с. 100). У Фінляндыі вядома, што Яако вызначае надвор'е на жніво і ўсю восень, гэта пачатак заканчэння лета: "У ваду кінуты халодны камень", "Калі пойдзе дождж — будзеш есці кару". Фінскі даследчык К. Вілкуна лічыць, што Якаў быў звязаны з паняццем грамаўніка больш таму, што, па Евангеллю, ён і яго брат Іаан насілі імёны "сыноў грому". І з цягам часу вобраз дапоўніўся язычніцкімі рысамі Грамаўніка Укко (с. 113—114). У Германіі альпійскія зеннеры адзначалі свята са спаборніцтвамі, бо лічылі Якоба абаронцам пастухоў і жывёлы (с. 129).

Зразумела, што ў палякаў традыцыі прысвятка павінны быць вельмі падобнымі да беларускіх. Аб гэтым сведчыць бытаванне амаль даслоўнай прыкметы: "Jaki Jakób do południa, taka zima aż do Grudnia" (с. 177).

У чэшскіх гарадах быў вядомы абрад "скідвання казла" на Якуба з башні ці высокага дома, які выглядае як язычніцкае ахвяраванне (с. 194).

26/13. Гаўрылей — прысвятак (ад святкавання Сабора архангела Гаўрыіла, звеставаль ніка нашага паратунку). Змест прысвятка бытавы. Баяліся, каб град не пабіў каноплі.

У Югаславіі лічылі, што Гаўрыла здольны на прадухіленне непагадзі, на абарону чалавека і жывёлы (с. 213).

Ганна. Народ прыкмячаў: "Дождж на Якуба — для жалудоў згуба, а як Ганна з дажджом — дык гарэх з чарвяком" (БСК, 1937);

"Святая Ганна снапы кладзе" (Паўлюкоўскі, 1934); "Святая Ганна раніцы халодзіць. Калі на Ганну раніца халодная — то зіма будзе ранняя і халодная" (БСК, 1939).

У немцаў святая Ганна з'яўлялася апякункай жанчын, а таксама і абаронцай гарнякоў. Але найбольшую папулярнасць гэтае імя атрымала ў Аўстрыі ў канцы XVIII—XIX ст. Дзень ператварыўся ў грамадскае свята імяніннiц з тэатральнымі відовішчамі, балямі і падарункамі (КЗ, 1978. С. 148).

Ганна і Якуб у аўстрыйцаў вызначаюць "сярэдзіну лета" (Mittsommer), з гэтай пары пачынаюць памяншацца надоі. "Святая Анна і Якоб апускаюць палец у малако, Лоранц (10 жн.) — усю руку, а Бартль (24 жн.) выпівае яго амаль цалкам". Вельмі папулярны ў народаў Швейцарыі Якоб, які таксама лічыўся "сярэдзінай лета" і апекуном пастухоў. Паліліся "агні св. Якоба", праводзіліся традыцыйныя каровіны бітвы, праслаўляўся гаспадар жывёлы.

Славацкія жанчыны ў дні Якуба і Ганны праводзілі абрады, што садзейнічалі росту капусты: "Учора быў Якуб, сёння — Анны, завівайцеся, мае мілыя галовы.

(Гл. таксама 7 жніўня.)

Серпавіца (Серпавіна, Шыпілінка) — пятніца перад Іллёй. Дзень "зазубрывання" сярпоў, час падрыхтоўкі да жніва ў некаторых мясцінах. "Шыпілінка ў кузню ідзе, у кузню ідзе сярпы зубіць".

29/16. Афінаген. Прысвятак напамінае аб заканчэнні лета, бо ў гэты час заціхаюць пеўчыя птушкі (Анічэнка, 1992).

У царкоўных календарах — гэта свяшчэннапакутнік Афінаген, епіскап, і 10 яго вучняў (каля 311 г.).

У гэты час ва ўсіх краінах Паўночнай Еўропы шырока ўшаноўвалі святога Олафа, што пачынаў восень і чамусьці не быў заўважаны іншымі славянамі.

ЖНІВЕНЬ

1/19. Макрыны (Макрэня, Макрэні, Макрыдка) — прысвятак, з якім асацыіруецца макрэча, дажджлівае надвор'е, аб чым сведчаць і прыказкі: "Глядзі восень па Макрыне" (Сахараў, 1936); "Як не будзе на Макрыні дажджу, то не будзе бульба гнісці ў зямлі" (Тураўскі сл., 1984); "Як на Макрэню дождж, то будзе ўсю Спасаўку дождж" (Талстая, 1986).

Гэты дзень з дажджлівым надвор'ем звязаны ў народнай метэаралогіі розных краін. Маюцца звесткі не толькі па Расіі і Украіне, але і па Эстоніі, Францыі і інш.

2/20. Ілля (Лля, Галляш) — апякун земляробства і абаронца ад "нячыстай сілы", які ўвабраў у сябе рысы язычніцкага бога Перуна. Свята дажджоў і навальніц. Успрымаецца як канец лета і пачатак восені. Ілля багаты на прыказкі: "Прыйшоў Пятрок — сарваў лісток, прыйшоў Ілля — сарваў два", "Прыйшоў Ілля — укінуў у воду кусок ільда", "Ілля нарабіў гнілля", "На Іллю да абеда лета, а пасля абеда восень", "Ілля ваюе з чартамі, іх б'е перунамі", "Ілля жніво пачынае, а лета канчае", "Калі на Іллю паспелі чарніцы, паспела і

жыта", "Ілля блізка: гніся, баба, нізка, уставай раненька ды жні дапазненька", "Ілля пытае, ці гатова ралля, а Успленне, ці гатова насенне", "На святога Галляша з новых круп каша", "Да Іллі на сене пуд мёду, а на Іллю пуд гною", "Да Іллі поп дажджу не ўмоліць, пасля Ілліна дня баба фартухом нагоніць".

Пчаляры ведалі, што пасля Іллі ўжо не раяцца пчолы, таму і гаварылі: "Толькі да Іллі паглядай на вуллі" (Пяткевіч, 1938. С. 147—148).

Заканчвалі касавіцу, хадзілі талакою касіць удовам. У Лельчыцкім раёне гавораць: "Іванове сено — панове, а Петрове ўжэ не такове, а Іллінэ — удовінэ". Праводзілі зажынкі — свята пачатку жніва.

Святы Ілля — стара жняя.
Гаспадынька ідзець у поле,
З хлебам, соллю зажынаць,
Ды з маленькім сыночкам,
Ды з сярэбраным сярпочкам...

(Лукстэнскі пав.; Сахараў, 1940)

Часта ўпамінаецца Ілля ў песнях, якія спяваліся на Каляды:

Ілля па полю хадзіў,
Пашаньку радзіў.
Што ступлю стапою,
Як перайду гоні,
Стаяць стогі...

Па бару хадзіў
Да пчолкі радзіў.
На адной хвоі
Па пчолак двоі.
Ой, на хвоінцы
Да па троінцы...

(Пінскі пав.; Булгакоўскі, 1890)

Ілля — адзін з папулярных вобразаў у фальклоры, нягледзячы на тое што часцей ён малюецца як адмоўны — грозны і несправядлівы ("Ілля наробіць гнілля"). Такім несправядлівым і помслівым ён паўстае з легенды "Ілля і Пятро", што была запісана А. Сержпутоўскім у Мазырскім павеце. У ёй Ілля загадвае хмарам мачыць людзям сена, а Пятро разганяе іх. "Ухваціць Пятро мятлу, — распавядае далей народная памяць, — і паразганяе хмары па куткох, а неба чысценька падмяце. Та ось, адкуль ні вазьміся, тарахціць, едзе Ілля, крычыць, як на жывот, аж неба й зямля дрыжыць. Хмары таўкуцца як непрытомныя, вылазяць з куткоў, і ўжо лье такі дождж, што не толькі берагі, але і груды паплывуць. Моляцца людзі Богу, што паны дзяруцца, а ў мужыкоў чубы трасуцца, моляцца й просяць, каб Бог даў пагоду. Прызаве Бог Іллю, насварыцца на яго, а той і кажа, што столькі развялося нечысці-чарцей, што трэ іх громам пабіць, бо ўвесь свет запаганяць..." (1911. С. 16—17).

Жнівеньскія ліўні з бясконцымі маланкамі празвалі "рабінавымі днямі (начамі)", якія часцей пачыналіся на Іллю. Аб даўнасці гэтага паняцця сведчыць яшчэ Цвярскі летапіс, дзе апісваецца Чарнігаўская бітва 1024 года паміж братамі Яраславам Мудрым і Мсціславам ("Мстислав же слышав, изыде противу их на сечу к Листвену, и бяше осень, и ту ся сретогла... И бывше нощи рябинной, бысть тьма и гром бываше и молния и дождь. И бысть сечи зла и страшна...").

Існуе павер'е ў народзе аб громе. Грыміць таму, што Ілля (Пярун) грукаціць на калясніцы па хмарах і кідае маланкі-стрэлы ў нячыстую сілу, якая можа ператварацца ў розных звяроў, каб выратавацца. У прыродзе сапраўды пасля сонцастаяння (Купалы, Пятра) назіраюцца змены надвор'я як перамога Іллі над Пятром. З гэтымі міфамі, мусіць, і звязана даўняя завядзёнка паляўнічых пачынаць адстрэл звяроў.

Народнае ўяўленне аб святе Іллі цесна звязана з біблейскай гісторыяй аб прароку Іллі, што нарадзіўся ў Фесвіі Галаадскай яшчэ за 900 гадоў да хрысціянства. Ілля (у перакладзе з яўрэйскай — "апора Божая") перад язычніцкімі жрацамі і ізраільскім народам, які перастаў верыць у Адзінага і ад чаго тры гады была засуха, запаліў агнём з неба мокры ахвяравальнік, што не змаглі зрабіць жрацы са сваімі багамі. Гэтым язычнікі былі ўверваны ў адзінага Бога, жрацы былі забіты, а народ пасля малітвы прарока атрымаў доўгачаканы і жыццядайны дождж. За гэта і іншыя цуды Ілля па Божай волі ўзляцеў у неба на вогненнай калясніцы.

Адзіны старазапаветны персанаж і яго гісторыя прызнаны хрысціянскім культам побач з іншымі святымі (напрыклад, з Міколам Угоднікам). Язычніцкая традыцыя (Пярун) тут удала спалучылася з хрысціянскай, што трымаецца на такіх вызначальных асновах, як гром, дождж, калясніца.

У сувязі з тым што Ілля быў узяты на неба жывым на калясніцы, то, як мяркуюць даследчыкі, гэта дапамагло вобразу атрымаць адпаведныя рысы язычніцкага Грамаўніка. У Фінляндыі іжоры і водзі спраўляюць гулянні каля старых ахвярных камянёў (КЗ, 1978. С. 113). Венгры-католікі адзначаюць святога Іллеша, як народы праваслаўнага веравызнання, бо хрысціянства яны прымалі некалі ў праваслаўнай форме.

Больш шырокае святкаванне Іллі вядома ў Югаславіі. Там яго таксама надзяляюць уладай над громам (Грамаўнік), часткова — над дажджом і вятрамі; вобраз падобны Перуну. Вялікім святам лічаць яго мусульмане і праваслаўныя, у меншай меры — католікі. У Македоніі Іллю лічаць сваім апекуном возчыкі-славенцы, гарбары і інш. Сербы ў гэты дзень звычайна збіралі мёд. Сярод рытуальных страў: мёд, кукуруза, ягня — у мусульман, стары певень — у праваслаўных.

У Паўднёвай Балгарыі, дзе клімат халаднейшы, Ілля лічыцца сярэдзінай лета (средлето), а на Янаў дзень праводзілі святы ахвяраванне (Собор, Курбан). За трапезай падрыхтаванага быка ці барана ў гонар боства дажджоў і маланак язычніцкае свята зліваласа з грамадскай урачыстасцю (с. 234).

З Іллёй (20 ліп.) у румын бытуе нямала легендаў паўцаркоўнага і

паўязычніцкага зместаў. Міфалагічны вобраз быў звязаны яшчэ з двума: Іллёй-Пэлія, якога адзначалі 21 ліпеня, і Фокам (foc — агонь), якога ўшаноўвалі і адзначалі 22 ліпеня.

На думку многіх даследчыкаў, Ілля захаваў рысы культу Зеўса. Асабліва гэта бачыцца на прыкладзе міфалогіі грэкаў. Магчыма, вобраз бога грому і маланкі, апекуна навальніцы і дажджу зліўся з вобразам Геліаса — бога сонца. З распаўсюджваннем хрысціянства Геліаса замяніў Ілля, дзякуючы простаму сугуччу імён: па-грэчаскі сонца — óῆягоа, як лічаць тыя ж навукоўцы і прыводзяць розныя цікавыя факты (с. 274).

4/22. Мар'я (Магдалена). Жаночае імя хрысціянскай міраносіцы Марыі Магдалены, якое дало назву прысвятку, асацыіруецца ў народзе з клопатамі жанчын аб ураджаі і прадказаннем надвор'я: "На Мар'ю росна — лён будзе шэры, неўмалотны", "Цыбуля Магдалена — расці, пер'е, па калена" (Анічэнка, 1992). У гэтую пару ўжо дні халодныя, асабліва на поўначы. Прыкмячалі: калі туман халодны, зіма чакаецца ранняя і марозная (Ляснічы, 1990). З надвор'ем звязана і наступная прыказка: "Магдалена — вады па калена".

Цікава, што ў народаў Францыі, Бельгіі, Нідэрландаў, Германіі існуюць таксама падобныя прымаўкі, звязаныя з дажджом і св. Маргарытай (20 ліпеня), напрыклад, "Калі ідзе дождж на св. Маргарыту, то будзе шэсць сырых тыдняў" (КЗ, 1978. С. 60—61). У некаторых народаў Еўропы перыяд з 24 ліпеня па 24 жніўня лічыцца крытычным у адносінах да надвор'я. Немцы называюць Маргарыту Пагодніцай ("Margareth die Wetterfrau"), з якой прыходзіць лета; аўстрыйцы кажуць: "Маргарыта і Магдаліна рэдка прыгожыя".

Фіны пачыналі касіць 13 ліпеня, таму ў старадаўніх драўляных календарах дзень пазначаны граблямі. А з'явіліся яны, згодна з фінскім даследчыкам К. Вілкуна, наступным чынам. Дзень святой Маргарыты (Маркеты) пазней быў перанесены з 13 на 20 ліпеня. Як вядома, хрысціянская святая перамагла дракона сілаю сваёй веры і крыжа. Менавіта крыж напачатку быў адлюстраваны ў календарах, а затым ужо трансфармаваўся ў граблі (с. 112).

Даследчыкі ў падобных традыцыях ахвярапрынашэнняў (каб мядзведзь не задраў жывёлу) на Магдалену ў Эстоніі і Фінляндыі бачаць праяўленне культа мядзведзя (с. 112). Немцы не пачынаюць на Марыю Магдалену (22 ліпеня) ніякай справы, бо гэты дзень лічыцца нешчаслівым; просяць у апякункі пакаяння. У скандынаўскіх народаў — спавядальны дзень хворых жанчын.

Марыя Магдалена лічыцца паслядоўніцай Ісуса Хрыста. Яна стаяла разам з іншымі жанчынамі ля распяцця, аплакваючы пакуты Выратавальніка, які першым з'явіўся да яе пасля ўваскрашэння. Марыя Магдалена стала першай евангелісткай, і таму яна роўнаапостальская, бо прыраўнялі яе прапаведніцкае жыццё з жыццём 12 апосталаў. Нездарма гэты вобраз займае ў іканапісе другое месца пасля Багародзіцы. Здаўна Марыя Магдалена з'яўляецца апякункаю дзяўчынак-сірот.

6/24. Барыс (Глеб, Хлеб Барыс, Барысы, Барыс Палікоп) — адзін з апекуноў земляробства. "Святы Барыс снапы возіць", "На

Глеба і Барыса хлеба напарыся і за раллю бярыся", "Барыс і Глеб — паспеў хлеб" (Паўлюкоўскі, 1934). На Смаленшчыне прызнаваўся "грозным святам хлябоў", называўся "Хлеб Барыс". У полі не працавалі, засцерагаліся вятроў, заканчвалі купацца (Дабравольскі, 1914). "Па Барыса за хлеб не бярыся", — лічылі ў народзе. Бо Ілля пасылаў свайго суседа Барыса Палікопа забіваць Перуновымі стрэламі палявых д'яблаў, у якіх часта пападаў, і спальваў копы.

У некаторых раёнах лічылі, што ад Барыса на працягу трох тыдняў павінна адбыцца "рабінавая ноч", якая нібы спрыяла паспяванню рабіны і ў якую без перапынку лье дождж і шугае навальніца.

Народ вылучыў з невялічкага шэрага кананізаваных імён на гэты дзень князёў Барыса і Глеба, якія былі забіты іх братам Святаполкам у 1015 годзе.

7/25. Ганны (Ганна) — прысвятак. У каляндарных песнях паказваецца як дбайная жняя:

Меншы святочкі носяць снапочкі,
Святы Ганны бабкі стаўляюць,
Святы Барыс бабкі злічае...

(Лепельскі пав.; Шэйн, 1887)

Святы Барыс снапы зносіць,
Святыя Ганны дамоў возяць...

(Барысаўскі пав.; Тышкевіч, 1847)

Прыказкі таксама малююць Ганну гаспадыняй-жняёй: "Святая Ганна снапы кладзе" (Паўлюкоўскі, 1934). Хаця лічылася, што на прысвятак можна было працаваць толькі на талацэ.

Дзень у памяць канчыны Ганны, маці Прасвятой Багародзіцы.

Італьянцы і немцы лічаць дождж у гэты дзень з'явай дабрадзейнай. У Італіі кажуць, што дождж на святую Анну ператвараецца ў манну або: дождж — дар святой Анны. Не толькі пачатак жніва, але арэхаў, ранняга вінаграду. Акрамя таго, моладзь Польшчы ўпадабала святую, бо кажуць: "Szczęśliwy, kto na Annę upatrzy sobie pannę" — "Шчаслівы той, хто на Анну знойдзе сабе панну" (Ярмолаў, 1901. С. 391—392).

9/27. Палікоп (Палікапа, Палікапы) — дзень жніва, у які нібы маланка паліць копы, стагі, хаты. У некаторых раёнах Палікопам называюць дні ад Барыса да гэтага дня. Некалі стараліся ў полі не працаваць. У Столінскім раёне гавораць: "На Палікопу як робіш, выйдэ хмара і ўдарыць гром і спаліць копу хлеба" (Талстая, 1986).

Палякі Палікопам называлі Пятра (1 жн.), грэкі "падпальшчыцай снапоў" — дзень Богамаці Влахернскай (2 чэрв.).

Панцеляймон (Панцялей). На Магілёўшчыне лічыўся лекарам ад хвароб галавы (Раманаў, 1912). У народзе казалі: "З Панцялея капуста пачынае ў качан завіваца. Хто на Панцялея працуе, таму надалей не пашанцуе" (Ляснічы, 1990).

Палікоп — чыста народная традыцыя, а прысвятак Панцеляймон утварыўся ад імя хрысціянскага вялікапакутніка і лекара, што знайшло адлюстраванне і ў народнай інтэрпрэтацыі гэтага вобраза.

Румыны лічаць дзень 27 ліпеня канцом лета ("лета сустракаецца з зімою"), Панцеляймона — малодшым братам Іллі і называюць святога Спадарожнікам: "Пінціліе Спадарожнік — уход лета" (КЗ, 1978. С. 252).

10/28. ***Лаўрын***. Прысвятак напамінаў селяніну, што ўжо можна малоць першае жыта на муку: "На Лаўрына спяшай да млына" (БСК, 1937).

У народаў Еўропы святы Лаўрын даволі папулярны, з ім звязана нямала прыкмет, асабліва ў палякаў."Swiety Wawrzyniec weźmie lata wieniec" — "Святы Лаўрынец бярэ ў лета вянец". У італьянцаў Лаўрэн у адной руцэ трымае агонь, а ў другой — дождж (Ярмолаў, 1901. С. 414—415).

Немцы гэты самы спякотны дзень звязвалі з рознымі сельскагаспадарчымі работамі. Святкаваўся ў Германіі дзень Лаўрэна з другой паловы X ст. У сувязі з тым што гэты святы, згодна з паданнем, прыняў пакутніцкую смерць на пракалёнай рашотцы, то ён і стаў абаронцам людзей, якія звязаны з агнём: пажарнікаў, кухараў, прасавальнікаў, вугляпалаў (КЗ, 1978. С. 129).

У лужычан існуе прыкмета: "Калі ў гэты дзень дождж, то не будзе палявых мышэй" (с. 198). Славенцы і харваты па надвор'і варажылі, якая будзе восень. У Славеніі заканчвалі сенакос на Лаўрэнца і лічылі прысвятак завяршаючым лета (с. 215).

Народы Бельгіі і Нідэрландаў да Лаўрэна прымяркоўвалі ўборку клубневых культур, пакуль не зачасцілі дажджы. Акрамя таго, святому прыпісваюць здольнасці аберагаць ад апёкаў і пажараў. Вячэрнія знічкі лічаць слязьмі Лаўрэна. У некаторых рэгіёнах Скандынавіі Ларсок (Larsok) — пачатак восені, па ім вызначалі надвор'е.

Фіны на Лауры пачыналі сеяць ужо новым зернем, нават калі зямля была сухой, і гаварылі: "Лепш на Лауры ў попел, чым на Перту (Варфаламея) у лужу" (с. 115).

11/29. Калі ў гэты дзень туман — рыхтуй свіран пад авёс і ячмень (Ляснічы, 1990).

12/30. Сіла (Іван, Іван Воін). У праваслаўным календары гэты дзень прысвечаны апосталам ад 70-ці: Сіле, Сілуану, Крыскенту, Епенету, Андроніку, а таксама пакутніку Іаану Воіну і іншым. Народны каляндар сярод іх вылучыў дваіх. Пра аднаго з іх у народзе кажуць:"Хто на Сілу жыта пасее, у таго на хлеб надзея" (Паўлюкоўскі, 1934). Да гэтага часу ўжо вызвалялася нямала палёў, і неабходна было распачынаць новую сяўбу. Як сведчаць Е. Раманаў і М. Косіч, за Іванам Воінам у народзе замацавалася функцыя абаронцы ад зладзеяў. Прататып яго — пакутнік Іаан (IV ст.) быў воінам у імператарскім войску Юліяна Адступніка, што накіроўваў сваіх узброеных падданых забіваць хрысціян. Але Іаан Воін вызваляў іх, за што і быў пасаджаны ў цямніцу. Тут, магчыма, народны вобраз мае частковае супадзенне з хрысціянскім і пабудаваны ва ўсходніх славян на гульні слоў.

13/31. Спасаўскія запускі — пярэдадзень Спасаўскага посту.

Праводзілі абрад — гульню вызначэння першага засявальшчыка жыта пры дапамозе яек, якія варылі напярэдадні Першага Спаса

кожнаму мужчыне: у каго яно аказвалася паўнейшым, у таго сейбіта ўраджай будзе "поўным" (Невяровіч, 1859. С. 164).

14/1. Макавей (Макава, Макаўе, Першы Спас, Спас Мядовік, Медзяны Спас) — свята маку і мёду. Праводзілі абрады з макам, ужывалі ў ежу, рабілі варэнікі з мёдам, а таксама елі тое, у што можна было макаць. Асвячалі ваду, зёлкі, садовыя кветкі, моркву, сланечнік. Елі пірагі з макам і моркваю. Ведалі: на Макавея трэба ўволю наесціся маку. На Тураўшчыне "глухі мак свецілі і осыпалі хлеў, хату от небожчыкаў. І ек на суд ішлі , то кругом себе осыпалі" (Тураўскі сл., 1984). Варажылі: "Макавею, Макавею, я на цябе канапелькі сею. Скажы мне, Макавею, дзе мая пара, каб я з ім у гэтую ноч канапельку брала" (Брагінскі р-н; Талстая, 1986). Пчалаводы правяралі пчол, "макалі ў мёд нажы" (Дабравольскі, 1914). Для збору мёду ўсе апраналіся па-святочнаму. Частаваліся без гарэлкі і закускі з рэзкім пахам. Раней запальвалі дымар "жывым агнём", выкарыстоўвалі свянцоную ваду (Сержпутоўскі, 1914). У гэты дзень надавалася вялікая роля і вадзе, праводзілі "вадзяную адправу" — крыжовае шэсце да вадаёма (Раманаў, 1912).

Існавалі прыкметы: "Як на Юр'я дождж — будзе рыбы многа, а на Макава — будзе многа грыбоў" (Талстая, 1986); "Калі на Макаўе не бывае дажджу, то будзе шмат пажараў" (Дамбавецкі, 1882).

Свята ўсебакова адлюстравана ў народнай творчасці. У валачобных песнях зазначаецца: калі Ілля "жыта зажынаіць залатым сярпом", то "Святы Макавей з поля сабіраіць", "Святы Макавей бульбы накапаў ... рабят накарміў". Прыказкі сцвярджаюць: "Першы Спас — провады лета", "Ад Першага Спаса халодныя росы" (БСК, 1937).

Душыкі. У Лельчыцкім раёне ў першы панядзелак Спасаўкі пяклі пячэнне ("душыкі") па колькасці душ у сям'і, макалі яго ў мёд, затым у попел. Каб пазбегнуць сустрэч са змеямі, трэба было сказаць: "Лучшэй буду душыкі ў попел мочаць, чым на сабе шохлю (змяю. — *А.Л.*) дзержаць".

Спасаўка (Спасаўка Ласаўка, Спажын пост) — пятнаццацідзённы асенні пост (да 28 жніўня). Спявалі:

Спасаўка, пералётная пташка,
Дзе лета летавала,
Дзе будзем зімаваць?
— Летавала ў пшаніцы,
У сцюдзёнай вадзіцы...

(Бялыніцкі р-н)

Папоў зык. Смаленскія беларусы называлі так канец ліпеня і пачатак жніўня па аналогіі з "кароўім і конскім зыкам"(гл. 26 чэрвеня). Раней у гэты час папы хадзілі па вёсках за "ніўю" — зборам жыта для пасеву (Дабравольскі, 1914).

Цікавае асацыятыўнае супадзенне адбылося ў назвах і традыцыях святкаванняў. Старадаўні звычай ушанавання маку, у якім праяўляецца язычніцкі татэмізм, і хрысціянская традыцыя ўшанавання памяці сямі пакутнікаў Макавеяў (166 г. да Раства Хрыстова) гучаць аднолькава і зліліся ў народным святе Макавей (Макава, Макаўе).

У царкоўным і народным календары — Спасы (14, 19 і 29 жніўня). Першы Спас — святкаванне Усеміласцівага Спаса і Прасвятой Багародзіцы было ўведзена ў XII ст. пасля паходу князя Андрэя Багалюбскага на валожскіх балгараў у 1164 годзе. Фальклярыст І. Крук лічыць, што тры народныя святы "запазычаны з царкоўнага календара". Зусім супрацьлеглае і даволі абгрунтаванае меркаванне выказаў яго калега У. Сысоў. Ён сцвярджае, што Спас — язычніцкае бажаство, "якое ўвасобіла ў сабе Дух ураджаю, а магчыма, што нават узначальвала цэлы пантэон Духаў поля, лесу, лугу і г.д.", і пазней, не асіліўшы старажытныя вераванні і погляды селяніна на Спасаўскія святкі, царква часткова асімілявала, зрабіла ідэйнае напластаванне (1997. С.197—199). Вось якім уяўляецца беларусу Спас: "Святы Спас, спасі нас"(у замовах, абрадавых песнях); "Святы Іспас — стары дзядок, на восець садзіў, жыта малаціў...", "...па полі ходзіць, копы лічыць...", "...гнаі водзіць", "...едзець у поле ды зямельку мяшаець, прыгатаўляець" (у валачобных песнях).

На 1 жніўня па каталіцкім календары прыходзіцца дзень памяці святых Пятра і Макавея, аднак, як сцвярджаюць этнографы (І. Граздова), яны не аказалі ўздзеяння на кельцкае язычніцкае свята пачатку жніва ў ірландцаў (КЗ, 1978. С. 76). У скандынаўскіх народаў на свята Пятра (Peders fengsel — Пятро ў кандалах) забараняліся сельскагаспадарчыя работы. "Нарвежскі народны каляндар" на 1898 год вызначаў: калі на 1 жніўня дождж, то і будзе працягвацца тры тыдні (с. 102).

Румыны на Макавееў дзень (Macovei) акраплялі сады і агароды, вынішчаючы шкоднікаў, асвячалі кветкі, зёлкі, снапы і называлі яго Мядовым (Macoveiul stupilor), бо качалі першы мёд (с. 252).

У Македоніі лічаць, што ад братоў Макавеяў лета пачынае паварочваць да зімы. У праваслаўных шмат што забаранялася: на жаночыя работы, купанне і інш.

15/2. Базыль. За хрысціянскім Васілём Спаса-Кубенскім (XV ст.) ці Маскоўскім Цудатворцам (1557 г.) замацавана прыказка: "Базыль авечкам воўну дае" (Паўлюкоўскі, 1934).

Прачыстая (Першая Прачыстая, Першы святок, Зельная). У каталіцкім календары — Унебаўзяцце Божай Маці. Існуе шмат прыказак і прыкмет на гэты дзень: "Прыйшла Прачыста — стала поле чыста", "Зельная Божая Маці ўсяго можа нам даці" (БСК, 1937); "Да святка араць — лішнюю капу нажаць", "Прачыстая прынясе хлеба чыстага", "Першы Святок і першы світок" (Паўлюкоўскі, 1934). Свенціць зёлкі, збожжа і садавіну.

У Італіі сезон летніх работ завяршаюць святам Assunta (Assunzione). У ім характэрна злілося хрысціянства з язычніцтвам. Некаторыя даследчыкі бачаць паходжанне свята ў антычным святкаванні ў гонар багіні ўрадлівасці Дземетры, а італьянскія даследчыкі знаходзяць у ім рэшткі старадаўніх абрадаў Ferragosto, калі рымляне святкавалі заканчэнне жніва, ушаноўваючы Консуса — старажытнаітальянскага бога зямлі і пасеваў (КЗ, 1978. С.15). Некаторыя іспанскія даследчыкі лічаць, што апошняе летняе свята Успленне Багародзіцы

(Asuncion de la Virgen), або, па-народнаму, Жнівеньская дзева (Virgen de Agosto), мае карані ў даўніх земляробчых абрадах, звязаных са зборам ураджаю, і што Дзева Марыя замяніла сабою ранейшы вобраз багіні-маці, багіні ўрадлівасці (с. 55). У многіх краінах Еўропы на свята Успленне Багародзіцы, якое было ўведзена рымска-каталіцкаю царквою ў VII ст., асвячаюцца агародныя і палявыя расліны, што лічылася гаючым і аберагаючым. У Скандынавіі свята Успленне, ці Асенняй Богамаці (Marias himmelfart), — вялікае свята перад пачаткам апошніх асенніх работ. Германцы называюць яго Вялікім жаночым днём (grosser Frauentag), Жаночым днём у жніве, ва ўборцы (Frauentag in der Scheidung; im Schnitt; in der Ernte), Букетам жаночага дня (Buschelfrauentag). Даследчыкі (с. 129) адзначаюць, што ў гэтым вялікім царкоўным свяце дахрысціянскія і свецкія элементы пераважаюць над царкоўнымі. Выказваецца думка, што, напрыклад, літургія, якая звязана з асвячэннем зёлак, павінна была замяніць язычніцкія германскія ўборачныя абрады.

Венгерскія даследчыкі лічаць, што ў каталіцкіх і пратэстанцкіх традыцыях, прымеркаваных да дня Багародзіцы (nagyboldogasszony), захоўваюцца рэшткі культу нейкай старажытнай мадзьярскай багіні (с. 167).

Румынскі фальклорны матэрыял паказвае, што культ Божай Маці, які вельмі папулярны ў народзе, магчыма, аб'яднаў у сабе культы нейкіх язычніцкіх багінь. У некаторых раёнах захаваліся сляды даўніх астральных уяўленняў аб тым, што Божая Маці — зорка, размешчаная ля Месяца ці Венеры і інш. (с. 252).

У албанскім фальклоры тутэйшыя духі-гаспадары, якія ўяўляліся ў жаночых вобразах, зліліся з хрысціянскімі персанажамі на свяце "Уваскрашэнне" (Gjalliges). На ім сумесна католікі і мусульмане наведвалі "крыніцу багіні" (kronii Zojës) на самай высокай вяршыні ў гарах (с. 264).

Папулярнасць Успленія Багародзіцы ў Грэцыі даследчыкі тлумачаць тым, што з распаўсюджваннем хрысціянства культ Марыі ўзнік на месцы культу Афіны, які адзначаўся, згодна з атычным календаром, у жніўні (с. 276).

(Гл. таксама 28 жніўня.)

16/3. Антоны Віхравеі. У народным уяўленні розныя цуды асацыіруюцца з выключнымі з'явамі прыроды. Таму і дзень Антонія Рымляніна, наўгародскага цудатворца (1147 г.), атрымаў у людзей назву Антоны Віхравеі (БСК, 1937). Ён пазначаны маланкамі, вятрамі і дажджамі.

Рох— "маленькі святок", "кірмаш на паненак". Панічы і паненкі ездзілі на кірмаш, дзе з бацькамі рабілі змовіны, дамаўляліся пра пасаг. "Калі паненка гожая, та й пасагу не шмат трэба, калі ж яна няўдалая да яшчэ рабая, та пасагу трэба накінуць якую-небудзь кацярынку (царская асігнацыя) на рабацінне" (Сержпутоўскі, 1930).

Святы жыў у Францыі (пасля 1327 г. і перад 1420 г.). За сваю святасць ён пасля смерці стаў апекуном ад заразы.

У палякаў прысвятак звязаны з уборкаю гароху: "Na święty Rosh — w stodole groch" — "На святы Рох у гумне гарох". Адпаведна

французы і італьянцы асацыіруюць святога з капустай і арэхамі (Ярмолаў, 1901. С. 422).

17/4. Еўдакія — прысвятак, які напамінаў аб уборцы агуркоў (Анічэнка, 1992). Раней на Русі Еўдакію называлі Агурэчніцай, Малінаўкай і Сенагрэйкай (Усаў, 1997).

Хрысціянская Еўдакія ў IV ст. разам з дзевяццю тысячамі іншых была ўзята ў палон войскамі персідскага цара, дзе займалася прапаведніцтвам хрысціянства, за што згубіла галаву.

19/6. Яблычны Спас (Спас, Другі Спас, Вялікі Спас, Сярэдні Спас, Іспас) — свята садавіны. Асвячалі садавіну, пасля чаго дазвалялася ўжо есці яблыкі, грушы, слівы. Таму і гаварылі:"Добра яблычка к Іспасу" (Сержпутоўскі, 1930). Да гэтага не дазвалялася есці яблыкі, бо яны лічыліся грэшнымі пладамі. Згодна з Бібліяй, змей-спакушальнік праз яблык зрабіў грэшнай Еву. Таму першыя плады неабходна было асвяціць у дзень Пераўтварэння Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста. Даставалі і асвячалі таксама мёд, каласкі новага ўраджаю. Усё можна было ўжываць у ежу, аб чым і сцвярджала прыказка: "Спас — усяму час". Пачыналі сеяць азіміну.

Да ўсходу сонца праводзілі абрад выгнання клапоў. "Прыйшоў Спас, штоб не было клапоў у вас!" (Раманаў, 1912). Паколькі на тую пару з'яўляецца шмат аваднёў, таму ў Лельчыцкім раёне кажуць: "Прыйшоў Спас, то пабярэ чорт і нас".

Надвор'е становіцца халаднейшым і наогул лічыцца, што ўжо скончылася лета: "Прыйшоў Спас — і лета ад нас", "Першы і Другі Спас — бяры рукавіцы ў запас" (Паўлюкоўскі, 1934). У валачобных песнях спяваецца:

Святы Спасік, пільны часік,
Жытцо возіць, Бога просіць:
— Перанясі, Божа, маё жытцо...
праз гумянцо.

* * *

А святы Іспас, старэнькі дзядок,
На восець садзіў, жыта малаціў.

* * *

Святы Іспас
Яблыкі свенціць...
Ён гнаі возіць...
Жыта пасвяшчаіць.

Царкоўнае святкаванне звязана з біблейскімі падзеямі. Ісус Хрыстос збіраўся ў апошні раз ісці ў Іерусалім. На гары Фавор яго вучні ўбачылі нечакана пераўтворанага Ісуса (у белым адзенні, асветлены сонцам твар) і пачулі нябесны голас: "Гэта ёсць Сын Мой Любімы, у Якім Мая добрая воля, Яго слухайце". Значэнне пераўтварэння ў тым, што Хрыстос паказаны не як адзін з роўных апосталаў, а які стаіць над імі.

У сербаў царкоўнае Пераўтварэнне аддзяляе лета ад зімы. Замест яблыкаў амаль такую ж ролю, як у нас, займае вінаград. Пасля асвячэння яго можна было ўжываць. Вынімалі соты з вулляў, забаранялася купацца, існавалі іншыя павер'і і прыкметы. У румын, акрамя таго, у гэты дзень стараліся не крыўдзіць дзяцей і суседзяў.

23/10. Лаўрэн (Лаўрын). Як вядома з папярэдняга адпаведнага прысвятка (гл. 10 жніўня), Лаўрын, ці Лаўрэн, з'яўляецца днём млынара. Паколькі работа млыноў у мінулым залежала ад ветру і вады, то народныя прыкметы былі скіраваны да гэтых з'яў: калі хвалявалася вада, то восень абяцала быць ціхмянай, лагоднай, а зіма — мяккай, адліжнай (Ляснічы, 1990). Захавалася і прыказка: "Баўтрамей і Лаўрын паказваюць, якая прыйдзе восень" (БСК, 1939).

Назву прысвятку даў царкоўны каляндар, па якім 23 жніўня — дзень памяці шэрага імён, у тым ліку пакутніка Лаўрэнція Рымскага (258 г.) і блажэннага Лаўрэнція, Хрыста дзеля юродзівага, Калужскага (1515 г.). У адрозненне ад беларусаў, у рускіх Лаўрэнцій лічыцца лекарам хворых вачэй, водахістальнікам.

24/11. *Баўтрамей (Бартэк, Баўтрук).* Прыказкі, звязаныя з прысвяткам, добра характарызуюць надыход восені: "Святы Баўтрамей душыць аваднёў і труціць мух", "Святы Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей", "Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей" (Паўлюкоўскі, 1934); "Які Бартэк нясець дзень, такая будзець і восень", "На святога Баўтрука бліжэй да агня рука", "На святы Бартэк кінь жыта паўчвяртэк" (Ярмолаў, 1901. С. 427).

Асабліва ў палякаў, дзе святы найбольш папулярны, маюцца падобныя прымаўкі і прыкметы: "Na święty Bartek rzuć żyta półćwiartek" — "На святы Бартэк кінь жыта паўчвяртэк"; "Na świętego Barteomieja oświęca się, siew i knieja" — "На святога Варфаламея пара сеяць і паляваць"; "Święty Bartłomej źwiastuje, jaka jesień nastepuje" — "Святы Варфаламей звястуе, якая восень наступае".

Італьянцы лічаць, што ўжо ластаўка адлятае сабе з Богам.

Англічане таксама ў сваіх прыкметах звязвалі прысвятак з надыходам новай пары: "Святы Барталамей прыносіць халодную расу" (КЗ, 1978. С. 80). У Скандынавіі на Барсок (Barsok) рэжуць дробных свойскіх жывёл і лічаць, што русалка ідзе са сваім табуном з пашы (с. 104). Фіны знаходзяць у сваіх традыцыях сляды авечага культу (с. 116). Немцы лічаць: "Калі не пажата поле і палегла жыта, то Барталамей прайшоў", "Барталамей прыносіць спеласць і снег" (с. 130). Сваё свята адзначалі рыбаловы, пастухі, леснікі, праводзіліся кірмашы. У народаў Швейцарыі ў Альпах праводзілі абрады першага падзелу сыроў паміж гаспадарамі статкаў.

Спасаўскія Дзяды — пятніца—субота перад Успленнем, абрадавая памінальная вячэра.

Чарвівая нядзеля. У некаторых мясцінах Віцебшчыны перад Успленнем пачынаецца так званая Чарвівая нядзеля, на якую не сеялі, бо ўраджай нібы даваў затым "чарвівую муку" са шкоднікамі (Нікіфароўскі, 1897).

27/14. Міхей — прысвятак, па якім прагназіравалі надвор'е на верасень: дажджлівы, калі на Міхея бура ці вецер; лічылася таксама, што ў гэты дзень выспяваюць брусніцы (Анічэнка, 1992).

28/15. Прачыстая (Успленне, Багародзіца, Першая Прачыстая, Вялікая Прачыстая, Аспажа, Гаспажа, Спажа, Вялікая Спажа, Зялёная, Зельная) — свята ўраджаю і падрыхтоўкі да сяўбы.

Асвячалі "бараду" — апошні снапок, зернем якога пасля Прачыстай пачыналі засеўкі, а таксама зёлкі і гародніну. Наладжвалі свята свечкі: пераносілі яе з адной хаты ў другую, гасцявалі. На Палессі ўпраўляліся з просам і ў гэты дзень варылі з яго кашу. Наглядалі за бусламі, што збіраліся на зжатых палетках і адляталі ў вырай.

Амаль паўсюдна вядомы прыказкі: "Прыйшла Прачыстая — стала поле чыстае", "Прачыста — сяўба чыста, а касьба не чыста". Менш распаўсюджаны наступныя: "Гаспажа — хлеба дзяжа" (Брэсцкі пав.; Крачкоўскі, 1874); "Прыйшла Прачыстая — перапечка чыстая" (Ігуменскі пав.; Шэйн, 1883); "Прачыстая не глядзіць бяла, а глядзіць, каб паляніца была" (Клічаўскі р-н); "Надышло Успленне — цягні бульбу за карэнне" (Столінскі р-н).

Прачыста маці ішла зажынаці
У чыстае поле з пшонным пірагом.
З пшонным пірагом, з залатым сярпом.
У левай руцэ пшонны піражок,
У правай руцэ залаты сярпок:
Я раз разну — я сноп нажну,
Я і два разну — я капу нажну!
Сноп ад снапа — на валовішча,
Капа ад капы — паўтараста шагоў!

(Магілёўская губ.; Раманаў, 1912)

Прачыста жытцо сеець,
А меншая ў помач стала,
Жытцо скора запахала.

(Міёрскі р-н)

У некаторых раёнах лічылася, што ад Прачыстай пачынаецца "маладое бабіна лета" і доўжыцца да Галавасека — 11 верасня (Раманаў, 1912).

Як вынікае з фальклорных матэрыялаў , засеўкі, што праводзілі звычайна пасля Прачыстай, з'яўляліся вельмі важным этапам у земляробчым календары беларускага сялянства. Фальклярыстамі мінулага зафіксавана вялікая колькасць звычаяў, абрадаў і павер'яў, звязаных з гэтым этапам, ад якога ў многім залежаў будучы ўраджай. Тут, як і ў іншых вялікіх святах, добра перапляліся старадаўнія язычніцкія і хрысціянскія традыцыі. Першыя звязаны з такімі магічнымі атрыбутамі, як "поўня", "яйка", "сякера", "ахвяраванне зямлі", "сустрэча", "чысціня", і іншымі, што суправаджаюцца рознымі і шматлікімі павер'ямі, другія — з асвечаным зернем, малітвай.

Даследчыкі выказваюць думку, што 15 жніўня (па ст. ст.) можна лічыць агульнаславянскім святам ураджаю (Уласаў, 1993. С. 131). Царква прынцыпова ў гэты дзень наладжвала асвячэнне семяннога зерня, без якога нельга было пачынаць сяўбу. Гэтая акалічнасць вельмі паўплывала на змяненне ў народных традыцыях. Такім чынам хрысціянская царква адзначала Дзень смерці — Успленне Прасвятой Уладаркі нашай Багародзіцы і Прыснадзевы Марыі, душу якой без пакут прыняў у царства нябеснае Госпад Ісус.

У народаў Італіі, Германіі, Польшчы і інш. існуюць прыкметы, звязаныя з Успленнем, аб прадказанні ўраджаю. Немцы на Krautweihe асвячаюць расліны і зберагаюць іх дзеля аховы дома ад маланкі.

29/16. ***Ян.*** "Ян па лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў".

У скандынаўскіх народаў існуе павер'е, што на Іаана нельга рубіць кусты і лес, бо чалавек захварэе (КЗ, 1978. С. 104).

Трэці Спас (Малы Спас, Хлебны Спас, Арэхавы Спас) — адно са святаў хлеба.

Шмат дзе спраўлялі дажынкі — свята канца жніва. Упрыгожвалі стужкамі і кветкамі "бараду". Ахвяравалі хлеб і соль духу нівы, Вяласу, казлападобнай істоце. "Воласаву бародку" жнеі неслі гаспадару і ставілі ў кут. Зерне і каласкі ўжывалі на працягу ўсяго года ў розных магічных абрадах. На Палессі, напрыклад, "вылівалі Волас" пры дапамозе каласкоў, вады і замовы: "Волас, Волас, выйдзі на чысты колас...". Гэтым самым перасцерагалі ад зубнога болю. У іншых раёнах "лячылі" "валасень".

Канец жніва і змена надвор'я адлюстраваны ў прыказках: "Трэці Спас хлеба прыпас", "Па Трэцім Спасе трымай рукавіцы ў запасе" і інш.

У некаторых раёнах гэты дзень яшчэ называюць Арэхавым Спасам, бо раней у царкве асвячалі арэхі, якія нарыхтоўваліся дзецьмі.

Яшчэ К. Машынскі ў 1914 годзе зафіксаваў, што на Усходнім Палессі "на дажынкі падаюць чвэрць гарэлкі і пеўня або пеўня, яечню, рыбу і парася; певень абавязкова павінен быць" (1928. С. 223). Згадкі аб рытуальнай страве фіксуюць і сучасныя крыніцы (Тураўскі сл., 1983. С. 27; 1987. С. 412). Жніўныя рытуальныя стравы з пеўнем вядомы народам Еўропы, дзе даследчыкі лічаць іх рэшткамі ахвярапрынашэння (КЗ, 1978).

Міфалогія жніва найбольшае развіццё і захаванасць атрымала ў беларускіх абрадах і жніўнай паэзіі. У нас існуюць такія вобразы, як Багач, Жыцень, Жытняя Баба, Спарыш, Рай (Раёк). А. Ліс не без падстаў бачыць у дажынкавых песнях, што звязаны з жытняй "барадой", "міфапаэтычнае ўвасабленне ўрадлівасці, якое ў вачах славян-язычнікаў мела функцыі дабратворнага боства" (1993. С. 129—134; 1998. С. 130). Добрую этнамастацкую падборку фактаў наяўнасці ў ткацтве, вышыўцы названых язычніцкіх вобразаў ураджаю зрабіў М. Кацар у кнізе "Беларускі арнамент" (1996. С. 20—35).

Царква адзначае дзень памяці перанясення з Едэсы ў Канстанцінопаль Нерукатворнага Абраза (Убрус) Госпада Ісуса Хрыста (944 г.).

У рускіх "барада" больш ахрысціянілася. Аб гэтым сведчаць яе назвы ў розных рэгіёнах: борода Илье-пророку, Ильюшкина борода, Николе на бороду, борода Фролам-Лаврам, Христу на бородку (Коваль, 1995. С. 20). На Украіне перад жнівом "завівалі бараду Волосу" (Ярмолаў, 1901. С. 378).

Падобны абрад завяршэння жніва існаваў, напрыклад, у Францыі (Латарынгія, першая пал. XIX ст.). Жнец, які першы зразаў апошнія каласкі, аб'яўляўся "каралём букета", атрымліваў права звязаць апошні сноп і выбраць сабе "каралеўну". Пара ўсяляк ушаноўвалася. Адметным было тое, што апошнія каласкі поля былі каля ўтыкнутай у зямлю галінкі ("май"), якая ўпрыгожвалася стужкамі і кветкамі, і на вяршыні знаходзіўся прывязаны жывы певень, што станавіўся пасля рытуальнай стравай. У Нармандыі апошні сноп называлі "каралевай" і вадзілі вакол яго карагод. Сербы і чарнагорцы называлі яго божай барадой (божја, богова, богу барада). Югаслаўскія даследчыкі звязваюць апошні сноп з ахвярай язычніцкаму боству Дабогу, ці духу зерня, ці нейкаму невядомаму (КЗ, 1978. С. 204). Французскія даследчыкі таксама бачаць у жніўных абрадах адгалоскі язычніцтва, народныя ўяўленні звязваюць з раслінным духам, які захоўваецца ў апошнім снапе (с. 28—31). Народы Бельгіі і Нідэрландаў у апошнюю нядзелю ліпеня святкуюць Нядзелю жняца (Maaierszondag ag maaier — галандск. — касец, жнец). Яшчэ ў некаторых правінцыях можна ўбачыць дамы, упрыгожаныя па даўнім звычаі снапамі жыта і аўса, дзяўчаты ў час жніва носяць шыракаполыя капелюшы, а мужчыны-касары абвешаны кветкамі (с. 61).

Абрады з апошнім снапом і пеўнем вядомы многім народам, і іх дахрысціянская сутнасць не выклікае сумнення. Так, яшчэ ў XVI ст. у ніжненямецкіх землях апошні сноп сяляне прысвячалі язычніцкаму боству Водану, апекуну ўраджаю (с. 132). Шырокае развіццё атрымалі абрады і гульні з пеўнем, дух якога знаходзіцца ў апошніх каласах жыта. Іх зразаць у некаторых раёнах Германіі даручалі нявесце ці цнатлівай дзяўчыне. Жыту апошняга снапа таксама прыдавалася магічнае значэнне. Важным атрыбутам выступаў і вянок. У Польшчы праводзілася забава "Біць пеўня" (Kokota bić). Хлопцы з закрытымі вачыма стараліся разбіць палкамі гаршчок з пеўнем. Пераможца станавіўся "каралём". Даследчыкі звязваюць даўні абрад з "рэшткамі старажытнай крывавай ахвяры" (с. 179). У нашых суседзяў "дажынкі" складаліся таксама з чатырох асноўных частак: абраду з апошніх каласкоў, працэсіі з імі, уручэння снапка гаспадару і частавання. Падобныя жніўныя абрады, звязаныя з "барадой", апошнім снапом, існавалі і ў Грэцыі.

30/17. Міроны Ветрагоны. Позні летні прысвятак застаецца ў памяці дзякуючы прымаўцы: "Міроны Ветрагоны пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць" (Анічэнка, 1992).

Праваслаўны каляндар пачынае спіс кананізаваных святых на гэты дзень пакутнікам Міронам прэсвітэрам (250 г.).

31/18. Флор і Лаўр (Храл і Ягор'е) — "конскае свята", свята пастухоў. Даглядалі жывёлу. У некаторых раёнах пяклі аладкі, якія

называлі "капытамі" (Цэбрыкаў, 1862; Раманаў, 1912). "На Храла і Ягор'я ня ткуць і ня пашуць", — гаварылі беларусы на Смаленшчыне (Дабравольскі, 1894).

Хрысціянскі народ не толькі змяніў на свой манер імёны пакутнікаў Флора і Лаўра, якія жылі ў II стагоддзі ў Візантыі, затым у Ілірыі (Югаславіі), а і лічыць братоў-каменячосаў апекунамі коней.

Арабінавыя дзень і ноч (Варавіты дзень) — пара, калі бывае "сухая" навальніца або буран цэлую ноч (дзень). У гэты час нічога не рабілі і чакалі з трывогай грому, маланкі і дажджу, засцерагаліся ад няшчасця (Булгакоўскі, 1890). Як ужо згадвалася, "рабінаву ноч" яшчэ звязвалі са Спасаўкай або з нейкім днём ад Барысава да Прачыстай, ці ад Першай да Другой Прачыстай.

Алесь Лозка



МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ, СЦЭНАРЫІ І ДАДАТКОВЫ МАТЭРЫЯЛ



ДЗЕНЬ ІЛЬНУ

Алёна (Алёны, Ульяна) — 3 чэрвеня (21 мая па с. ст.). Іншыя дні, якія звязаны з ільном, указаны ў артыкуле "Адлюстраванне тэмы льну ў земляробчым календары".

Адлюстраванне тэмы льну ў земляробчым календары

Прадзенне і ткацтва, згодна з даследаваннямі археолагаў, было вядома нашым продкам у эпоху зарубінецкай культуры. Яно прайшло вялікі шлях развіцця, мае багатыя традыцыі і было настолькі распаўсюджаным на Беларусі, што ў беларускім народным календары займае адно з галоўных месц. Усе працэсы і з'явы, што датычаць узнятай тэмы, разгледзім у храналагічнай паслядоўнасці, традыцыйнай сістэме святаў, прысвяткаў, абрадаў, гульняў і г.д.

Беларускі народны каляндар асаблівую ўвагу надае сяўбе льну, аптымальнаму выбару тэрміну праз прыкметы і стан надвор'я. Толькі вясна дала знаць аб сабе па малапрыкметных з'явах, як смаленскія беларусы ўжо 15 лютага разважалі: "Як на Стрэчанне рана ўсходзіць сонца, то будзе ранні лён"[1]. Там, дзе праводзілі Масленіцу, з гэтым святам звязваліся надзеі на будучы ўраджай. "Валачэнне" моладзі па

[1] Усе даты тут падаюцца па новым стылі. Прыклады і крыніцы ў асноўным узяты з кнігі А. Лозкі "Беларускі народны каляндар". Мн., 1993.

вёсцы з дзяўчынай "масленіцай" — на "валакністы", "добры" лён, нашэнне хустак з доўгімі махрамі — на доўгія сцябліны. "Валачэнне ўздоўж вёскі" адбывалася і на Валосся (Крывы чацвер) — чацвер на Масленым тыдні. "Каб лён рос", на Саракі (22 сакавіка) трэба было гушкацца на арэлях. Калі на Феафана (25 сакавіка) дзень пачынаўся з туману, то варта чакаць добрага ўраджаю льну і канапель.

Найбольш спрыяльнымі днямі для пасеву лічыліся на Палессі пятніца і субота, бо панядзелак — цяжкі дзень, у аўторак — будзе дрэнны ўсход, у сераду — злы дзень, валакно будзе жорсткім, у чацвер — будуць нападаць чэрві. "Казаў авёс: кідай мяне у гразь, то буду князь", а для льну патрэбна было пачакаць, каб трохі высахла глеба, але не занадта, калі яшчэ не зацвіла сліва, найчасцей перад Пасхай і найлепш у поўню. Арыентацыя на нябёсы (месяц таксама, каб не было шмат воблакаў) — прыкмета старажытнасці, калі чалавек карыстаўся месяцавым календаром.

Першыя ўпамінанні ў календары аб сеянні льну на поўдні адносяцца да Аляксея Цёплага (30 сакавіка). Перад сном дзяўчаты варажылі пра будучае замуства: "Сьвяты Олэксію, я на тобі лён сію. Дай, Божэ, знаты, з кім буду ў пары стояты" (Пінскі р-н). Падобны абрад праводзіўся і ў канцы красавіка, у Андрыянаву, ці Андрэеву, ноч. У Слуцкім павеце дзяўчаты чаравалі на канапляным семі, якое пабывала ў царкве. Прасілі святога заступніка, каб прысніўся любы: "Святы Андрэю, канапелькі сею..." У залежнасці ад стану надвор'я тэрміны пасеву могуць быць значна пазнейшымі, ды яшчэ калі ўлічыць, што ў некаторых раёнах стараліся сабраць два ўраджаі. Вось якія дні фіксуе народны каляндар:

8 траўня ("Сей лён на Станіслава — вырасце як лава");

22 траўня ("Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена");

31 траўня ("Лён сей позні на шэсць дзеў", "Канапелька Матруна ў зямлю махнула");

3 чэрвеня — дзень ільну. Уладзімір Дабравольскі ў Бельскім павеце занатаваў наступныя звесткі: "Лён хто пасеіць на дзісятай ад Ільлі нядзелі — са льном, а на восьмай — у васьму[1], на сёмай — із поля вон".

Сяўба таксама суправаджалася пэўнымі абрадамі, з ёй звязана шмат прыкмет. Так, каб не расло пустазелле, трэба было семя несці ў чыстым і белым абрусе і па дарозе ў поле сустрэць мужчыну, а калі жанчыну, ды яшчэ цяжарную, то лён абавязкова зарасце і яго "абкруціць павітуха" ("бярозка", "чарэўка").

Пасля льну браліся за канопліі. Іншы раз іх сеялі яшчэ да Міколы (22 траўня), а іншы — у Зялёную суботу, як у Магілёўскай губерні (пярэдадзень Сёмухі, 49-ы дзень ад Пасхі), на Анапрэя (25 чэрвеня) — "Анапрэй, сей канапель" (Свіслацкі р-н).

Наступны этап звязаны з назіраннем за ростам і доглядам. За гэта "адказвалі" спецыяльныя заступнікі ў чэрвені: "Юстын цягне ўверх каноплі, Харытон — лён" (14), "На Тадора раса — канапель паласа" (21), "Росы з Хвёдара — лён урадзіць" (21), "Яны правяць ільны"

[1] Атрымае восьмую частку.

(24), "Святэй Анопры, радзі каноплі" (25); у ліпені: "На Мар'ю росна — лён будзе шэры, неўмалотны" (4), на Гаўрылея засцерагаліся граду, каб не пабіў каноплі (26).

На Бабіна свята (трэцяя нядзеля ад Пасхі, тыдзень Жонак Міраносіц) жанчыны ў полі рабілі абрадавы абед і прыгаворвалі: "Дай, Божа, каб наш лён урадзіўся кужалем".

Асаблівы сэнс набывала праполка льну[1], калі адбываліся пэўныя рытуалы, даўнія таямнічыя традыцыі. На Брэстчыне праполатую траву захоўвалі да Івана і спальвалі на купальскім вогнішчы са словамі: "Чарэўка ў моры, а мой лён угору!" У Лельчыцкім раёне абавязкова на Русалчыны розыгры (апошні дзень Русальнага тыдня) і Дзевятнік (чацвёрты на дзевятым тыдні ад Пасхі) патрэбна было палоць, хаця існавалі забароны на палявыя работы ("У лён не ўлезе русалка, бо свечоны. А просо не трэба палоць"; на Дзевятнік засцерагаліся ад грому).

Вырыванне і наступная апрацоўка льну і канапель таксама адлюстравана ў календары, вуснай народнай творчасці. Вось на Макавея (14 жніўня) дзяўчаты на ложку варожаць з каноплямі: "Макавею, Макавею, я на цябе канапелькі сею. Скажы мне, Макавею, дзе мая пара, каб я з ім у гэтую ноч канапельку брала" (Брагінскі р-н). У валачобных песнях знаходзім: "Святое Узвіжанне з поля збіраецца ... бульбу капаець ... сцеліць лянок" (27 верасня). На Жалезны тыдзень (з 8 кастрычніка) былі і пэўныя забароны: "Пянькі ні мачы — крэпка будзіць" (Смаленская губ.).

Вусна-паэтычная народная творчасць у розных жанрах, асабліва ў казках і песнях, паказвае этапы апрацоўкі льну. Існуе цэлы цыкл ільняных песень.

Пасеялі дзеўкі лён,
Эй, люлю, дзеўкі, лён.
Пасеяўшы, палолі[2],
Белыя ручкі калолі...
Дзеўкі лянок сабралі,
Белы кужаль паслалі,
А паслаўшы, памялі.
Дзеўкі лянок папралі,
Плацейка саткалі.

(в. Баркалабава
Быхаўскага р-на)

Гэтая ж тэматыка паўтараецца і ў валачобных песнях.

... Сей льну многа, мнагусенька, гэй, лолам!
Сей льну многа, мнагусенька, гэй, лолам!
Палі чыста, чысцюсенька...[3]
І рві хутка, хуцюсенька,
І сцялі роўна, раўнюсенька.

---

[1] Каноплі не палолі, яны сваім ростам "забівалі" пустазелле.
[2] Апошняе слова кожнага радка паўтараецца са словамі "Эй, люлю".
[3] Кожны радок паўтараецца два разы са словамі "Гэй, лолам!".

І тры чыста, чысцюсенька,
Прадзі ценька, цянюсенька.
І снуй многа, мнагусенька.
І тчы гладка, гладзюсенька,
І бялі бела, бялюсенька.
Рэж падаркі даўгусенька...

(Слонімскі пав.)

Тут варта спыніцца на аллюстраванні ў календары работ, звязаных з падрыхтоўкай яшчэ адной сыравіны для прадзення — воўны авечак. Звычайна іх стрыглі двойчы на год. Найбольш з гэтай свойскай жывёлай фігуруюць у календары іх некалькі апекуноў: Мікола (22 траўня), Базыль (15 жніўня), Настасей (11 лістапада). Што пра іх гавораць прымаўкі: "Да Міколы не сей грэчкі ды не стрыжы авечкі", "Да Міколы не сей грэчкі, а да Ушэсця не стрыжы авечкі", "Базыль авечкам воўну дае", "Святы Настасей-пракрасны, саблюдзі авец нашых". Другая стрыжка, з якой атрымлівалася найбольш якасная сыравіна, адбывалася да Сымона (14 верасня), "каб ён не ўкраў сабе на рукавіцы", як гаварылі на Падзвінні, ці да Настасея, як лічылі на Смаленшчыне.

У восеньскай песні пяецца:

Да бараначка чорненькі, чорненькі,
На ім воўна сучыцца, сучыцца —
Нам гарэлачкі хочацца, хочацца.
Мы бараначку стрыч будзем, стрыч будзем...

(Дзісенскі пав.)

Адзінага дня пачатку попрадак на ўсёй Беларусі не было. Вось некаторыя з іх: Сымон (14 верасня), Пакроў (14 кастрычніка). У Лельчыцкім раёне гавораць: "Од Покровы до Міхайла тры почынкі навіхайла, а од Міхайла до Роздва толькі два навезла". Засідкі ("Бабы ўзяліся за верацяно"), ці Артошка (12 лістапада), пра яго на Смаленшчыне зафіксавана: "Святы Артошка, напрадзі пачатак з лукошка, а клубок з карабок, а мальчык з пальчык, напрадзі пачатак з пальчык".

Надзвычай цікавым і старажытным уяўляецца абрад "Жаніцьба Коміна" (у некаторых раёнах — пасьвета, лучніка), які праводзіўся на Сымона. Гэта пара, калі многія работы, у сувязі з памяншэннем светлавога дня, пераносяцца ў хату. Узнікае неабходнасць у прымяненні штучнага асвятлення — запальвання першы раз лучыны. У такім выпадку старажытны чалавек звяртаўся да агню-багача, хатняга духа-продка, які, як меркавалася, жыве на печы ці пад ёю, у коміне.

Абрад найбольш быў вядомы і захаваўся ў памяці пажылых людзей у Цэнтральным Палессі (Пінск—Столін—Тураў). Да агню звярталіся як да продка ("дзеда"), які быў заступнікам сям'і, зычліўцам дабрабыту. Па сутнасці, "жанілі" Коміна з Працаю. А галоўнай працаю доўгімі зімовымі вечарамі было прадзенне і ткацтва.

Сьвеці, нашэ Сьвеціло,
Шоб огню нам не тушыло,
Шоб добрэ було прасьці, ткаці
І сеець[1] цепло у хаці.

(в. Радзілавічы Лельчыцкага р-на)

У пару Бабінага лета (з Калінавіка да Цудаў, Багача ці Пакровы) церлі і трапалі лён і каноплі.

У гадавым цыкле былі адзначаны і дні, на якія не пралі, але рыхтаваліся да прадзення. Вось, напрыклад, 20 лютага пасля заканчэння святкавання Грамніц, Аддання Стрэчання, чысцілі і мылі верацёны, калаўроты, каб лён рос чысты. Выконваўся абрад скакання цераз калодку, пастаўленую сярод хаты. Лічылася, хто вышэй падскочыць, у таго вырасце вышэйшы лён; забаўляліся і частаваліся. Тое ж рабілася і ў першую сераду Вялікага посту.

Пралі кожны дзень, акрамя пятніцы, нядзелі і святаў (прысвяткаў). Прычым пералік святочных дзён не заўсёды супадаў ва ўсіх рэгіёнах. У некаторых той ці іншы прысвятак ігнараваўся, не прызнаваўся. Вось іх шэраг, напрыклад, у Лельчыцкім раёне (гэта адносіцца і да ткацтва): у кастрычніку — Іван Пакроўны (9), Пакровы (14); у лістападзе — Змітравы Дзяды, Зміцер (8), Параскі (10), Кузьма-Дзям'ян (14), Міхайла (21), Піліп (27); у снежні — Увядзенне (4), Матрыхваны (6), Юр'е (9), Андросы (13), Варвары (17), Савы (18), Мікола (19), Ганны (22).

Магчыма, у хрысціянскі перыяд багіня Мокаш, заступніца прадзення і ткацтва, змянілася на вялікапакутніцу Параскеву Пятніцу, якая асацыруецца з кожнай пятніцай. У народзе захаваўся дзень Параскевы Пяценкі (Параскоўя Пятніца, Параскімка, Параскі Асеннія), што адзначаецца 10 лістапада (у каталікаў 28 кастрычніка) як дзень забароны прадзення і ткацтва. Аб гэтым існавалі павер'і: хто будзе прасці, то з-пад печкі вылезе Пятніца і пакарае (Смаленшчына); яна ў выглядзе старой бабулі ходзіць па вёсках і строга глядзіць, каб ніхто не праў кудзелю ў пятніцу (Гомельшчына).

Важны этап у прадзенні наступае ў Піліпаўку — шасцітыднёвы перадкалядны пост — Піліпаўскі пост, які пачынаецца 28 лістапада і заканчваецца 6 студзеня (у праваслаўных). Пра сам прысвятак Піліп (27 лістапада) нездарма гавораць, што ён "дзяцей адзявае". У гэты дзень рыхтаваліся да піліпаўскіх вячорак ("попрадак", "засідак"), калі і ткалі, то не сабе, а талакою дапамагалі бяднейшым. У адной веснавой песні распавядаецца пра лянівую праллю:

А мая маці не прала —
Піліпову ночку проспала,
Да пуд лёд мучкі таскала.
— Плывець, плывець мучкі волокном,
А назад полотном.

(Лельчыцкі р-н)

---

[1] Сеець — сядзець.

У Піліпаўку часта дзяўчаты збіраліся прасці ў адной хаце, звычайна выбіралі месца ў беднай сям'і і за гэта ёй чым-небудзь плацілі. За працаю спявалі песні. У некаторых з іх малююцца ўсе этапы прыгатавання палатна.

Пойдзем, дзевачкі, у начлежачкі.
Возьмем, дзевачкі, паўтары мычачкі,
Напрадзём, дзевачкі, паўтары цэвачкі,
Аснуём, дзевачкі, паўтары губачкі.
Пойдзем, дзевачкі, на сяло бёрда шукаць.
Усё сяло абышлі, бёрда не знайшлі.
Будзем, дзевачкі, у прасла кросны снаваць,
Будзем, дзевачкі, у тын кросны ткаць.

(Мсціслаўскі р-н)

У іншых апавядаецца аб майстэрстве і нядбайнасці пралляў і ткалляў:

...А наша Насцінка — ды тонка пралля,
Ды тонка пралля, ды звонка ткалля:
Увадзіла ніткі пароўна калена,
Пароўна калена, таўсцей за палена...

(Вецслабада Істрэнскай вол. Лудзенскага пав.)

Асвяціў месяц і зямлю, і ваду,
І мяне, маладу, сярод горада.
А я, малада, усё кавёры ткала,
Круп золата паразбірала...

(Копысь Горацкага пав. Магілёўскай губ.)

Андрэй, які намі прыгадваўся ў сувязі з сеяннем ільну і канапель, узгадваецца і пазней у абрадах падчас прадзення. Напрыклад, на Андрэя, ці Андроса (13 снежня), дзяўчаты зноў варожаць на канапляным і льняным семі. Пра вольныя ад прадзення дні ў народзе гавораць: "Каб ты Саваў не савіла, Андросаў не андросіла[1], а кудзелю кудосіла, то гола б не лежала" (Лельчыцкі р-н).

Маюць свае абрады і іншыя дні, вольныя ад прадзення. У Ельскім раёне на Матрыхваны (6 снежня) дзяўчаты расчэсвалі свае косы малою грабёнкаю, што "мічуць", ложаць яе пад падушку са словамі: "Здайса ў сьне, з кім я стану ў пары на весьне". А ў Брэсцкім раёне пра Варвару (17 снежня) ведаюць, што яна "верацёнамі замучана". Лічыцца, калі прасці ў гэты дзень пасля захаду сонца, "то Варвара прынясе сорок верэцён, шоб напрала за адзін вечар". Існуе паданне, што адна пралля напрала па дзве ніткі на кожнае верацяно і выкінула іх на двор у ахвяру міфічнай заступніцы. У Шумілінскім раёне так растлумачваюць прычыну забароны прадзення на Савы (18 снежня):

[1] "Савіць" і "андросіць" — г.зн. святкаваць Савы і Андросы.

“Не трэба круціць, каб добра было скату, бо скруціцца ягнё ў каляса”.

Прадзенне працягвалася доўга: усю зіму і прыблізна палову восені і вясны. У веснавым календары вылучаюцца наступныя з’явы, звязаныя з падрыхтоўкай нітак для ткацтва. Вось, напрыклад, на Васіля Капальніка (13 сакавіка) нельга было прасці, бо можна “адслініць замураваную зіму” і надыдуць халады; на Аўдоццю Вясноўку (14 сакавіка) не пралі, не снавалі і не выконвалі іншыя работы, бо гэты дзень святочны, ды яшчэ лічыўся “нешчаслівым”. Толькі лянівым праллям казалі на Аўдоццю: “Прадзі, гульцяй, бо будуць голыя бокі, як не прасьцімеш” (Лельчыцкі р-н).

Цікавы звычай зафіксаваны на Мсціслаўшчыне, што праводзіўся менавіта ў Чысты чацвер, дзень на Вербным тыдні, які ў розныя гады можа прыпадаць як на сакавік, так і на канец красавіка. Звычайна ў гэты перадвелікодны дзень не пралі, але існаваў даўні звычай раніцай прасці леваю рукою так званыя “чацвярговыя ніткі”. Потым сатканым з іх палатном перавязвалі раны.

Звернута ўвага ў календары і на снаванне як адзін з працэсаў падрыхтоўкі напрадзенага да ткацтва. Заўважана, што лепей снаваць кросны “пад поўню”, пасля Каляд і пазней. Менавіта на Прывадохрышча, ці Прыцек (20 студзеня), можна было прасці і снаваць. Пасля калядных ігрышчаў гаварылі: “Тык Прытык кудзелю прывалык”. У Свіслацкім раёне ходзіць павер’е, што паміж каталіцкімі (2 лютага) і праваслаўнымі (15 лютага) Грамніцамі не трэба снаваць кросны, бо “ваўкі будуць снаваць каля будынкаў”. У Благавеснік (6 красавіка) на Віцебшчыне нельга было снаваць, бо можна было “заснаваць дождж” на ўсё лета. Непрыдатнымі для гэтай справы лічыліся і Міжблагавешчыны, дні паміж каталіцкім (25 сакавіка) і праваслаўным (7 красавіка) Благавешчаннем. Як заўважыў этнограф П. Дземідовіч у мінулым стагоддзі, беларус стараўся нічога ў гэты небяспечны перыяд не даваць у доўг, асабліва бёрды для запраўкі кроснаў. У некаторых раёнах небяспечным перыядам быў і Пахвальны тыдзень, які пачынаўся адразу перад Вербніцай. Так, у Мазырскім раёне гавораць: “Нельга беліць хату, снаваць кросны: пахвалісса зрабіць — не пахвалісса знасіць”.

Пасля фарбавання пражы, снавання яе і запраўкі кроснаў пачыналася, нарэшце, ткацтва. Сядаць за кросны маглі пасля Каляд, у першы дзень Вялікага посту і пазней і шчыравалі да самай Пасхі. Не ткалі ў святочныя дні, пятніцу і нядзелю. У Лельчыцкім раёне “бояліся грымаць кроснамі, шоб нем грымеў гром”. Там жа на саму Вербніцу (нядзеля перад Пасхай) ткалі, а вось на Вербны, ці Белы, тыдзень — не, рыхтаваліся да вялікага свята. Выключэннем мог быць Чысты чацвер, на які ткалі магічнае палатно для перавязкі ран. З громам звязана забарона на тканне і ў асенне-зімовае свята Міхайла (21 лістапада) у Калінкавіцкім раёне: “Міхайла мы празнуем, каб гром не біў нас. Не рубаем ні тапаром, ні нажом, ні красён не тком, штоб не абідзіўся Міхал”.

Лічыцца, што адны кросны трэба выткаць да Міхайла, другія — у Піліпаўку, трэція — у Мясаед, а чацвёртыя — у Вялікі пост.

Такім чынам, у Беларусі склаўся сталы каляндар працы і адпачынкаў, звязаны з падрыхтоўкай сыравіны (сеянне і догляд за льном і каноплямі, збор ураджаю і яго апрацоўка, у тым ліку і воўны, прадзенне), фарбаваннем, снаваннем, устаноўкай кроснаў і ткацтвам. Прычым усе гэтыя працэсы багата адлюстраваны і замацаваны ў прыказках і прымаўках, прыкметах, абрадах, гульнях і іншых жанрах вуснай народнай творчасці, што з'яўляецца цэласнай і прадуманай сістэмай гадавога цыкла.

Алесь Лозка

ТКАЦТВА

Адным з багатых і старажытных промыслаў беларусаў з'яўляецца народнае ткацтва. На працягу стагоддзяў яно развівалася, удасканальвалася і перадавалася з пакалення ў пакаленне. У народным ткацтве знайшла сваё адлюстраванне векавая гісторыя беларускага народа, яго майстэрства, мастацкі густ.

Традыцыйнае ткацтва — складаны і шматгранны працэс.

Сыравіна — лён, авечая воўна, радзей каноплі. Для апрацоўкі льну існавала шмат спосабаў і прылад.



Мал. 1. Пранік *(а)*, нажы *(б)*, церніцы *(в, г, д, е, ж, з)*

Пранік (пральнік, прач, валёк) — прылада для абівання льну (мал. 1, *а*).

Нажы (драчок) — прылада для абрывання льняных галовак (мал. 1, *б*). Нагадваюць матыку з зуб'ем, толькі ў нажах зуб'е было вострым з абодвух бакоў. Былі вядомы ў асноўным на поўначы Беларусі.

Церніца (мялка, мяліца, мячка). На Беларусі вядомы чатыры тыпы церніц: нахільная, зробленая са ствала дрэва, двухрэбравая, аднарэбравая і гарызантальная, збітая з дошак (мал. 1, *в, г, д, е, ж, з*).

Трапло (трапачка, трапушка, трэпачка) — прылада для трапання валакна (мал. 2, *а, б*). Вядомы два асноўныя тыпы трапла: лапатападобнай формы (паўночныя і паўночна-ўсходнія раёны) і мечападобнай (на астатняй тэрыторыі Беларусі).

Грэбень (друка) — прылада для часання валакна (мал. 2, *в, г, д, е*). На поўдні і на ўсходзе Беларусі вядомы драўляны грэбень лапатападобнай формы з выразаным зуб'ем, на поўначы (Віцебшчына, паўночныя раёны Міншчыны і Магілёўшчыны) —



Мал. 2. Трапло *(а, б)*, грэбні *(в, г, д, е)*



Мал. 3. Прасніцы *(а, б)*, верацяно *(в)*, калаўрот *(г)*

грэбень з набітым драўляным зуб'ем. На ўсёй тэрыторыі Беларусі вядомы грэбень з металічным зуб'ем.

Шчотка (шчэць). Выраблялася са свінога шчаціння і выкарыстоўвалася для часання кужалю. Пашырана на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Прасніца (прасліца, пралка, потась) — прылада, на якой умацоўвалася кудзеля (мал. 3, *а, б*). На ўсёй тэрыторыі Беларусі пашырана прасніца лапатападобнай формы, на паўднёвым усходзе сустракаецца вёслападобнай формы.

Верацяно — прылада для скручвання ніткі ў працэсе прадзення (мал. 3, *в*).

Калаўрот (самапрадка, самапраха) — прылада для прадзення (мал. 3, *г*). Вядомы два тыпы: калаўрот-стаяк, у якім кола размешчана вертыкальна, і калаўрот-ляжак з колам, размешчаным гарызантальна.

Матавіла (вітушка, баран і інш.). Для звівання пражы ў маткі слу-



Мал. 4. Матавілы



Мал. 5. Сноўніцы

жылі два тыпы матавіл (мал. 4). Найбольш простым, якое захавалася ў асноўным на поўдні Беларусі, з'яўлялася ручное матавіла (палка з натуральнай развілкай на адным і папярочынай на другім канцы). Больш удасканаленае матавіла — крыжавіна з брускамі на канцах, умацаваная на падстаўцы. Сустракаліся яны часцей у заходніх раёнах Беларусі. На ўсёй тэрыторыі вядома матавіла для размотвання пражы з маткоў (размотыч). Даволі пашыраным з'яўлялася матавіла "баран", якое складалася з дзвюх крыжавін, злучаных тонкімі брускамі. З яго снавалі кросны.

Сноўніца (снойка, снойля, снавальня) — прылада для снавання кроснаў (мал. 5). Пашырана ў асноўным на поўначы Беларусі.

Кросны (станок, стацівы і інш.). Вядома некалькі тыпаў: кросны "на сохах" (найбольш прымітыўныя і старажытныя), рамныя і варштат (мал. 6). Кросны "на сохах" сустракаліся на поўдні Беларусі. Варштат больш характэрны для заходніх раёнаў. Рамныя кросны былі пашыраны на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Састаўныя часткі кроснаў класіфікуюцца па трох групах: часткі, якія складалі аснову ткацкага стана (ставы), часткі, якія вызначалі ход тканння (навоі, набілкі з бёрдам, ніты, панажы); неабходнай прыналежнасцю ў працэсе тканння з'яўляліся цэўкі, сукала, чоўнік, пругі.

Ставы (станіны, ставіціны, стацівы) — два гарызантальна ўмацаваныя брускі даўжынёю прыкладна 1,5—1,7 м, у дыяметры 25—30 см.

Навой (навойка, вал, калода, вараціла). Вядомы два навоі: пражны, на які накручвалася аснова, і палатняны — для накручвання гатовага палатна.

Ніты (нічальніцы, нічанькі, цапкі) — прыстасаванне для ўтварэння зева.

Чапёлкі (кацёлкі, калясцы, пакацелкі) служылі для падвешвання нітоў.

Панажы (паножкі, падножкі). Пры дапамозе іх паднімаліся і апускаліся ніты.

Бёрда, набілкі (набіліцы) служылі для прыбівання ўтка.

Чоўнік (чаўнок, чаўнык) — прылада для прапускання ўточных нітак, накручаных на цэўку (мал. 7, *а, б*).

Цэўка служыла для накручвання пражы для ўтка (мал. 7, *в*).

Пругі (распоркі). Служылі для раўнамернага нацягвання палатна ў час тканння.

Сукала (сукайла) — прылада для накручвання пражы на цэўку (мал. 7, *г*).

У залежнасці ад функцыянальнага прызначэння традыцыйныя тканіны падзяляюцца на тканіны паўсядзённага карыстання і дэкаратыўныя.



Мал. 6. Кросны



Мал. 7. Чоўнікі *(а, б)*, цэўка *(в)*, сукала *(г)*

Ручнік. У паўсядзённым карыстанні ўжываліся ручнікі, якія не вылучаліся багаццем упрыгожанняў і тэхнікай выканання. Ткалі іх звычайна ў чатыры ніты з узорам "у рады" і "ў ёлачку". Ручнікі, якія ўжываліся для выцірання твару і рук, мелі назву "ўцірка", "уцірач", "уціраннік", а кухонныя ці пасудныя ручнікі — "трапкач".

Дэкаратыўныя ручнікі разнастайныя як па тэхніцы выканання, так і па арнаментыцы. Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца ручнікі, якія выконваліся пры дапамозе бранай тэхнікі. Узор на іх размяшчаўся ў выглядзе папярочных паскаў. На паўночным усходзе Беларусі затыкаліся толькі канцы ручніка (двума-трыма паскамі). На поўдні і паўднёвым усходзе пашыраны ручнікі, узор якіх займаў 20—60 см і больш. На Палессі вядомы так званыя

паўсёмістыя ручнікі. Для іх характэрна размяшчэнне ўзору па ўсім полі ручніка, дзе ўзорныя паскі чаргуюцца з гладказатканымі.

У цэнтральных раёнах вырабляліся камбінаваныя ручнікі. Канцы затыкаліся пры дапамозе бранай тэхнікі, а сярэдзіна — спосабам шматнітовага тканння. На захадзе Беларусі сустракаюцца ручнікі, у якіх узор размяшчаўся па даўжыні.

Апрача тканых на ўсёй тэрыторыі Беларусі вядомы ручнікі вышываныя з характэрным для іх раслінным арнаментам. Як тканыя, так і вышываныя ручнікі ўпрыгожваліся карункамі, зрэдку — махрамі.

Абрус (скацерка, настольнік, сурвэта). Складаўся з дзвюх полак, злучаных ажурным швом — прошвай. Святочныя абрусы ткаліся з тонкай кужэльнай пражы. Найбольш пашыраны спосаб вырабу — васьмінітовы. Узор геаметрычны (шашкі, балонкі, лішковыя абрусы). На паўночным захадзе вядомы васьмінітовыя абрусы з "перавяззю". Для іх характэрна двухколернае вырашэнне — белая аснова і каляровы (блакітны, жоўты і інш.) уток. Ён як бы насцілаўся па аснове, утвараючы чатырохпялёсткавыя разеткі. У XX ст. атрымалі пашырэнне абрусы, вытканыя на вялікай колькасці нітоў (12, 16 і больш).

Усе абрусы ўпрыгожваліся карункамі або махрамі. Вузкія канцы затыкаліся чырвонымі паскамі.

Абрусы, якія засцілаліся на стол кожны дзень, ткаліся з больш грубай пражы нескладаным чатырохнітовым спосабам.

Посцілка (просцілка, коўдра, радзюжка). Служыла для засцілання ложка. Паўсядзённыя посцілкі (радзюжкі) ткаліся з ільняной пражы. Святочныя — паўсуконныя або суконныя. Яны вылучаюцца разнастайнасцю тэхнічных прыёмаў, арнаментыкай, а таксама каляровай гамай. У канцы XIX ст. найбольш пашыранымі былі посцілкі ў клеткі (у шклянкі, у плахі), вытканыя чатырохнітовым спосабам. Клеткі ўтвараліся каляровай асновай. У канцы XIX—пачатку XX ст. шырокае распаўсюджанне мелі чатырохнітовыя посцілкі, у якіх узор (клеткі, кругі) ствараўся паліхромным утком, які насцілаўся паверх асновы. Вялікія клеткі злучаліся маленькімі клетачкамі (драбнічкі, стоўбчыкі). Для іх характэрны такія назвы, як "агурочкі", "пярэкулы", "мінёны". Амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі, асабліва на паўночным захадзе, была пашырана назва "дымка", "дым", "самадымка". У паўночна-заходніх раёнах бытавалі чатырохнітовыя посцілкі ў папярочныя паскі, мастацкі эфект дасягаўся паліхромным утком. Ткаліся яны на вузкім стане суцэльнымі (несшыванымі), што абумоўлівалася спосабам накідкі асновы ў ніты і ходам па панажах. У XX ст. такія посцілкі пачалі ткаць на шырокіх кроснах.

На поўдні Беларусі ткалі так званыя выцяганыя посцілкі. Узор у іх ствараўся каляровым утком, які выцягваўся петлямі пры дапамозе спецыяльнага пруточка. Для іх характэрны як геаметрычны, так і раслінны арнамент.

Усюды на Беларусі бытавалі перабіраныя посцілкі (наборкі, перабіранкі і інш.). Пры вырабе іх выкарыстоўваўся двайны ўток — фонавы і ўзорны. Узор рэльефны, двухбаковы. На адваротным баку атрымліваўся яго негатыўны малюнак.

Багаццем узораў і каляровай гамай характарызуюцца посцілкі, вытканыя пры дапамозе тэхнікі закладання. Ткуцца яны паліхромным утком, які закладваецца не па ўсёй шырыні асновы, а толькі ў месцах узору. Посцілкі-закладанкі найбольш пашыраны на поўдні Беларусі.

Сярод дэкаратыўных тканін вылучаюцца двухасноўныя дываны (дываны суканыя). Для іх характэрна наяўнасць дзвюх рознакаляровых асноў (калі ў адной пары асновы ідзе адна нітка, напрыклад чырвоная, а другая зялёная) і адсутнасць фонавага ўтка. Пашыраны такія дываны на захадзе Беларусі.

Навалачка (наўлечка). Шылася з простага ці ўзорнага матэрыялу. Вядомы два тыпы навалачак: прамавугольныя, або, як іх прынята называць, доўгія, і квадратныя або круглыя. Доўгія навалачкі, як правіла, не ўпрыгожваліся. Круглыя ж упрыгожваліся тканым або вышываным узорам, а таксама вязанымі карункамі.

Дзяруга шылася ў выглядзе вялікага мяшка і служыла замест коўдры, таму ткалася шчыльнай, спосабам чатырохнітовага тканння "ў рады". Сустракалася на ўсходзе Беларусі.

Полаг развешваўся над палком або ложкам. Шыўся з трох-чатырох полак. З бакоў прышываліся "крылы". Падвешваўся полаг за петлі, прымацаваныя зверху.

(Г. Курыловіч.
Помнікі этнаграфіі, 1981)

ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І

Калі хто ўбачыў жывёлу на ворыве хвастом да сябе, той можа чакаць добрага ўраджаю льну, калі галавою — лён уродзіць кароткі.

Наадварот, хто ўбачыць першы раз аратага, які стаіць, той не будзе мець добрага льну.

Ник., с. 104

У якую пару дня на Грамніцы пакажацца з-за хмар сонца, пасеяны ў такую пару вясны лён дасць найбольш надзейны ўраджай. Сеюць яго то адразу з надыходам вясны, то пасярод яе ці на самым схіле, у залежнасці ад таго, ці сонца абліло сваімі промнямі зямлю з раніцы, каля палудня ці пад вечар. Пахмурная Грамніца варожыць на поўны неўраджай ільну, і наадварот, калі ўвесь гэты дзень сонечны і марозны, то пасеяны ў хоць якую пару абавязкова ўродзіць.

Fed., s. 372

Лён сеюць у Віцебскай губерні на Канстанціна і Алёну (3 чэрвеня). Сеючы, качаюцца голымі па зямлі, на якой ён сцяліцца будзе, — каб вырас доўгі і валакністы.

Шейн, III, с. 230

Лён вясною трэба сеяць у той дзень, калі ўбачыш ястрабамышатніка (Веліжскі пав.).

Романов, 8, с. 298

З той хвіліны, як насенны лён засыпаны ў мяхі, і да выпраўлення на поле ніхто не павінен садзіцца, бо лён, калі вырасце, асядзе.

Ник., с. 109

Прызначанае для сяўбы льняное насенне лепш несці, чым везці на ніву, прычым трэба выбраць найдаўжэйшы шлях: тады і лён уродзіць доўгі. Калі ж неабходнасць прымусіць ільняное насенне везці, то мяшок з зернем трэба пакласці не на воз, а на спіну каня.

Ник., с. 110

Як і каноплі, лён сеюць з фартуха, але ён павінен быць белы і сатканы з добрага льну, тады атрымаюцца белыя валокны.

Ник., с. 110

(Васілевіч, 1996. С. 300—301)

ГУЛЬНІ

Лянок, або Лён

Гулялі хлопчыкі і дзяўчынкі 5—9 гадоў. Лік удзельнікаў гульні 10—20 чалавек. Стаўшы ў круг, яны чарцілі на зямлі невялікія кружкі — "гнёзды", якіх павінна быць на 1—2 менш, чым усіх удзельнікаў. Затым дзеці браліся за рукі, утвараючы карагод, і, пераступаючы то ўправа, то ўлева па крузе, спявалі:

Мы зярняткі веялі, веялі,
Мы зярняткі сеялі, сеялі...
Садзі лянок!

На апошнім слове карагод рассыпаўся і дзеці станавіліся па адным у "гнёздах". Тыя, каму "гнязда" не хапіла, выбывалі з гульні. Ім вызвалялі чые-небудзь "гнёзды", у якіх яны павінны былі знаходзіцца да канца гульні. Астатнія ўдзельнікі зноў утваралі карагод, і гульня працягвалася да таго часу, пакуль у карагодзе не заставалася менш за 4 чалавекі.

(Вількін, 1970. Зап. на хутары Завоссе Навагрудскага р-на)

Лянок

Колькасць гуляючых неабмежаваная, але не меншая чым 8—10 чалавек.

Перад пачаткам гульні ўдзельнікі выбіраюць вядучага. Затым на зямлі чэрцяць кружкі — "гнёзды", якіх павінна быць на 2—3 менш, чым гуляючых. Пасля гэтага ўсе становяцца ў агульны круг і бяруцца за рукі. Вядучы ходзіць па крузе і робіць розныя рухі: прысядае,

падскоквае і г.д. Гуляючыя, не разнімаючы рук, павінны паўтараць іх. Нечакана вядучы камандуе: "Садзі лянок!" Кожны гулец імкнецца заняць "гняздо". Той, хто не зойме "гнязда", лічыцца "пасаджаным", і яго "садзяць" у "гняздо", дзе ён знаходзіцца да канца гульні. Затым гульня паўтараецца.

Перамагае той, хто зойме апошняе свабоднае "гняздо".

(Грудзінскі, 1993. Зап. у в. Дулебы Бярэзінскага р-на)

КАРАГОДЫ, ТАНЦЫ

Лянок

"Лянок" — старажытны карагод, у якім узнаўляўся, імітаваўся працэс вырошчвання і апрацоўкі льну. Пад рознымі назвамі і ў розных варыянтах распаўсюджаны па ўсёй Беларусі. У Магілёўскай вобласці, як сведчыць М. Чуркін, выконвалі наступную песню:



Пасеялі дзеўкі лён,
дзеўкі лён[1],
Пасеялі дзеўкі лён.
Пасеяўшы, палолі,
палолі,
Пасеяўшы, палолі.
Белы ручкі калолі,
калолі,
Белы ручкі калолі.

[1] Першыя два радкі паўтараюцца па два разы кожны.

Унадзіўся сівы конь,
сівы конь,
Унадзіўся сівы конь.
Пацёр, памяў дзеўкін лён,
дзеўкін лён.
Пацёр, памяў дзеўкін лён...

У Мінскай вобласці дзяўчаты і хлопцы выстройваліся ў два рады тварам адзін да аднаго. Спачатку юнакі ў рытме песні імітавалі пасеў ільну. Потым дзяўчаты ілюстравалі, як лён палолі, ірвалі, мялі, трапалі, снавалі, павівалі, пралі, ткалі, бялілі, адбівалі, мылі, рассцілалі, скручвалі. Юнакі суправаджалі ўсё гэта прытупамі ў такт песні.

Падобная мелодыя запісана ў Гомельскай вобласці:



Шырокую папулярнасць набыла мелодыя карагода, запісаная Г. Цітовічам:





Ох, і сеяла Ульяніца лянок,
Ох, і сеяла Іванаўна лянок.
Ох, сэрца лянок,
Мая радасць ты, лянок,
Ўсё бялюсенькі кужалёк! [1]

Ох, палола Ульяніца лянок,
Ох, палола Іванаўна лянок.

Ох, ірвала Ульяніца лянок,
Ох, ірвала Іванаўна лянок.

А сарваўшы, у снапочкі ставіла,
А сарваўшы, у снапочкі ставіла.

Ох, і слала Ульяніца лянок,
Ох, і слала Іванаўна лянок.

Ох, і мяла Ульяніца лянок,
Ох, і мяла Іванаўна лянок.

Ох, і прала Ульяніца лянок,
Ох, і прала Іванаўна лянок.

Ох, і ткала Ульяніца лянок,
Ох, і ткала Іванаўна лянок.

А саткаўшы, ды сарочак нашыла.
А саткаўшы, ды бялёвых нашыла.

Часта выканаўцы карагода ходзяць па крузе, узяўшыся за рукі або парамі, і спяваюць, іншы раз прыстукваючы абцасамі. Такі,

[1] Прыпеў "Ох, сэрца лянок..." паўтараецца пасля кожнай страфы.

напрыклад, карагод, дзе ў жартоўнай форме спявалі пра жанчыну, што ткала "ў нядзельку шматок, за тры года — лакаток":



У некаторых выпадках удзельнікі акрамя простых крокаў выконвалі бакавыя прыстаўныя крокі.

Цікавы рытмічны варыянт пад назвай "Пасеялі дзеўкі лён" запісаны ў Чачэрскім раёне Гомельскай вобласці:





Можна ўявіць, якімі яскравымі будуць гэтыя карагоды ў выкананні дзяцей і моладзі.

(Чурко. С. 22—24)

Церніца

"Церніца" — полька і самастойны танец. Назва яго паходзіць ад назвы інструмента для апрацоўкі льну. Рух у польцы "Церніца" быў звычайны. У танцы ж выканаўцы, паклаўшы адзін аднаму рукі на плечы, станавіліся ў два кругі. Ідучы ў парах па крузе, выконвалі прытопы, імітуючы абіванне льну, адначасова падымалі і апускалі рукі, быццам церлі лён церніцай. Танец часта суправаджаўся прыпеўкамі, якія прыводзіць Г. Цітовіч:





А на гары цер(ы)ніца сама трэ,
А да мяне дзевіца сама йдэ.
Цер(ы)ніца, цер(ы)ніца сама трэ,
Дзевіца, дзевіца сама йдэ.
А я тую цер(ы)ніцу на гару,
А да сябе дзевіцу прыгарну.
Цер(ы)ніцу, цер(ы)ніцу на гару,
Дзевіцу, дзевіцу прыгарну.

Дзе-нідзе была вядома таксама полька "Церніца", якую выконвалі парамі.

(Чурко. С. 73)





КУПАЛЛЕ

Купала (Ян) — 24 чэрвеня ў каталікаў, 6 ліпеня ў праваслаўных.

Адно з найстаражытных і любімых у народзе святаў — Купалле. Гэта свята вяршыні лета, росквіту прыроды, выяўлення яе магутных жыццёвых сіл. Гэтая жыццёвасць, жыццярадаснасць, весялосць панавала і ў купальскую ноч з яе вогнішчамі, варажбой, скокамі, музыкай. Як спяваецца ў народнай песні:

Ой, рана, рана ды на Яна,
да ўся зямля дрыжала з Купала,
ды лясы звінелі, як мы пелі,
сяло разлягалася з музыкі.

(Кацар. С. 86)

Папараць-кветка, згодна з народнымі павер'ямі ўсходніх славян, зацвітае толькі раз у год — апоўначы на Купалле, звычайна ў самым гушчары лесу. Лічылі, што чароўны яркі колер, якім успыхвае папараць-кветка, сыходзіць на яе ад Перуна. Па агульнавядомым уяўленні, гэтая кветка цвіце толькі некалькі імгненняў, і той чалавек, які зможа яе сарваць, стане шчаслівым і багатым, атрымае здольнасць разумець гаворку звяроў і дрэў, зможа адшукаць схаваныя ў зямлі скарбы. Верылі, што чароўную кветку ў момант яе цвіцення ахоўваюць розныя нячысцікі і страшыдлы, уздзеянне якіх на чалавека можа мець небяспечныя і нават трагічныя вынікі. Так, у адной беларускай легендзе расказваецца аб тым, што да пошукаў папараць-кветкі чалавека можа падбухторваць нячысцік ("Пайдзі ды пайдзі. Сарвеш тую кветку — грошай шмат здабудзеш, не толькі што сабе і дзеткам заробіш, але і на ўсю вёску хопіць"). Паслухаўшыся "чартоўскага нашэптвання", хлопец уначы пайшоў да абранага ім месца, а раніцай яго знайшлі "ў канаве зусім бездыханным: відаць, чэрці

яго туды піхнулі". Чалавека, які адважыўся сарваць папараць-кветку, чакаюць цяжкія выпрабаванні. Некаторыя з іх апісваюцца ў народнай легендзе "Папараць"... У некаторых іншых легендах расказваецца аб выпадковым авалоданні чалавекам папараць-кветкай, што прыводзіць да набывання ім чароўных, незвычайных якасцей: "Ішоў гаспадар лесам, учапілася яму ў лапаць кветка папараці, і чуе ён, як сабакі гавораць між сабою... Чуе гаспадар, пра што птушкі і букашкі гавораць..."

У адным з рускіх паданняў з'яўленне кветкі на папараці таксама апісваецца як небяспечная і амаль недасягальная для чалавека, але чароўная і прыцягальная з'ява: "Внезапно появляется почка, которая, поднимаясь все выше и выше, то заколышется, то остановится — и вдруг зашатается, перевернется и запрыгает. Ровно в 12 часов ночи созревшая почка разрывается с треском, и взорам представляется ярко-огненный цветок, столь яркий, что на него невозможно смотреть; невидимая рука срывает его, а человеку никогда почти не удается сделать это. Во время цветения папоротника слышно, будто бы щебет и голос нечистой силы, не желающей допустить человека до чудного, редкого цветка, имеющего драгоценные свойства..."

Такія ж уяўленні аб папараць-кветцы ўласцівы і ўкраінцам: яны верылі, што з яе дапамогай можна даведацца аб сваім і чужым лёсе, лячыць хворых, разумець мову птушак. Разам з тым у заходнеўкраінскай традыцыі папараць асэнсоўвалася як любімае зелле чарцей і ведзьмаў. У сувязі з такімі ўяўленнямі на Гуцульшчыне існаваў звычай біць папараць: каб яна не сеялася на полі і не шкодзіла іншым травам, яе збівалі палкамі, а потым месца, дзе яна расла, апырсквалі святой вадой.

Паэтычна асэнсаванае паданне пра папараць-кветку знаходзім у вершаванай казцы Уладзіміра Дубоўкі "Кветка шчасця":

Ёсць цудоўнае паданне,
як на свята, на Купалле,
ад паўночы да світання
кветку Шчасця ў нас шукалі.
Гаварылі, што на свята
дзесьці папараць красуе.
Пекла ўсё тады паднята,
каб не даць нам кветку тую.
Узнімаюць ведзьмы скогат,
лямантуюць дзіка чэрці,
каб шукальніка якога
напалохаць аж да смерці.

Адшукаць туды дарогі,
дзе яна красуе, цяжка:
настаўляюць чэрці рогі,
ведзьмы скачуць урасцяжку.
Лесуны выходзяць з нетраў
і русалак карагоды.
Вадзянік і сорак ветраў
там з'яўляюцца заўсёды.
А чаму? Хто кветку знойдзе,
возьме гэту кветку ў рукі, —
шчасце з'явіцца ў народзе,
будуць людзі жыць без мукі...

(Коваль, 1995. С. 114—116)

З этнаграфічнай спадчыны Аляксандра Сержпутоўскага

Спосаб здабывання і захоўвання агню шырока апісаны ў шматлікай навуковай і навукова-папулярнай літаратуры. Не абышоў гэты факт увагай і А.К. Сержпутоўскі, прысвяціўшы яму этнаграфічны нарыс "Добывание огня"[1]. Даследуючы быт жыхароў цяжкадаступных населеных пунктаў Беларускага Палесся, ён адзначаў, што большасць сялянскіх сем'яў не карысталіся запалкамі і здабывалі агонь старажытным дзедаўскім спосабам пры дапамозе вогніва, крэмню і трута або "цыра" — грыба, што расце на гнілой частцы ствала хвоі. Рабілася гэта па некалькіх прычынах. Запалкі каштавалі даволі дорага і былі не па кішэні многім палешукам. Да таго ж яны тухлі ад ветру. Таму кожны мужчына насіў у маленькай торбачцы, якую называлі вогневіцай, магалейкай або калітой, нескладаныя прыстасаванні для атрымання агню. Умелі разводзіць агонь у сваіх дамах і палескія жанчыны, калі мужчын не было ў сядзібе.

Ва ўрачыстых выпадках запальвалі свяшчэнны агонь трэннем, пры дапамозе шкельцаў і сонечных промняў. Гэта рабілі звычайна пры пераходзе ў новы дом. У прысутнасці ўсёй сям'і, гасцей гаспадар распальваў свяшчэнны агонь у старой хаце і пераносіў яго ў новую хату, дзе рыхтавалася застолле. На думку палешукоў, у такім выпадку заступнікі продкаў разам з агнём пераселяцца на новае месца і будуць ахоўваць навасёлаў ад няшчасцяў і бядот.

У час эпідэмій пры дапамозе свяшчэннага агню запальвалі кастры на ўскраінах вёсак. Яны павінны былі ўберагчы людзей ад хвароб.

У многіх палескіх вёсках існаваў звычай распальваць пры дапамозе свяшчэннага агню купальскія вогнішчы. Яшчэ задоўга да свята на месца, дзе ў ноч з 22 на 23 чэрвеня шугане ў неба купальскі агонь, моладзь пачынала зносіць "май" — галінкі бярозы, ліпы, якімі на Тройцу сяляне ўпрыгожвалі дамы і двары, а таксама кавалкі дошак, салому, зношаныя лапці.

У дзень свята хлопцы ўкопвалі ў зямлю высокую жардзіну, насаджвалі на яе старое кола ад павозкі. Дзяўчаты вешалі на жардзіну вянкі, упрыгожвалі яе рознакаляровымі стужкамі, зялёнымі галінкамі. Затым вакол жардзіны складвалі ўсё, што гарыць.

Вечарам, калі сонца хавалася за гарызонтам, і малыя і старыя ішлі сустракаць свята. Пакуль хлопцы і дзяўчаты спявалі песні, гулялі ў розныя гульні, а старыя вялі нетаропкія размовы пра жыццё-быццё, маладыя дужыя мужчыны прымаліся за дабыванне свяшчэннага агню. І вось ён — доўгачаканы момант: на волю вырваўся агеньчык. Ён перакідваўся на сухую салому, вецце. Адступала цемра. Пад радасныя крыкі і воклічы прысутных пачыналася адно з самых любімых народных святаў.

(Касько, 1997)

---

[1] Живая старина. 1909. Вып. 1. С. 40—45.

КУПАЛА

Белая Русь з'яўляецца сярод славян сярэдзінным, першапачатковым і асноўным месцам старажытнай урачыстасці Купалы...

Вечарам 23 чэрвеня збіраецца супольнасць, па магчымасці, усіх жыхароў з хат і вёсак...

Галоўную ролю выконваюць дзяўчаты, побач — нежанатыя малойцы ў адпаведных парах і радах; з імі разам — танок. Затым — замужнія маладыя жанчыны, бабы, удовы; слабейшая роля — астатніх. Агульны перавес на жаночым баку. Старыя не столькі дзейнічаюць, колькі ўдзельнічаюць, іменна піруюць. Частка іх, таксама як і дзяўчынак, — дома, ахоўваюць хату і дзяцей. Але хлопчыкі маюць свае гурткі, скокі і нават песні.

Галоўны разгар свята: гулянні, песні — ноччу, на Івана. Робяць і прыбіраюць ляльку — жаночае пудзіла. Носяць яе, скачуць вакол, запальваюць, пазней топяць у вадзе. Адценні мужчынскага вобраза тут ледзь прыкметныя, і то толькі ў песнях або ў лучнасці з Купалам, асобай паўмужчынскай, паўжаночай. Матэрыял лялькі: аснова — слуп або калок, потым — салома, лыка, каноплі, хвораст, бярозкі.

Часцей агульнаўжывальны і абавязкова паўсюдны як выключная асаблівасць, без якой няма Купалы, — касцёр, які запальваецца, згарае, іншы раз заліваецца вадою... Агонь у некаторых мясцінах распальваецца пры дапамозе трэння дошак. Яны і гараць у кастры (з разбітых бочак, чанаў, кублоў, вёдзер, хатняга драўлянага посуду; у дадатак — старыя анучы, лыка).

Цераз касцёр скачуць, але меней, чым у Маларасіі і іншых краях. Больш вакол танцуюць, гуляюць, абыходзяць, піруюць. Замест кастра або пры ім іншы раз гарыць бочка, калі ёсць — смаляная, дзе дазваляе мясцовасць — на ўзвышэнні або крутой гары.

Заліваюць агонь кублямі (чан, дзежка з крышкаю) і вёдрамі. Радзей пускаюць яго гарэць на плоце. Гэта большая прыналежнасць заходняй Саботкі. Яшчэ радзей цяпер купаюцца пад раніцу ў сувязі з забыццём старыны, ачышчэннем паняццяў і ўмацаваннем хрысціянства. Разам з тым ноччу бывае і менш грахоў. У некаторых мясцінах замест купання ўжываецца лазня, і то ўжо як падрыхтоўка да свята або ачышчэнне пасля Купалы...

Самое месца, дзе збіраюцца, абгароджваецца, абсаджваецца зялёнымі дрэўцамі, часцей бярозкамі, калкамі накшталт зялёнага тыну, плятня... Гэта характар месца свяшчэннага, запаведнага...

Абрады суправаджаюцца песнямі, узмоцненымі прытопваннем, стукам. Калі маецца, у што-небудзь б'юць: ці ў кубло, ці ў вядро. Гэта адчуваецца і ў прыпеве саміх песень. Дзе толькі захавалася валынка і можна яе дастаць, яна абавязкова прысутнічае. Пры ёй і дудар, скамарох з прытанцоўваннем. Калі ж няма, то добра і скрыпка.

У святочных уборах галоўная ўвага звернута на жаночую галаву і абутак...

Да звычайных "саракоў", або (у замужніх каталічак) чапцоў (у багачоў — з кветкамі і лентамі), па ўсходніх акраінах Белай Русі

дадаюць да гэтага свята: дзяўчаты "войнік" — род паўпавойніка з блакітнай матэрыі з бісерам і ўзорамі, гэтага вядомага астатку ад старажытнага металічнага вянца, а разам... вянок з траў і кветак; замужнія — "паневяйко", глухі (з дном) павойнік, таксама размалёваны. Лапаць мае вялікую ролю ва ўсім абрадзе, песнях і паданнях Купалы, але яго і мужчынскія боты няма чым цяпер размаляваць. А жаночы пол выхваляецца панчохамі і падвязкамі.

Пачастункі, якія прыносяцца з усіх заможных дамоў, ужываюцца і раздзельна, гуртам, і ў складчыну, складаюцца з сыру, тварагу, праснакоў-бабак з тоўчаным канапляным семем, цыбулі, часнаку, пахучага зелля, халадніку-квасу, яешні, верашчакі, у якой маецца сала і мяса (адзінага выключэння з астатніх больш раслінных страў у гэтае свята), і г.д.

...На Белай Русі выключна гарэлка ў магчымым мностве. Звычайна цвярозымі некаторае выключэнне складаюць хіба толькі беларусы і літоўцы. А так, як збіраюцца натоўпы людзей, то, безумоўна, ужываюцца цэлыя бочкі і бачоначкі; іх жа разбітыя рэшткі і ідуць у дадатак кастроў.

Вядомае адноснай чысцінёй і цнатлівасцю сямейнае жыццё Белай Русі калі і дапускала прабелы або плямы з непрыемнымі вынікамі, то іменна і пераважна на Купалу. Між іншым развіццё хрысціянскага светапогляду і ўзмацненне царквы, асабліва каталіцкай, разам з паслабленнем старога язычніцкага абраду ўсё больш і больш кладзе на тое канец.

Ведзьмы або чараўніцы, якія ўяўляюць старажытную светлую, цяпер ужо злую і дэманічную, Купалу адыгрывалі ў яе ноч значную ролю. Так, адпраўляючыся на (Лысую. — *А.Л.*) гару, яны для таго сядлаюць сабе і замучваюць яздою коней, што ў нас робіцца Ведуном або Дамавым. Супраць гэтага ўжываюць беларусы меры, развешваючы вянкі з траў або асвечаных зёлак у канюшнях... не адпускаючы коней у начное ў поле і г.д. І ўсё-такі на другі ранак многія коні вымучаны так, што валіць пара або спутаны валасы. Ведзьма для сябе і сваіх сябровак у гэтую ноч выдойвае ў кароў малако, найперш напаіўшы іх расою з агародаў; выцэджвае або выпівае яго з пасудзін у пограбе, з'ядае сыр і ўсё малочнае... Супраць гэтага зноў упрыгожваюць рогі жывёлы вянкамі, святаянскімі зёлкамі, утыкаюць травы па кутках хлявоў, асабліва "ластавіцу", "ластачнік", вешаюць над дзвярамі забітую сароку, кладуць крыж-накрыж лучыну (як у Богаяўленне), ставяць васковую свечку, асвячоную ў Срэценне...

Зёлкі, былінкі, травы ў купальскую ноч збіраюцца наогул усе, якія толькі патрэбны для ўжывання — для вянкоў, лекаў і ежы. Гэта лепшая іх пара. Але, як і ўсюды ў славян і на ўсёй Русі, у Русі Белай ёсць травы і кветкі выбарныя, якія выключна належаць купальскаму дню: рута, васіль, васілёк; дзягель, дзягіль; багаткі; салодка, саладушка; буйрак, бурашнік; ластавіца, ластавень і кураслеп, курыная слепата; пералёт; лопань, лапух; быліца; расходнік; брацішкі, брат з сястрою, іван-ды-мар'я; найбольш папараць, папаратка, папаратнік. Ён цвіце толькі адзін раз у годзе незвычайнай, цуднай,

асляпляльна-белай кветкаю іменна ў гэтую поўнач. Клады, або гаршкі з золатам і серабром, даюць пра сябе знаць у купальскую ноч. Над імі выскаквае воўк, гарыць агонь, а часцей за ўсё цвіце папаратнік. Але хто сарве кветку, атрымлівае не адны клады. Яго сіла ўсіх здолее, ён адмыкае ўсе замкі і запоры, разбурае перашкоды, здабывае ўсё пажаданае, усё ведае, разумее мову птушак і дрэў, знішчае пакушэнні чараўніц. Цяжка кветку падгледзець, яшчэ цяжэй вырваць...

...На зарніцу павінна ўсё скончыцца... дзе ёсць звычай, купаннем. Пасля гэтага ўсе адпраўляюцца глядзець усход сонца. Яно на ўсходзе "гуляе", дрыжыць бляскам, дзеліцца на некалькі частак, "зайчыкаў", якія разбягаюцца, гуляюць і зноў зліваюцца ў адзін промень. Па-іншаму, у гэтую раніцу сонца едзе "да мужа на тройцы", золатам, срэбрам скача на калясніцы, сыпле з яе промні і іскры. Раніца 24 чэрвеня — пералом, пасля чаго наступае ўжо Іван, Ян... Але гэты дзень у язычніцкім і народным значэнні поўнасцю знік. Ён уваскрэс у хрысціянскім, таму што хрысціянства з самых першых часоў асвяціла яго святкаваннем Раства Івана Прадцечы.

(Бяссонаў, 1871)

ІВАН КУПАЛА

...Гадзін у 10 вечара хлопцы з в. Углаў накіроўваюцца з конямі ў поле ў начное, а дзяўчаты, узяўшы бярозкі, якія засталіся ад свята Тройцы, ідуць з песнямі па вёсцы на перакрыжаваную дарогу. У якой хаце ёсць нежанаты хлопец, перад той будынінай спяваюць наступную песню:

—Чаму, Яначка (або іншае імя), не жэнішся?
Чы твая хата не крытая,
Чы твая дзевачка не запітая?
— Мая хата закрытая,
Мая дзевачка запітая.
Мая хата не тручана,
Мая дзевачка не заручана.
Із хмелю чмялі гняздо звілі,
А людзі дзеўку разраялі.

Дарогаю спяваюць таксама наступныя песні:

Да сягодня Купала,
А заўтра Йван,
Будзе, дзяцючкі, ліха вам.
А якое ліха — ліхое:
Пагоніце сабакі ў поле,
Да ад свіныя лябядзіцы[1]
Пагоніце сабакі да вадзіцы.

[1] Свіныя лябядзіцы — трава.

* * *

Не вяліка ночка Пятровачка,
Да не выспалася малодачка.
— Ты ж, маладая малодка,
Ты хадзі з намі на Купала.
— Ай жа вы, дзевачкі, дзіўнесенькі,
Ёсць у мяне дзіцятка малесенька.
— Уж маладая малодка,
Да сваей свякроўцы пакарыся,
Няхай тваяго дзіцятку пакалыша.
— Я ж карылася і плакалася —
Свякроў дзіцяткі не калыша.
Калыбелька мая скрыпіць,
А дзіцятка пішчыць.

* * *

Да йшло Купала сялом, сялом,
Да забіла жабу калом, калом,
Да ўсем дзяцючкам па клешаньцы,
Маладому Яначку саўсем жабку.
Ён яе аблупіць да пашые шапку.
Ён жа пойдзе жаніціся,
Будуць з яго людзі дзівіціся.
Ён жа пойдзе вянчаціся,
Будуць з яго людзі смяяціся.

Апошняя песня мае жартаўлівы характар, але ў ёй успамінаецца Купала, які забівае жабу (лягушку). Лягушкі і гады складаюць нібы світу ведзьмаў, згодна з агульным народным павер'ем. Малако ў кароў ведзьмы адбіраюць часцей усяго пры дапамозе лягушак, якія высасваюць малако. Такіх лягушак беларусы называюць часцяком рапухамі.

Гурт дзявіц з вышэйназванымі песнямі ў суправаджэнні дзяцей, якія ідуць ззаду і нясуць салому, прыпыняецца за вёскай на скрыжаванні. Уверсе на жэрдцы прымацоўваюць старое кола, скрынку ад дзёгцю (мазніцу), абкладваюць саломаю і падпальваюць. Калі жэрдка ўпадзе, кідаюць на палаючае кола бярозкі, робяць касцёр, цераз які скачуць. А калі гасне касцёр, то галавешкі кідаюць адзін на аднаго. Пасля гэтага ідуць у вёску, з'яўляюцца хлопцы з музыкаю і пачынаюцца танцы, прычым неяк дрэнна гарманіравалі са старынною кадрыля і полька, забраўшыся ў такую глуш. Пакуль гарыць кола, спяваюць наступную песню:

Да гарэла Купала яснюсенька,
На Купале дзяцючкоў паўнюсенька.
Да гарэла Купала, пагарэла,
На Купале дзяцючку пагалела.
Да гарэла Купала з паўночы,
Да павыпекла ведзьме вочы,
Каб вона ўночы не хадзіла
Да нам шкоды не рабіла.

Адпраўляючыся спаць, дзяўчаты зрываюць траву трыпутнік са словамі: "Трыпутнік, трыпутнік, ты стаіш пры дарозе, бачыш старога і малога, пакажы мне маяго мілога".

Пасля гэтага нельга ўжо "жупіці" — размаўляць.

(Бывалькевіч, 1891)

КУПАЛЛЕ НА ШКЛОЎШЧЫНЕ

Святкаванне Купалля пачыналася яшчэ вечарам. У той вечар дзяўчаты збіраліся гуртам і ішлі ў поле — збіралі краскі: рамонкі, васількі. Звівалі вянкі. Пускалі іх па рацэ, спяваючы:

Распашу я пашаньку,
Засею я канапельку.
Расці, расці, канапелька,
Тоненька, высачэнька,
Каб і дзеўкі твайго цвету не зрывалі
І ў вяночкі не ўвівалі,
І ўслед за вадою не пускалі.
А там па Дунаю дзеўкі кудры пралі.
Тыя кудры перанялі (2)
І да матушкі паслалі.
Спазнай, маці, чые кудры?
— Гэта кудры сына майго раджонага,
У салдацікі здаджонага.

Дзяўчаты назіралі за вянкамі. Калі на месцы вянок — у сваю вёску пойдзеш замуж, а калі вянок паплыў убок — то ў тую старану пойдзе дзеўка, а самае жудаснае, калі вянок патануў, — гэта нехта блізкі памрэ. Кідалі вянкі на бярозу.

А 6 ліпеня дзеўкі кралі ў аднаго з хлопцаў штаны і вечарам тры разы абносілі вакол вёскі, потым прыносілі на вогнішча, якое распальвалі на скрыжаванні дарог, каб прывабіць усіх хлопцаў да сваёй вёскі.

Вечарам дзяўчаты хадзілі ў жыта долю гукаць. Лажыліся долу і казалі:

Долюшка-доля, адгукніся!
Доля, гу...

І слухалі, што пачуюць.

Карагодаў тут не вадзілі, але карагодныя песні спявалі (расказчык не памятае).

Хлопец, які хацеў, каб дзяўчына пайшла за яго замуж, у дванаццаць гадзін вечара падыходзіў пад яе акно, тры разы стукаў і казаў: "Выхадзі, выхадзі..." Гэта значыцца, выходзь за мяне замуж.

7 ліпеня Ян, або Іван. У гэты дзень нічога нельга было рабіць. Гатавалі багатую ежу, запрашалі гасцей, хадзілі ў царкву.

(Лозка, 1996)

[ГУЛЬНЯ КАЛЯ КАСТРА НА КУПАЛЛІ]

Прыйшоўшы да назначанага месца, гэтую кучу падпальваюць і расцягваюць касцёр у даўжыню. У непагодлівую пару робяць загадзя шалашы са свежай зелені, а ў добрую толькі ўтыркаюць некалькі зялёных дрэў у зямлю так, нібы яны тут раслі. Гаспадыні прыносяць закускі, а гаспадары — віно. Усе размяшчаюцца каля кастра. Трохі закусіўшы, адны пачынаюць спяваць і танцаваць, другія п'юць і закусваюць, трэція шукаюць папаратнік або грошы.

Калі касцёр ярка разгарыцца, тады "ўраднік" (распараджальнік свята. — *А.Л.*) аддзяляе хлопцаў ад дзяўчат і падводзіць іх на два бакі кастра — хлопцаў на адзін бок агню, дзяўчат — на другі.

Стаўшы такім чынам адны супраць другіх, пачынаюць скакаць цераз агонь. Спачатку скачуць дзяўчаты. І каторая з іх не пераскочыць, называюць "ведзьмаю". Пасля дзяўчат пачынаюць скакаць і хлопцы. Пры гэтым пераскокванні дзяўчаты спяваюць прыпеў:

Цяпер Купала, заўтра Ян,
...кідаў хлопцаў цераз баркан.

А хлопцы спяваюць:

Цяпер Купала, заўтра Ян,
...кідаў дзевак цераз баркан.

Прыпеў гэты працягваецца ўвесь час, пакуль яны скачуць.

Тым часам прыходзіць на ігрышча самая старая баба за агнём. Яе сцерагуць, каб яна, узяўшы агонь, не змагла пайсці не злоўленаю. Як толькі яна возьме агонь, яе пачынаюць гнаць і сцёбаць палыном да таго часу, пакуль не збяжыць "ведзьма".

Прагнаўшы яе, моладзь зноў пачынае гуляць да позняй ночы.

(Дзмітрыеў, 1869)

[КУПАЛЛЕ Ў НАРОДНАЙ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ]

У народнай мастацкай творчасці вельмі любімы і пашыраны вобраз Купалінкі, якая ўяўляецца ці маладой вясёлай дзяўчынай, ці жанчынай з дзецьмі. Гэты паэтычны вобраз часта сустракаецца ў народным мастацкім ткацтве і вышыўцы. Так, на ручніку А. Пакроўскай (Старое Сяло Віцебскага р-на) Купалінка паказана ў танцы. Тут жа і вянок, якім дзяўчаты гадаюць на вадзе, а таксама папараць-кветка — сімвал шчасця. А матыў у выглядзе елкі майстрыха растлумачыла так, што Купалле звычайна святкуюць на паляне ці каля лесу, дзе жыве Лесавік (мал. 8).

Падобная кампазіцыя і на ручніку С. Мацкевіч (Пярэспа Сенненскага р-на). Тут Купалінка паказана з характэрнай паставай ног, як



Мал. 8. Купальскія матывы



Мал. 9. С. Мацкевіч. Ручнік з матывамі Купалінкі. Пярэспа Сенненскага р-на Віцебскай вобл.



Мал. 10. Купальская трава

у імклівым танцы (мал. 9). Н. Мацко (Беліца Сенненскага р-на), у якой давялося бачыць дакладна такі ж ручнік, растлумачыла, што тут паказана Купалінка ў танцы, з вянком на галаве, пад ёю — галінка папараці, ніжэй — месяц у выглядзе падвойнага ромба. Гэта азначае, што Купалле святкуюць у поўнач. Ручнікоў з падобнымі ўзорамі траплялася шмат...

На ручніках ткачых давялося бачыць усю атрыбутыку Купалля. Гэта купальская трава ў выглядзе галінкі з трыма кветкамі (мал. 10), паколькі яе збіралі для трох канкрэтных мэт: на вянкі, для варажбы і як лекі. Купальскі вянок паказваўся з падвязанай знізу стужкай, чым адрозніваўся ад звычайнага.

Прыгожа выглядае матыў купальскага агню ў выглядзе раслінных парасткаў з кветкамі на канцах і з зоркай у цэнтры (мал. 11). Паводле павер'яў, купальскі агонь меў чароўную сілу. Так, калі на ім дзяўчына спальвала волас каханага, той адказваў ёй узаемнасцю. Купальскі



Мал. 11. Купальскі агонь



Мал. 12. Купалле

агонь лічылі больш цудадзейным, чым агонь грамнічнай свечкі. Вугалёк з яго хавалі, лічылася, што ён лечыць, ахоўвае ад сурокаў.

Цэлую купальскую паэму вышыла на ручніку Н. Вальковіч з Лідскага раёна (мал. 12). Тут мы бачым усе атрыбуты свята, размешчаныя па пяць у радзе: Купалінка ў танцы, купальскі вянок, купальская трава з трыма кветкамі, галінка папараці, агонь-жыжа, карагод.

(Кацар. С. 86—87)

ЛЕГЕНДЫ

[Папараць-кветка]

У Дзісненскім павеце захавалася паданне пра работніка, які выпадкова наступіў на папараць, а цвет яе ўпаў яму ў лапаць. У той жа момант стаў ён усёведным: знайшоў прапаўшых коней, даведаўся, дзе схаваны скарбы, як трэба бараніцца ад чараў ведзьмаў. Прыйшоўшы дадому, гэты ўсёведны разуўся, цвет папараці застаўся ў лапці, і — эх! — кончылася ўсёведанне! Усе, хто былі ў хаце, здзіўленыя гэтым раптоўным пераходам ад усёведання да нічога, здагадаліся, у чым справа, і кінуліся аглядаць лапаць. Нехта Сцяпан ухапіў кветку

і ўцёк. Данеслі пану. Той не збаяўся знахарства Сцяпана, сілком адабраў ад яго чарадзейны цвет, і з таго часу горкае жыццё настала не толькі яго сялянам, але і чарцям.

(Кіркор, 1858)

Папараць-кветка

Пайшоў на Яна ў лес гаспадар шукаць карову, а за ім паляцелі яго два сабакі. Ішоў гаспадар лесам, учапілася яму ў лапаць кветка папараці, і чуе ён: сабакі гавораць між сабою. Адзін кажа:

— Ляці дахаты, там злодзей хоча ў хату залезці, а я астануся карову шукаць.

Згаварыліся і разляцеліся ў розныя бакі.

Чуе гаспадар, пра што птушкі і букашкі гавораць, знайшоў ён карову, а каля дому зноў тыя сабакі падбягаюць да яго і гавораць між сабою:

— Ну як, прагнаў таго злодзея?

— Прагнаў.

— А ці пакарміла цябе гаспадыня?

— Дала таго бліна, што дзеці абцерла.

Тут гаспадар стаў тупаць ды абшчыпаць свае лапці, кветка вылецела з лапця, і гаворка сабачая перайшла ў лаянку. Больш ён ад іх нічога не пачуў, толькі адно зразумеў: сабак трэба карміць, трэба іх аддзячыць.

(Легенды і паданні. Зап. у 1974 г. у в. Цаюны Валожынскага р-на)

Папараць

Жыў сабе ў аднэй вёсцы валасны пісар. Ад самага нараджэння ён не быў трусам і ніколі не верыў у нячыстую сілу. Вось уздумаў ён пад самага Купалу, упоўнач, пайсці на балота ў лес шукаць папараць. Прыйшоў наш харобнік у самую гушчу лесу, схаваўся за кусты і чакае, пакуль запаветны квет зацвіце. Дзесь-то начная птушка ўспырхнула, на небе скрозь дрэвы відаць маладзік, усюды ціха. Аж раптам навокал усё заблішчэла. Спужаўся пісар. Глядзіць, каля яго ног на сцібле чырвоны квет увесь зззяе. Толькі ж ён хацеў адшчыпнуць квет, як той абярнуўся злюшчым сабакам і пачаў на яго рычаць, ашчэрыўшы зубы. Уздумаў пісар стракача даць. Але тут яшчэ вялікшы жах яго спаткаў: паміж лапухоў сядзіць зялёная вужака з петушынай галавой, а ў паветры на рэшаце ляціць ведзьма, махае мятлой, за ёй ляцяць крылатыя каты, лягушкі на кароткіх нагах і ўсялякая нечысць. Апамятаваўся наш пісар, што нечага пужацца ўсёй гэтай нечысці, сабраўся з духам і харобра сашчыпнуў агнявую краску, завязаў яе ў ҳусцінку і пайшоў дахаты, не азіраючыся назад. Ідзе, травы і збожжа становяцца вадою, але ён ідзе. Вада разыходзіцца, а пісар усё ідзе з аднэю думкай — дайсці дахаты і стаць багатым. Ужо

выйшаў з лесу на дарогу, аж бачыць: едзе на сваёй клячы знаёмы яму дзячок.

— Адкуль ідзеш? — запытвае ў яго дзячок.

— З поля, — адказвае пісар.

— А што ў хусцінцы ты нясеш?

— Падарунак для сваёй маленькай дачкі.

— Ну, дык сядай, я цябе падвязу; паганяй каня, а я падарунак твой патрымаю.

Наш пісар сеў на карафашку і давай паганяць хутчэй каня. Чуець, дзесь-то недалёка прапеў певень. Глядзіць — і што ж? Усё згінула: і дзячок, і квет, і конь. А ён сам сядзіць на сваім кію вярхом дый паганяе яго бізуном.

Так нашага пісара ашукаў нячысцік. А ўж куды разумней за нячысціка быў пісар: на ўсю ваколіцу славіўся сваёй смякалістасцю. Але супраць нячысціка не ўстаяў.

(Сахараў, 1944. Зап. у 1935 г. у Сярэдняй Пагулянцы, каля Дзвінска)

[У ноч на Купалле]

...Гадоў сто, а можа, і дзвесце назад у ноч на Купалле ведзьмы і лесуны абралі пад свае скокі самы стары на Лысай Гары ясень. З-пад яго густой кароны разносіліся па наваколлі смех, свіст, нейкая бязладная гаворка. Лысагорцы, пачуўшы вядзьмарскае ўлюлюканне, пахаваліся ў сваіх хацінах. Адзін толькі малады каваль, асілак Янка, не спалохаўся. Ён шпацыраваў са сваёй дзяўчынай Марыйкай і не звяртаў аніякай увагі на ўвесь гэты д'ябальскі вэрхал. Але раптам з ніжняй галіны ясеня працягнулася белая як снег рука, і салодкі голас паклікаў:

— Ідзі, Марыйка, ідзі да нас у карагод!..

Марыйка падала руку — і як у пастку трапіла. Пацягнула яе невядомая сіла ўверх, на ясень. Добра яшчэ, што Янка паспеў ухапіцца за яе. Расставіў ногі, упёрся магутнымі плячамі ў дрэва і не пускае. А зверху рагочуць ды прыгаворваюць:

— Позна, Янка, позна. Марыйка сама згадзілася, не твая яна ўжо, а наша. Пусці, пакуль дабром просім...

Раззлаваўся асілак-каваль, мацнейшым у сем разоў зрабіўся. Паднатужыўся ды так ірвануў з учэпістых пальцаў сваю каханую, што разам з ёй сцягнуў з ясеня цэлы тузін звязаных адной вяроўкай ведзьмакоў-страшыдлаў. Адразу сціх рогат, пачалі ведзьмакі плакаць-рыдаць, прасіць Янку, каб падсадзіў іх на ясень. Золата, брыльянты абяцалі. Янка загадаў Марыйцы заплюшчыць вочы, а сам ухапіў за чупрыну першага лесуна, пацягнуў увесь іх паганы карагод да гнілой сажалкі, што была каля падножжа Лысай Гары, і спіхнуў у дрыгву. Закіпеў бруд балотны, і ў адно імгненне выпарылася, высахла тая сажалка.

З таго часу на старым лысагорскім ясені, названым у гонар смелага каваля-асілка Янкавым, ніколі больш у ноч на Купалу аніякай

нечысці не з'яўляецца. Нават калі дзьме моцны вецер, калі трымцяць, гудзяць усе суседнія дрэвы, Янкаў ясень стаіць і не варухнецца...

(Пракопчык, 1981)

ГУЛЬНІ І ЗАБАВЫ

Збор зёлак і кветак

Купальская пара найбольш прыдатная па прыродных умовах для збору лекавых траў. Народная свядомасць прыдала ёй міфічна-цудадзейную сілу. Пачыналі збіраць купальскія зёлкі днём 6 ліпеня. Пятро Бяссонаў называе наступныя з іх: рута, васіль, васілёк; дзягель, дзягіль; багаткі; салодка, саладушка; буйрак, бурашнік; ластавіца, ластавень і кураслеп, курыная слепата; пералёт; лопань, лапух; быліца; расходнік; брацішкі, брат з сястрою, іван-ды-мар'я; папараць, папаратка, папаратнік.

Гэтай падзеі прысвечана нямала купальскіх песень: "А на Купалле, на Яна дзевачкі зелле капалі", "Купалачка, дзе твая дачка?" і інш.

Збіралі зёлкі і кветкі для розных мэт: дзеля прыгатавання лекаў, для святочных вянкоў і варажбы, якая нагадвала таемную забаву. Дзяўчаты з вянкамі вадзілі карагоды ля вогнішча, затым купаліся на зары і пускалі вянкі на ваду, наглядаючы за іх рухам, у якім імкнуліся разгадаць свой лёс. Для гэтай прычыны ўтыкалі краскі і зёлкі ў шчыліны сцен будынкаў.

Вось як апісвае адну з гульнёвых варожбаў на Палессі Мінскай губерні фальклярыст А. Шыманскі ў 1898 годзе:

"Дзяўчаты адыходзяць ад кастра не гаворачы, не аглядваючыся і не смеючыся. Яны накіроўваюцца да таго месца, дзе расце трава прыпутнік. Прайшоўшы, яны лягаюць на зямлю і зубамі рвуць гэтую траву, прамаўляючы:

Прыпутнічку, прыпутнічку!
Сядзіш ты пры дарозе.
Відзіш старога і маладога,
Ці не бачыў майго мілога?

Сарваўшы прыпутнік, дзяўчаты, не гаворачы і не аглядваючыся, вяртаюцца дадому, кладуць прыпутнік сабе пад галаву ў ложак, тады мілы абавязкова прысніцца".

Распальванне вогнішча і кола

Вогнішчу ці агню ў Купаллі прыдавалася вялікае значэнне. Раней праводзілі абрад здабывання "жывога" агню пры дапамозе трэння. Вогнішча на 6 ліпеня, куды скідалася ўсё старое, было ў цэнтры святкавання. На ім рыхтавалі абрадавыя стравы, ля яго вадзілі карагоды, праводзілі гульні.

У купальскіх песнях распавядаецца, што "Не дзеўка агонь клала, Сам Бог агонь раскладаў", "Святое Пятро ў поле ходзіць, Святы Купала агонь кладзе", "Ой, месяцу, месяцу, узыдзі раненька і раскладзі купаллейка". Галавешкай ад вогнішча можна было выгнаць ведзьму з жыта і прагнаць іншую пачварную сілу.

Над купальскім вогнішчам высока на жэрдцы ўздымалі запаленае кола. Звычайна яго бралі са старога воза, прасмальвалі або аблівалі дзёгцем, каб ярка гарэла. Згарала адно — ладзілі другое. Вакол купальскага вогнішча вадзілі гульнёвыя карагоды, спявалі песні. Палаючае кола таксама пускалі ўніз з узгорка.

У звароце нашых продкаў да агню, як і іншых індаеўрапейскіх народаў, выкарыстанні адпаведнай сімволікі даследчыкі бачаць абрадавае адлюстраванне салярных (сонечных) матываў, "прадуцыравальны і ачышчальна-ахоўны пачатак".

Збіванне конскай галавы

Знойдзены чэрап конскай ці каровінай галавы ўмацоўвалі на шост або на галіну, якая звісала над купальскім вогнішчам. Калі яно добра разгаралася, то прысутныя кідалі ў галаву палкамі, камянямі, камякамі зямлі, стараючыся збіць яе ў агонь. Пры гэтым выконвалася рытуальная песня:

— Купала, Купала,
Дзе ж ты зіму зімавала?
Дзе ж ты лета летавала?
— Зімавала ў пырэйку,
Летавала ў зеллейку...

— А мы прыйдзем рваць траву
І цябе, Купала, выганім.
— Я зімавала ў крыніцы,
А лета правяду ў пшаніцы.

Запісы гэтай рэдкай купальскай забавы былі вядомы толькі ў Кобрынскім павеце ў мінулым стагоддзі. Даследчык быту і фальклору ўсходніх славян Дз. Зяленін выказваў меркаванне, што яна магла прыйсці з Захаду разам з Русаллямі, дзе конь адлюстроўвае дух расліннасці.

Лялька Купала

Купальскі звычай вырабу і спальвання або таплення лялькі праводзілі напярэдадні свята або ў час яго.

Вось як апісвае звычай этнамузыказнавец Г. Таўлай: "У вёсцы Збураж Маларыцкага раёна і зараз напярэдадні свята збіраюцца ў хату дзяўчаты і жанчыны з усёй вёскі. Кожная нясе што-небудзь з адзежы ці ўпрыгожанняў для вырабу лялькі: хто — пацеркі, хустку, хто — фартушок, вядро. Гаманлівы і вясёлы выраб лялькі Купалы надта просты, калі паўтараеш адно і тое ж з году ў год: змацоўваюць накрыж дзве жардзіны, верхняе скрыжаванне — гэта рукі, ніжняе —

ногі, абкручваюць іх рознымі анучамі, апранаюць ляльку, як сапраўдную паляшучку. Затым робяць галаву, фарбамі малююць рот, нос, вочы, надзяюць хустку, вянок на галаву, чапляюць ленты, вядро на руку: гэта "Купала нясе малокі". Удзельніцы святочнай працэсіі надзяюць свае лепшыя кашулі, андаракі з фартухамі, якія пераліваюцца ўсімі колерамі палескага разнаквецця. Ляльку Купалу ўзнімаюць высока над галовамі, а за ёю грамадою ідуць людзі, прыпыняючыся каля кожнай хаты з песняй, у якой называюцца імёны гаспадароў:

Сергеёва Матруна
На Купаллі не була.
То-то ведзьма була,
До Кыёва лятала
На Йвана.

Смеючыся і выкрыкваючы жартаўлівыя выслоўі, гаспадыня далучаецца да святочнага шэсця, якое накіроўваецца да лесу. На ўскрайку выбіраюць самую вялікую елку. "Хлопцы высока, у расухі тыя лялька пакладуць, а яна гарыць! А мы ўжо кругом хвоі той ходзім і пяём купалы", — расказвае Л.А. Пугач".

Існавалі і іншыя звычаі. У вёсцы Люсіна Ганцавіцкага раёна зафіксаваны традыцыйны выраб дзвюх лялек: хлопца і дзяўчыны, якіх таксама спальвалі на дрэве. У паўночных раёнах ляльку называюць Мар'яй, у некаторых паўднёвых — ведзьмай. Пры спальванні або патапленні яе амаль усюды называюць ведзьмай, чараўніцай ці русалкай. У палякаў, чэхаў, славакаў, украінцаў ляльку называлі яшчэ Марэна, Марына, Мара, Смерць. Даследчыкі звязваюць гэты звычай з рытуаламі выгнання смерці (слова "мор" — чума). Спальванне старызны на Купалле — таму пацвярджэнне.

Алесь Лозка

ПЕСНІ

Сягоння Купалле на Яна...





Сягоння Купалле на Яна,
Дзевачкі зелле збіралі.

Дзевачкі зелле збіралі,
У старога дзеда пыталі:

— Што гэта, дзедка, за зелле —
Чорныя галоўкі насення?

А дзедка зелля не пазнаў
Ды да караля адаслаў.

Каралеўна зелле пазнала,
Яна дзевачкам сказала:

— Дзявочае умыванне,
Кавалерскае каханне.

(Мінская вобл. Зап. у Лагойскім р-не)

Тыпэр Купала, а заўтра Ен



Тыпэр Купала, а заўтра Ен. (2)
Пошлы, дэвочкі, ў зэлёны гай. (2)
Ў зэлёны гай гарду рваты, (2)
Хлопчыкам доўга Пытра ждаты. (2)
Дэвочкі гарды не нарвалы, (2)
Хлопчыкі Пытра не дождалы, (2)
Ў Пытрыўку сала покушталы. (2)

(Мажэйка, 1983. Зап. у в. Корсунь Драгічынскага р-на)

Святое Пятро ў поле ходзе



Святое Пятро ў поле ходзе,
Святы Купала агонь кладз[е].

Ходзем, дзяўчаткі, на Купалу,
Ходзем, сястронкі, агонь класц[і].

Ходзем, сястронкі, на мяжыцы
Пільноваці жыто й пшэніц[ы].

Пільноваці жыто й пшэніцы
Ад тэе ведзьмы-чароўніц[ы].

Каб яна по межах не ходзіла,
Раннія росы не обівал[а].

Раннія росы не обівала,
З жыта спору не збірал[а].

(Мажэйка, 1983. Зап. у в. Спорава Бярэзінскага р-на)

Да купална ночка невелічка



Да купална ночка невелічка,
Да не выспаласа дзевочка.

Ягодкі брала, дрэмала,
А перэбірала, заснула.

А перэбірала, заснула,
Прыехаў жэнішок, не чула.

Хусткаю махнуў, не дамахнуў,
Да злез з коніка, прабудзіў:

— Стань, моя мілая, доўга спіш,
Чым свою свякроўку падарыш?

— Подару свякроўку, подару,
Ў новые сенечкі перэйду.

Ў новые сенечкі перэйду,
Ў рукаў золота набяру.

Ў рукаў золота набяру,
Я свою свякроўку подару.

(Мажэйка, 1987. Зап. у в. Выганішча Івацэвіцкага р-на)





СВЯТА МЁДУ

Мядовік (Мядовы Спас) — 14 жніўня ў праваслаўных і католікаў. У календары адзначаюцца і іншыя дні, звязаныя з мёдам і пчоламі.

ЗВІНІЦЬ-ГУДЗЕ МАЛЕНЬКАЯ ПЧАЛА

У народзе са старажытных часоў кажуць: "Працавіты, як пчала". І сапраўды, гэтыя малюсенькія стварэнні працуюць надзіва многа. Толькі і чуваць над квітнеючым садам ці над грэчкавым полем бесперапынны гуд: пчолы збіраюць мёд — бессмяротны напітак міфічных багоў, які надаваў ім цудадзейную сілу і выносліваць, а таксама дзіўную працягласць жыцця. Сярод вяскоўцаў да нашых дзён захаваліся паасобныя адбіткі пакланення пчолам, ці, як іх яшчэ называлі, "боскім істотам".

У гэтых адносінах вельмі характэрны раздзел "Падгляд пчол" у паэме Якуба Коласа "Новая зямля". У ім даецца апісанне збору мёду на пасецы галоўнага героя твора Міхала. Прачытаўшы гэтае месца паэмы, не можаш не задаць пытанне: "Навошта было гаспадару на гэты момант збіраць сваіх суродзічаў, наладжваць з гэтага выпадку для іх баль і, самае галоўнае, дзяліць між імі мёд?" Прычым робіць гэта не сам гаспадар, а адзін з яго гасцей. Адказ на яго вядзе нас яшчэ ў родаваабшчынны лад, калі ўсё, у тым ліку і борці, было ў агульным уладанні родаў і ўсё здабытае і сабранае, таксама і мёд, дзялілася паміж членамі роду. І як гэта ні дзіўна, такі архаічны звычай змог захавацца ў асяроддзі панямонскіх беларусаў аж да пачатку XX стагоддзя і пад пяром Я. Коласа перарос у мастацкую карціну аднаго з самых светлых помнікаў нялёгкага сялянскага жыцця.

Болей таго, у Статуце Вялікага княства Літоўскага за 1588 год у раздзеле дзесятым ажно чатыры артыкулы прысвечаны борцям, бортным дрэвам і самім пчолам. Вось пра што там гаварылася: "Хто б пашкодзіў чужое бортнае дрэва з пчоламі, хвою, ці дуб, ці іншае бортнае дрэва, корань ля зямлі падсек, ці агнём падпаліў, ці хто-небудзь выпадкова ненаўмысна пашкодзіў, той за кожнае дрэва з пчоламі павінен будзе заплаціць па дзве капы грошай, а за пашкоджанае дрэва без пчол — капу грошай, за прызначанае пад борць дрэва — паўкапы грошай. А хто б сілаю, прымусова выцясняў каго-небудзь з зямлі ці з адвечных уваходаў, ці таксама зладзейскім намерам абсек ці падпаліў бортнае дрэва, ці адзнакі высек або агнём выпаліў і гэта было даказана, тады павінен заплаціць гаспадару за борць з нявыбраным мёдам — тры рублі грошай, за дрэва бортнае, у якім раней пчолы былі, хоць яно і без пчол, але пашкоджанае, — па дзве капы грошай, за вырабленае на борць дрэва, дзе пчол яшчэ не было, — капу грошай, а за ствол без борці, колькі б іх ні пашкодзіў, — за кожны па паўкапы грошай" (артыкул 13).

А вось пра што гаварылася ў артыкуле 14: "Калі хто-небудзь выдраў у каго-небудзь іншага пчол з нявыбраным мёдам, але дрэва не пашкодзіў, то абавязаны заплаціць за кожную пчаліную сям'ю дзве капы грошай. Калі б хто ў каго ля дома, ці на пасецы, ці ў лесе на дрэве, з вулля ці са зробленага для іх дупла пчол выдраў ці з вуллем разам забраў і даказалі капою ("капа" — не толькі грашовая адзінка, але і суд; на "копны суд" збіраліся прадстаўнікі некалькіх бліжэйшых населеных пунктаў, каб вырашыць неадкладныя надзённыя пытанні, у тым ліку і пра пакражу пчол; так, з архіўных дакументаў вядома, што ў в. Чухава Пінскага раёна (сучасны падзел. — *А.Н.*) у 1646 годзе збіралася капа ў лютым, каб разгледзець справу аб пакражы пчол з пасекі бацюшкі, які жыў у суседняй вёсцы (Новы Двор. — *А.Н.*) ці якім следствам, тады павінен заплаціць тры рублі грошай, за выключэннем таго, каго злавілі з пакражаю, такога, як злодзея, павінны прыгаварыць да смяротнага пакарання (выдзелена мною. — *А.Н.*). А калі хто-небудзь у чыім-небудзь лесе наўмысна пасек і мёд выбраў, то за гэта павінен заплаціць шэсць рублёў грошай".

Як бачым, вельмі строга і пільна ахоўваліся правы людзей, якія валодалі борцямі, і, з другога боку, вельмі ж суровым было пакаранне за разбурэнне борцяў ці пакражу мёду, бо тры ці шэсць рублёў — гэта занадта вялікія грошы для таго часу. А каго злавілі на месцы злачынства, чакаў смяротны прысуд. Нічога не зробіш. Нашы продкі жылі па сваіх законах.

Менавіта на Беларускім Палессі ўзнік своеасаблівы лясны промысел, які, дзякуючы шырокаму распаўсюджанню і велізарнаму эканамічнаму значэнню, прадвызначыў на некалькі стагоддзяў характар развіцця гэтага ляснога краю. Промысел атрымаў назву "бортніцтва" (ад слова "борць" — штучна выдзеўбанае ў дрэве дупло для пчол) і быў заснаваны на развядзенні і ўтрыманні лясных пчол — баровак у штучных дуплах — борцях.

(Ненадавец, 1993. С. 260—262)

З этнаграфічнай спадчыны Аляксандра Сержпутоўскага

Сябрына. Па назіраннях Сержпутоўскага, сябрына ў Беларусі ў многім абапіралася на сумеснае вядзенне гаспадаркі, у прыватнасці пчалярства, бо пчолы часта пераляталі раямі ад аднаго селяніна да другога. Палешукі лічылі гэта праяўленнем боскай волі. Ды і пчалу называлі палешукі свяшчэннай істотай, якая дае воск для царкоўных свечак. Таму сябрына, заснаваная на сумесным бортніцтве, лічылася самай моцнай.

Існаваў на Палессі выдатны звычай — адорваць маладых пчалінымі вуллямі. Такім чынам госці і маладыя гаспадары станавіліся сябрамі.

Сябрына ўстанаўлівалася і ў выпадках, калі ад падораных на вяселлі каровы, авечкі ці кабылы атрымліваўся прыплод, у такім разе гаварылі: "Ідзе ў руку".

"Хаця пры ўстанаўленні сябрыны ніякіх спецыяльных абрадавых дзеянняў не праводзяць, — зазначаў Сержпутоўскі, — але з моманту яе з'яўлення сябры звяртаюцца адзін да другога на "вы", а не на "ты", як прынята гэта паміж чужымі людзьмі". З такой павагай звярталіся палешукі толькі да бацькоў, старэйшых па ўзросце, родзічаў і самых блізкіх сяброў і таварышаў.

Кожны чалавек лічыў для сябе свяшчэнным абавязкам дапамагчы сябру ў бядзе. Вялікім грахом было пакрыўдзіць сябра, прычыніць яму зло. Сварка паміж сябрамі — ганьба для абодвух.

У час урачыстасцей сяброў саджалі на самае ганаровае месца, удзялялі ім шмат увагі. Сябры часта выступалі ў ролі дарадцаў, абаронцаў перад грамадскімі і дзяржаўнымі інстанцыямі. Нездарма гаварылі, што часам ад сябра хутчэй атрымаеш дапамогу, чым ад родзіча. Адсюль з'яўленне прыказак і прымавак: "Многа сваіх, ды чорт на іх, а сябар — божы сваяк", "Часам ад свайго помачы не чакай, хіба ў сябра папытай".

Кожны прадбачлівы беларус пры ўсякім зручным выпадку стараўся займець як мага больш сяброў у сваёй і ў суседніх вёсках. Ведалі: сябар дапаможа ў цяжкую хвіліну жыцця, пусціць пераначаваць і прыме як самага дарагога госця. "Не май асьмакоў, а май многа сяброў — век пражывеш і з голаду не памрэш", — гаварылі старыя.

Бонда. Старажытны звычай беларусаў дзяліцца з суседзямі здабыткамі сваёй працы — мясам, рыбай, мёдам, садавінай, гародніной — знайшоў адлюстраванне ў нарысе Сержпутоўскага "Бонда"[1]. Згодна з народнымі ўяўленнямі, таго, хто не падзеліцца з іншымі "бондай", або "бондачкай", будуць праследаваць няшчасці.

Гэты звычай распаўсюджваўся і на жывёлу.

Бортніцтва. Важнай крыніцай для здабывання сродкаў да існавання з'яўлялася для беларуса-палешука лясное пчалярства — бортніцтва. У сваёй рабоце "Бортничество в Белоруссии"[2] А. Сержпутоўскі падра-

[1] Живая старина. 1907.

[2] Материалы по этнографии России. СПб., 1914. Т. 2. С. 13—34.

бязна спыняецца на гэтым нялёгкім промысле, прыводзіць цікавыя звесткі з гісторыі яго ўзнікнення, пралівае святло на сацыяльныя рысы сялянскіх узаемаадносін, якія яскрава праяўляліся пры сумесным здабыванні мёду.

З даўніх часоў палешукі па тых ці іншых прычынах (адкрыта гаварыць, што гэта былі за прычыны, аўтар, вядома, не мог) забіраліся ў глухія лясы, за непраходныя балоты і засноўвалі там новыя паселішчы. У той час у лясах вадзілася многа пчол і бортніцтва прыносіла нядрэнны даход.

Сяляне ставілі на борцях свае знакі, тым самым аб'яўлялі сябе ўласнікамі пчаліных сем'яў. Гэтыя няпісаныя законы строга выконваліся палешукамі. Забраць мёд з борці суседа лічылася вялікім злачынствам. Вінаватага сяляне маглі пакараць фізічна, але самым ганебным з'яўлялася мянушка "пчаладзёр", якая пераходзіла і на яго дзяцей.

На думку беларусаў, пчолы добра водзяцца толькі ў самых сумленных людзей, таму кожны пчалавод у час работы каля борцяў лічыў за правіла памірыцца з суседам, не думаць пра яго дрэнна.

У ролі прымірэнцаў часта выступалі пчолы. Варта было рою аднаго суседа пасяліцца ў вуллі другога, як тыя з ворагаў ператвараліся ў сяброкоў, лічылі ўчынак пчол боскай воляй.

Часта борцямі карысталіся некалькі чалавек разам. Збор мёду ператвараўся ў свята для ўсяго паселішча.

Памешчыкі нейкім чынам даведваліся пра такія паселішчы і сілай ператваралі сялян у сваіх падданых. Уласнасць палешукоў, у тым ліку і борці, пераходзіла ва ўласнасць памешчыкаў. Па гэтай прычыне бортніцтва паступова выраджалася на Палессі.

Другой прычынай выраджэння бортніцтва было знішчэнне лясоў для прамысловага выкарыстання.

Умоўныя знакі ўласнасці ставілі палешукі і на іншых прадметах, якія не з'яўляліся агульнай уласнасцю. Убачыць селянін свабодны кавалачак сенакосу, дрэва, якое можа спатрэбіцца яму для пэўнай справы, і тут жа ўбівае побач калок, абвязвае яго вяхоткай з травы. З гэтага моманту тут не можа гаспадарыць ніхто іншы.

(Касько, 1997)

ПЧАЛА

Пчала ў народных павер'ях усходніх славян — сімвал урадлівасці, памнажэння роду; пчала — зброя бога Ярылы, які абуджае зямлю; звязаны пчолы і з Белуном — духам жніва. У народных легендах паходжанне пчол тлумачыцца праяўленнем волі Бога: "Бог даў людзям пчалу і сказаў, што яна будзе найлепшая казюлька для людзей, што яе ўсе будуць любіць і паважаць". У міфалогіі многіх народаў пчала заўсёды выступае на баку Бога, супраць злога духа. Пчалярства ў старажытнасці разглядалася не толькі як занятак, роднасны Богу, але і такі, які з'яўляецца выкананнем боскай волі, справай, заве-

шчанай чалавеку для выратавання душы. Пчала і яе прадукт — мёд, які ўплывае на жыццядзейнасць і здароўе чалавека, заканамерна суадносяцца з вясельнай абраднасцю. Так, адно з распаўсюджаных пажаданняў маладой на балгарскім вяселлі — *Да се руши, като пчелата*! (Каб ты пладзілася, як пчала!) Балгарам было вядома таксама абмазванне мёдам парога ў час вяселля, калі маладыя ўваходзілі ў дом жаніха. На Украіне маладая прывозіла з дому на талерцы хлеб і мёд, якія ставіліся ў каморы, дзе маладыя праводзілі шлюбную ноч. На наступны дзень гэты хлеб з мёдам ("мазанкі") раздаваўся ўсім прысутным з пажаданнямі здароўя і дзетараджэння.

Характэрна, што да пчол у многіх выпадках адносіліся так, як і да людзей: пра пчалу гаварылі, што яна памерла (а не здохла); з пчоламі віталіся, віншавалі з Пасхай, ім паведамлялі аб смерці гаспадара. Дзень першага вылету пчол звычайна звязваўся з днём святога Засімы (або Засімы і Савацыя) — 30 красавіка. У рускіх вёсках раней у гэты дзень вывозілі вуллі на пчальнікі. Пасярэдзіне пчальніка ставілі стол, пакрыты чыстым абрусам, на яго — хлеб і соль, гаршчок з вуголлем, асвечаную ваду і велікодную свечку. Памаліўшыся Засіму і Савацію, абыходзілі вакол пчальніка з запаленай свечкай, апырсквалі яго асвечанай вадой, прамаўляючы замову: "Полети, моя пчела, на все четыре стороны, за желтыми восками, за сладкими медами, приноси мед в свои ульи. Как осетр-рыба бежит в море, так моя бы пчела ко мне, рабу божию, летала на пасеку..."

(Коваль, 1995. С. 127—128)

БОРТНІЦТВА

Бортніцтва — найбольш старажытная форма культурнага пчалярства, заснаванага на развядзенні і ўтрыманні пчол у борцях — штучных дуплах, выдзеўбаных у дрэвах. Развіўшыся з "дзікага" пчалярства, калі чалавек задавальняўся мёдам са знойдзеных гнёздаў лясных пчол, бортніцтва шырока распаўсюдзілася і на працягу шэрага стагоддзяў задавальняла патрэбы славян, у тым ліку і беларусаў, у мёдзе, а таксама такіх прадуктах пчалярства, як воск і пропаліс.

Паступова бортніцтва замяняецца калодачным, а пасля вынаходства П.І. Пракаповічам у 1814 г. рамавага вулля — рамавым пчалярствам. Калодачнае пчалярства ўспрыняло ранейшую назву і доўгі час называлася бортніцтвам. Абумоўлена гэта было тым, што выраб калоды, спосаб догляду пчол, бортны інструмент і тэрміналогія засталіся ранейшымі. Розніца заключалася толькі ў адным: борць выдзёўбвалі ў жывым дрэве, а калодачны вулей — у спілаваным.

У першапачатковай, так званай чыстай, форме бортніцтва цяпер — рэліктавы від пчалярства і сустракаецца спарадычна, у той час як калодачнае яшчэ бытуе на Беларусі паралельна з рамавым.

Бортніцтва выпрацавала спецыфічныя прылады і прыстасаванні, якія без істотных змен, пад рознымі назвамі або ў іх варыянтах вядомы на ўсёй тэрыторыі рэспублікі.



Мал. 13. Стайліна *(а)*, стайліна з астраўкамі *(б)*, борць *(в)*, папярочны і падоўжны разрэзы борці *(г)*

Бортная тэрміналогія ў беларусаў, украінцаў і палякаў не мае істотных адрозненняў. Гэта сведчыць аб тым, што бортніцтва ўзнікла ў перыяд агульнаславянскага адзінства.

Борць (барць, бартак, бордзь, боруць) — вулей-дупло, выдзеўбаны ў жывым дрэве, пераважна хвоі, дубе, ліпе, асіне (мал. 13, *в*). Камера борці мае цыліндрычную або трапецападобную форму.

У борці вылучаюць галаву (шапку), дзе знаходзіцца рой, сярэдзіну, дзе размяшчаюцца соты, і подак (пята, дно, под), куды ападаюць прадукты жыццядзейнасці пчол і пры неабходнасці ставяць падкормку (падкармячку).

Доўжня (даўжнік, доўж, лазейка, тварка, века) — прамавугольная адтуліна памерам 60×14 см, праз якую бортнік мае доступ у сярэдзіну борці пры доглядзе пчол і падрэзцы мёду.

Доўжань (длужня) — дубовы брусок са скошанымі краямі, якім закрываецца доўжня. Доўжань старанна дапасаваны да памераў доўжні. У некаторых раёнах доўжань робяць з дзвюх частак — верхняй і ніжняй.

Снет (снед, сняток) — дубовая дошка, якой дадаткова закрываецца ўваход у борць. Прымацоўваецца да ствала дрэва або корпуса калодачнага вулля паверх доўжаня пры дапамозе драўляных пальцаў.

Ляток (лётка, лётва, вока) — невялікая круглая адтулінка для вылету пчол.

Крыжачок (грабёнка) — прыстасаванне са скрыжаваных або паралельных планак, на якіх мацуюцца соты.

Знамя (знак, кляймо) — высечаная на дрэве каля борці метка, якая вызначала прыналежнасць бортнага дрэва таму ці іншаму гаспадару (мал. 14). У аснове кампазіцыі знамёнаў ляжаць розныя геаметрычныя матывы:



Мал. 14. Знамёны

спалучэнне трохвугольнікаў, кольцаў, дужак і г. д.

Бортнае дрэва называлася **стайліна** (мал. 13, *а*). У лесе, на палявых межах, на старых могілках, а часам і на сялянскіх сядзібах яшчэ і цяпер можна знайсці стайліну. Дрэва з дзвюма борцямі называлі блізняком, з трыма — маткай, з чатырма — каралевай. Хваёвыя стайліны звычайна былі крамлёнымі — са ссечанай вяршыняй (шчыкам). Такое дрэва разрасталася ў таўшчыню і набывала большую ўстойлівасць супраць ветру. Кожная стайліна, якая захавалася да нашага часу, з'яўляецца надзвычай каштоўным помнікам матэрыяльнай культуры.

Калода (корань, каранёк, каранік, даўбяк, наварацень) — вулей, выдзеўбаны ў дубовай або хваёвай калодзе (мал. 15). Тэхніка вырабу, назвы частак і іх дэталяў такія ж самыя, як і ў борці. У некаторых раёнах іх дагэтуль называюць борцямі.



Мал. 15. Калоды: стаякі *(а, б)*, ляжак *(в)*

Па спосабу ўстаноўкі адрозніваюць два віды калодачных вулляў: стаяк (мал. 15, *а, б*) і ляжак (лежань ; мал. 15, *в*). Першы ўстанаўліваюць вертыкальна, другі — гарызантальна або пад вуглом каля 45° адносна паверхні зямлі.

Станавіска — падстаўка, на якой устанаўліваюць вуллі-стаякі.

Вабік (доўбанка, раёўнік, настаўка, навузнік, навужнік, стаўбун, стаўка) — вулей для прывабліванне пчаліных раёў. Знешнім выглядам і формай нагадвае калодачныя вуллі, але значна меншы за іх. Вабікі рэдка выдзёўбваюць, часцей іх робяць з яловай кары або лубу. Устанаўліваюць на дрэвах, у садах і на лясных ускраінах.

Поруч з калодамі бытавалі плеценыя вуллі, але шырокага распаўсюджання не атрымалі з прычыны таго, што саламяныя і лазовыя вуллі неабходна на зіму пераносіць у спецыяльнае памяшканне.

Саламянік — вулей, сплецены з моцна скручаных саламяных жгутоў, перавітых па вертыкалі расшчэпленымі дубцамі лазы-малакіты. Як і калодачныя вуллі, бытавалі ў дзвюх формах. Стаякі мелі выгляд цыліндра або ўсечанага конуса, лежакі нагадвалі куфры з пукатым векам (мал. 16).

Пры добрым медазборы, калі мёд не змяшчаўся ў асноўным корпусе саламянага стаяка, яго можна было павялічыць надстаўкай. Цыліндрычныя і канічныя саламяныя вуллі накрываліся канічнай



Мал. 16. Саламяныя вуллі: стаякі *(а, б)*, ляжак *(в)*, шапка стаяка *(г)*, падстаўка стаяка *(д)*



Мал. 18. Подкур з самабіткамі і астроўкамі



Мал. 17. Лязіва: у зборы *(а, б)*, казёл *(в)*, сядзёлка *(г)*, тэхніка пляцення лязіва *(д)*

накрыўкай. На вялікіх пасеках саламяныя вуллі размяшчалі ў некалькі ярусаў у паветках з адной або трыма сценкамі.

Лазовы вулей — вулей з неакараных лазовых дубцоў, выкананы ў тэхніцы рабрыста-спіральнага пляцення. Сценкі такога вулля абмазвалі глінай.

Саламяныя і лазовыя вуллі на зіму пераносілі ў рублены імшанік або абмазаную глінай лазовую мурню. Калодачныя вуллі зімавалі звычайна на пасеках.

Лязіва (лазіва, лазня, ліна, ліня, плець, жэнь) — прыстасаванне, якое выкарыстоўваў бортнік, калі ўзбіраўся на бортнае дрэва (мал. 17). Асноўная частка лязіва — сплеценая з пяці палосак сырамяці або канапель вяроўка (даўжыня 25—30 м) з сядзёлкай (сядзелка, крэсла, лязвеня) на адным і драўляным крукам або пятлёй на другім канцы. Паміж імі, бліжэй да сядзёлкі, знаходзіцца казёл — прыстасаванне з бярозы-



Мал. 19. Кадолы: з колам *(а)*, з калаўротам *(б)*



Мал. 20. Матачнікі



Мал. 21. Бортны інвентар: сятчаты матачнік *(а)*, скамы *(зверху)*, клінок *(знізу) (б)*, сітак *(в)*

чаготкі для рэгулявання лязіва. У XV—XVI стст. лязіва плялі з лыка.

Подкур (падкур, адзёр, адонак, пасцель) — памост з тоўстых дошак (тарчыц) вакол дрэва з вострымі драўлянымі спіцамі да 1 м (мал. 18). Бараніў борці, а пазней і калодачныя вуллі ад мядзведзяў. Узлазілі на подкур па астроўках — яліне з коратка абцятымі сукамі.

Самабітка — дубовая калода, радзей камень, што вешалі ўздоўж ствалоў дрэў для абароны борцяў ад мядзведзяў.

Кадол — прыстасаванне з кола або вората і вяроўкі для пад'ёму калодачных вулляў на дрэвы (мал. 19).

Пырскач — помпа (драўляны цыліндр і поршань). Выкарыстоўваўся для апырскання рою.

Ройніца (раёўніца, раёўня, райніца, ройнік, лупка, каробка, каробачка) — лубовы посуд з палатняным донцам для збірання і пераноскі рою.

Матачнік (матачніца, рашотка, рашатня) — квадратная, круглая або авальная драўляная каробачка на ручцы ці без яе, з кратаванымі сценкамі і вечкам (мал. 20). Выкарыстоўвалася для ўтрымання маткі.

Скамы (ціскі, клешчы) — прыстасаванне для выціскання мёду пры дапамозе кліноў (мал. 21, *б*).

Сітак (сіта, сітца, сетка, каробачка) — прыстасаванне для аховы твару, галавы і плеч бортніка ад укусаў пчол (мал. 21, *в*). Складаецца з лубяной каробачкі з нацягнутай валасяной сеткай і паўкруглага кавалка палатна — капюшона.



Мал. 22. Бортны інструмент: цясла *(а)*, скобка аднаручная *(б)*, лапацень *(в)*, пешні *(г)*, размер *(д)*, рэзічка *(е)*, барта *(ж)*

Зубель (курэль, курач, курадымка) — палачка з накрыж расшчэпленым канцом, у які заціскалі курашку — гнілушку або скручаную анучу. Выкарыстоўвалася для акурвання пчол.

Дымакур (дымар) — прыстасаванне з паддувалам для акурвання пчол.

Лазьбень (лубачка) — лубяны посуд з падвойным дном і прапушчанай пад ім вочапкай. Служыла для складвання мёду пры падглядзе пчол.

Кадаўб (кайдуб, калдуб, кадаўба) — выдзеўбаная з дрэва ёмістасць для працяглага захоўвання мёду.

Дуплёнка (дуплянка) — дзежачка для захоўвання мёду.

Ліпаўка (ліпечня, лазобка, лубка, мядоўка) — выдзеўбаная з ліпы бочачка з устаўным дном і вечкам для захоўвання мёду.

Берастоўка — бочачка з бяросты з драўляным донцам і вечкам для непрацяглага захоўвання мёду.

Барта (барда, серка, гак) — сякера з шырокім лязом і кароткім тапарышчам, ужывалася пры вырабе борці (мал. 22, *ж*).

Рэзічка (нож-медарэз) — нож для падрэзкі верхніх пластоў мёду пры падглядзе пчол (мал. 22, *е*).

Пры вырабе борцяў ужываліся таксама такія плотніцкія інструменты, як пешня, цясла, скобка аднаручная, лапацень, размер.

(Гуркоў У., Цярохін С. Помнікі этнаграфіі, 1981)

ПЧАЛА ЯК СІМВАЛ ПРАЦАВІТАСЦІ

Дабрабыт і шчасце кожнай сям'і трымаліся на працы. Працавітасць была асноўнай рысай, за якую цанілі чалавека. Гэтым жа правілам кіраваліся і пры выбары нявесты, таму што ў сям'ю бралі працаўніцу, памочніцу, гаспадыню. А калі гаспадар не гультай, не п'яніца, не абібок — самая вялікая сям'я жыла ў адносным дастатку (вядома, калі была зямля). Падрасталі дзеці — таксама ўключаліся ў працу. Так і не перарывалася эстафета працавітасці на працягу стагоддзяў. І толькі ў часы сталіншчыны і калектывізацыі праца была прыніжана і зняважана. Руплівыя працаўнікі гінулі ў лагерах, у высылцы, праслаўляліся "пралетарыі", г. зн. абібокі і гультаі. Яны не маглі ці не хацелі наладзіць уласную гаспадарку, а іх ставілі на чале калгасаў.



Мал. 23. В. Мурзіч. Посцілка з матывамі пчалы



Мал. 24. М. Аляксейчык. Матыў пчалы ў вышыўцы. Татарка Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.

Стымулу да добрай працы не было, людзі гнулі спіну на калгасных палетках за нішто. Вынікі такой "гаспадарлівасці" мы пераадолеем яшчэ не хутка.

Услаўляючы працавітасць і руплівасць, нашы продкі знайшлі іх вельмі дакладны сімвал у прыродзе. Гэта — пчала, вечная і нястомная працаўніца. Не дзіва, што сілуэт пчалы так часта ўплятаецца ў дэкор посцілкі ці ручніка.

Аллюстраванне гэтага сімвала бывае розным. На сучасных посцілках з іх паліхромнымі яркімі раслінными матывамі пчолы паказваюцца досыць натуралістычна і пазнавальна. На старадаўніх вырабах з іх умоўным геаметрызаваным дэкорам матыў пчалы набывае вельмі вобразнае, абагульненае, сімвалічнае значэнне, нагадваючы арнаментальны матыў (мал. 23). Часам ступень стылізацыі настолькі значная, што назву матыву ведае толькі сама ткачыха.

Сімвалам працы называлі ткачыхі і матыў у выглядзе ромба з ёлачкападобным узорам унутры (мал. 24). Сёння цяжка ўстанавіць,

Мал. 25. А. Крачэўня. Сілуэты пчол на ручніку



Мал. 26. Н. Абушкевіч. Сімвал пчалы ў дэкоры ручніка



ці гэта старажытны, моцна стылізаваны сімвал пчалы, ці ў яго нейкае іншае паходжанне. Радком пчаліных сілуэтаў аздобіла свой ручнік А. Крачэўня (Любча Чарнігаўскай вобл.; мал. 25), а таксама Н. Абушкевіч (Беліца Сенненскага р-на Віцебскай вобл.; мал. 26).

(Кацар. С. 164—166)

ЛЕГЕНДЫ

Пчала

Бог даў людзям пчалу і сказаў, што яна будзе найлепшая казюлька для людзей, што яе ўсе будуць любіць і паважаць. Пчала ад радасці дужа зачванілася і кажа:

— Каго я ўкушу, той памрэць.

А Бог тут зазначыў:

— Не! Не той памрэ, каго ты ўкусіш, а сама перастанеш жыць.

І вось цяпер усе пчалу любяць як найлепшую і найкарыснейшую казюльку. А яна, як толькі каго ўкусіць, зараз жа і ўміраець.

(Сахараў, 1944. Зап. у 1926 г. у в. Мураванка Букмуйжскай воласці, Латвія)

Пра пчолы

Стварыў Бог чмялёў, а чорт пчол. Бачыць Бог, што мала ў яго толку і прыбытку: рой увесь у яго разляціцца куды ні пападзі, дый мёду няма. Зайшоў ён да чорта паглядзець, што ў яго дзеецца. Той пакарміў яго мёдам. Спадабаўся Богу мёд, і яму завідна стала.

— Будзем, — кажа ён чорту, — мяняцца.

Чорт, зразумела, не згадзіўся.

— Ну, дык добра, — кажа Бог. — Бачу, што з табою нічога не зробіш, дык саступі мне хоць адну пчалу.

Падумаў, падумаў чорт дый згадзіўся. Бог узяў ад чорта пчалу, дунуў на яе, і зрабілася яна маткаю. Запела матка, зазвінела і пачала ўздымацца ўверх. Пчолы ўсе ўзняліся за ёю дый паляцелі. Вось чорт і застаўся ні з чым, а ў Бога — і мёд і воск.

(Шэйн, 1893. Зап. у Невельскім пав. Віцебскай губ.)

ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І

Паданне пра Перуна і бога грому жыве яшчэ і цяпер; гэта відаць з наступнага забабона, звязанага з хрысціянствам: дзеля таго, каб вяліся пчолы, трэба з разбітага громам дуба зрабіць крыж і паставіць на пасецы.

Косич, с. 33

Найлепей ставіць калоды пад платамі там, дзе глухая крапіва расце, бо яна ахоўвае пчол як ад звычайных хвароб, так і ад насланых.

Fed., s. 356

Пчолы водзяцца толькі ў добрага чалавека, а ліхога не любяць.

Каб пчолы добра вадзіліся, трэба падкурваць іх тым воскам, які застаўся ад згарэўшае ў цэркві свечкі.

Калі ў пчальнік выліць тую ваду, у каторай мылі змарлага, то ўсе пчолы прападуць...

Ліхія людзі абмазваюць вочка ў вуллі тарпатынам. Ад таго пчолы пакідаюць свой вулей і садзяцца ў другі.

Е такія ліхія людзі, што яны насылаюць на вулей чужых пчол, і тыя забіраюць увесь мёд.

Калі двое чужых людзей вельмі ў ладу жывуць праміж сябе, то добра, калі ў іх будуць заедныя пчолы. Гэтыя пчолы робяць тых людзей сябрамі і самі добра раяцца і шмат носяць мёду ды воску.

Каторы год у каго брацкая свечка, тое лета яго пчолы даюць шмат мёду і воску.

Серж., с. 59

Каб пчолы не аселі ў вуллі ў суседзяў, трэба пашмараваць "вока" ў тых вуллях салам ці іншым непрыемным для пчол рэчывам. Не раз можна пачуць меркаванні: "У Н.Н. сяголета ні адны пчолкі не селі, бо, мабыць, хтось салам вока памазаў".

Moszyński, s. 42

У звычайных выпадках пчала джаліць злога і грэшнага чалавека, з жывёл пчолы страшэнна не любяць і неміласэрна джаляць толькі коней, якіх пагэтаму не трэба падпускаць да вулля.

"Гнілец" у пчол заводзіцца праз тое, што ў вулей паклалі гнілое яйка ці сумесь з мёду, солі і дражджэй. Пчаляровы ворагі звычайна карыстаюцца гэтым сродкам, калі хочуць звесці чужых пчол.

Самы далёкі палёт пчалы ад сваёй калоды лічыцца сем міляў. Як толькі пчала пераляціць гэтую мяжу, яна ўжо не можа вярнуцца да свайго вулля.

Ник., с. 204—205

(Васілевіч, 1996. С. 447—448)

ЗАГАДКІ

Сто сястрыц адну хустку вяжуць. (*Пчолы і соты*)
Семсот муляроў збудавалі дом без вуглоў. (*Пчолы і соты*)
У адным доме сотні жыхароў, а сям'я адна. (*Вулей*)
У цёмнай цямніцы панны кросны ткуць. (*Пчолы*)
Сядзяць дзявіцы ў цёмнай цямніцы, шыюць шырынку ані ў нітку, ані ў іголку. (*Пчолы*)

У цёмнай каморачцы сядзяць каровачкі і вяжуць вязаначкі — ні вузла, ні пятлі. (*Пчолы*)
У цёмнай цямнушачцы сядзяць гарнушачкі і вяжуць вязаначкі — ні вузла, ні пяцелечкі. (*Пчолы*)
У цёмнай цямніцы тчэ пані спадніцы; ніхто не вытча ўдзень, як яна ўночы. (*Пчала*)
Ішоў я каля Шумілінага двара, чуць мяне Шуміліны сабакі не ўкусілі. (*Пчолы*)
Ішоў я каля двору Пільнаўскага, апанавалі мяне сабакі — ні адбудзіцца, ні адбараніцца, ні хлеба кусок даць. (*Пчолы*)
У нашай каваліхі сабакі дужа ліхі — ні адбіцца, ні абараніцца, ані хлеба даць. (*Пчолы*)
Узышоў я на горку, адчыніў каморку, каб не дым, дык бы сабакі з'елі. (*Пчолы*)
Ходзіць па гароду, вялікага роду, а слядоў не знаці. (*Пчолы*)
Прыйшоў хтось, узяў штось, рад бы дагнаці, ды след не знаці. (*Пчолы*)
Не сякера, а шуміць, не пілот, а ляціць, не змяя, а джаліць. (*Пчолы*)
Ляцеў птах цераз божы дах, крыллямі махаў, цяжка ўздыхаў: "Ой, Божа ж мой, Божа, тут мая праца гарыць". (*Пчала, царква, свечы*)
Без матораў гудуць, без пілотаў лятаюць, без іголак, а балюча колюцца. (*Пчолы*)
Лезу, лезу па сінім жалезу, адчыню камору — там злыя сабакі. (*Вулей*)
Сям'я невялічка, багата, а ўсяго два локці хата. (*Вулей*)
Мядзведзь ляжыць, кішкі равуць. (*Вулей*)
Каля бруха завіруха, а ўнутры вяселле. (*Вулей*)
Каля бруха завіруха, каля дзірачкі кірмаш. (*Вулей і пчолы*)
Цёмная цямніца, ткуць панны красніцы. (*Пчолы і вулей*)
Сядзіць дзявіца ў цёмнай цюрашніцы, не знае ні рубца, ні ніткі. (*Пчолы і вулей*)
Зайшоў на горку, адчыніў каморку, калі б не пан Дымінскі, то сабакі з'елі б. (*Вулей*)
Каля вуха завіруха, а на вуліцы кірмаш. (*Вулей*)
Што ў вадзе сохне, а ў печы мокне? (*Воск*)
Лезу, лезу, не залезу, дай, кажа, перарэжу. (*Мёд*)
Белы, як снег, салодкі, як мёд. (*Цукар*)

(Загадкі, 1972)

ПРЫКАЗКІ

Не налавіўшы пчол, не есці мёду.
Рой роем, а ты і сам не спі.
Не столькі таго мёду, колькі смароду.
На капейку мёду, а на рубель смароду.
Мёд і грэчка — брат і сястра.

Каторы год мёдна, той год не вельмі хлебна.
Дзе кветкі, там і мёд.
Пчала — дармавы батрак.
Пчаляр ды доктар і ў лесе не памрэ.

(Прыказкі і прымаўкі, 1976)

ЛІЧЫЛКА

Ішла курка па таку,
Па зялёным табаку,
Ела сахар і мядок.
Адчапіся, каралёк.

(Дзіцячы фальклор, 1972)

БЕЛАРУСКАЯ КУХНЯ

Арэхі ў мёдзе

Раструшчаныя свежыя арэхі ачышчаюць ад верхняй тонкай скуркі, потым высушваюць іх у цеплаватай печы, каб зрабіліся амаль што крохкімі. Калі адразу так не атрымаецца, дык два ці тры разы паўтараюць сушку. Пасля кідаюць у адвараны і падрумянены мёд, перамешваючы, столькі арэхаў, каб маса была густая, і яшчэ гатуюць. Калі ахаладжаны мёд пачне згушчацца — гэта адзнака таго, што час здымаць з агню. Пакуль гарачыя, бяруць арэхі лыжкай і рукамі раскладваюць іх на бляху, спаласнутую вадой. Як застынуць і засохнуць, кладуць у гаршкі, абвязваюць іх і ставяць у сухім месцы.

NB. Паколькі вараныя арэхі ў мёдзе хутка трацяць сваю крохкасць, лепш іх смажыць у невялікай колькасці мёду. Можна мець у запасе ачышчаныя ад скуркі і добра прасушаныя арэхі, якія доўга захоўваюцца ў гаршку ці мяшэчку ў сухім месцы.

Пернікі

Гарнец чыстага мёду вараць, пакуль не падрумяніцца, зрэдку знімаючы з агню, каб сабраць пенку. Тым часам усыпаюць у кашню жытнюю муку: калі яна тонкая пытляваная, дык адзін з чвэрцю гарнец, калі ж, як некаторыя любяць, грубага памолу, прасеяная толькі праз густое рэшата, дык паўтара гарца; гваздзікі, імбіру і анісу — па аднаму лоту, апельсінавых лупін развараных — чатыры лоты. Усё заліваюць варам з мёду і тут жа дадаюць конаўку спірту і лыжачку з верхам паташу. Пасля моцна б'юць цеста лапаткамі альбо выцягваюць рукамі, пакуль не пачне ад рук ці лапатак адставаць. Тады робяць з яго тонкія валікі, рэжуць іх удоўж на кавалкі даўжынёй з палец, укладваюць на бляху, пасыпаную мукой ці намазаную воскам, і ставяць у печ адразу пасля таго, як дасталі адтуль пшанічны

хлеб. Каб пернікі не прыгарэлі, у печы адчыняюць прадушыны. Спечаныя пернікі вымаюць, астуджваюць, а потым яшчэ адзін ці два разы падсушваюць у не вельмі гарачай печы.

NB. Ачышчаць мёд зусім не абавязкова. А каб пернікі былі больш рассыпістымі, трэба браць напалам муку жытнюю і пшанічную. Аднак усялякую заўсёды абавязкова папярэдне добра нагрэць і высушыць.

Нашы продкі ўмелі рыхтаваць многа смачных страў з ужываннем мёду. У кнізе "Літоўская гаспадыня", першае выданне якой выйшла ў 1848 годзе, акрамя прыведзеных вышэй рэцэптаў таксама падаюцца: "Яблычны мармелад", "Яблычны сыр", "Яблычныя кансервы, названыя ў рускіх пасцілой", "Фаршыраваныя яблыкі ў мёдзе", "Грушы ў мёдзе", "Апельсінавыя лупіны ў мёдзе", "Ружа ў мёдзе", "Парэчкі, барбарыс і вішні ў мёдзе", "Рабіны ў мёдзе", "Малінавы мармелад у мёдзе", "Жэле з агрэсту ў мёдзе", "Жэле з парэчак ці барбарысу ў мёдзе", "Жэле з касцяніц ці журавін у мёдзе", "Жэле з брусніц у мёдзе", "Пярцовыя пернікі".





ЗАЖЫНКІ-ДАЖЫНКІ

Прачыстая (Успленне, Спажа, Зельная) — свята ўраджаю і падрыхтоўкі да сяўбы — 15 жніўня ў каталікаў і 28 жніўня ў праваслаўных.

Хлебны Спас (Трэці Спас) — свята хлеба — 16 жніўня ў каталікаў і 29 жніўня ў праваслаўных.

"БАРАДА"

"Барада" — невялікі кусцік, пучок апошніх каласоў жыта, які пакідалі на полі ў магічных мэтах. Людзі верылі, што менавіта ў апошніх каласах хаваецца "дух поля", ад якога залежыць будучы ўраджай. Менавіта таму пакіданне ў полі "барады" адбывалася ў час дажынак, змест якіх — аддзякаваць полю, зямлі за сабраны ўраджай і забяспечыць добры вынік у будучым годзе. Прадуцыруючая роля "барады" выразна адлюстравана ў адным з вершаў М. Калачынскага:

З каласоў завязалі
Бараду, як вялося,
Каб трубою, казалі,
Штогод жыта вілося.

Старая сялянка адной з вёсак Гомельшчыны так апісвае пакіданне "барады" ў полі: "Дажынаем жыта, пакідаем кусочак недажатага, нясом хлеба краюшку, солі і звяжам лентачкай; вяршок звяжам, а прынізу выскубаем травачку і ложым туды хлеб з соллю. Вот і дажалі, вот і рады. Вот гэта і барада". У некаторых мясцовасцях Беларусі "бараду" зжыналі і неслі ў хату да гаспадара, дзе яе ставілі на покуці і захоўвалі на працягу ўсяго года.

"Барада" можа мець розны выгляд. Часцей за ўсё — гэта некалькі нязжатых каласоў, перавязаных чырвонай стужкаю (або без стужкі); радзей — гэта калоссі, скручаныя жгутом; надломаныя калоссі, апушчаныя да зямлі; калоссі, заплеценыя ў касу.

Рускія сяляне звычайна прысвячалі "бараду" якому-небудзь святому або Ісусу Хрысту. Адсюль — адпаведныя рускія назвы: борода Ильe-пророку, Ильюшкина борода, Николе на бороду, борода Фролам-Лаврам, Христу на бородку і інш. Сэнс адной з назваў "барады" — Христу на постельку — сялянка з Уладзімірскай губерні тлумачыла ў канцы мінулага стагоддзя наступным чынам, па-свойму ачалавечваючы Хрыста: "Устанет он, батюшко, ходя-то, может, и прилечь захочет, может, и на моей соломке приляжет". На Украіне вядома назва Спасова борода.

У беларусаў "барада" нярэдка звязвалася з культам продкаў, а выкананне гэтага абраду называлася "дзеда палоць". Для гэтага апошні кусцік жыта старанна аполвалі, клалі паміж каласоў кавалачак хлеба, соль, ставілі гарэлку ў шклянцы, цукеркі; упрыгожвалі ўсё гэта кветкамі, каляровымі стужкамі. Каля гэтага кусціка ("дзеда") спявалі жніўныя песні.

Рускім сялянам былі вядомы павер'і аб уплыве "барады" на дзетараджэнне і пладавітасць жывёлы. Лічылі, напрыклад, што калі "вязанку" (г. зн. "бараду") пераступіць жанчына, то народзіць хлопчыка; калі яе з'есць карова — прынясе цялушку, калі кабыла — народзіць жарэбчыка.

ЗАЛОМ

Залом — зламаны ці зблытаны чараўніком (ведзьмаром) пук жытніх сцёблаў, які, па народных уяўленнях, мог наклікаць бяду на гаспадарскую ніву, прывесці да хваробы ці нават да смерці саміх гаспадароў.

Залом мог мець розны выгляд: пераломлены пук сцёблаў, прыціснуты да зямлі; скручаны і завязаны вузлом пук сцёблаў з утыканымі калоссямі ў зямлю; пакладзеныя крыж-накрыж чатыры пукі сцёблаў; сплеценыя ў вянок сцябліны і інш. На думку рускага этнографа Д.К. Зяленіна, найбольш архаічным, старажытным відам залому з'яўляецца апусканне або закопванне ў зямлю каласоў. Для пацвярджэння сваёй думкі вучоны прыводзіць замову беларускага ведзьмара: "Ламаю залом, калоссе ўніз, на яго валоў, калоссе ў зямлю, на яго сям'ю!"

Магічнае прызначэнне заломаў дваякае. Па-першае, пазбавіць ураджайнасці тое поле, на якім зроблены залом. Па народных уяўленнях, зерня на гэтым полі будзе мала, таму што нячысцікі пераносяць зерне ў засекі ведзьмара, які зрабіў залом. Па-другое, залом прынясе бяду гаспадару поля або жнеям, якія да яго дакрануцца, а таксама хатняй жывёле, якая з'есць салому з залома. Звычайна і людзі, і жывёлы цяжка хварэюць і нават паміраюць. Усё залежыць, як адзначае Д.К. Зяленін, ад характару замовы. Ён жа прыводзіць

прыклад замовы, якая ўжывалася ведзьмарамі пры заломах на Магілёўшчыне: "Хто будзе жаць, таго будзе таскаць; хто будзе малаціць, таго будзе калаціць; хто будзе есці, той будзе на сценку лезці".

Лічылася, што ведзьмы і ведзьмары робяць заломы ноччу голымі. Звычайна гэта адбываецца ў Купальскую ноч, на Траецкім тыдні і ў час, калі каласіцца жыта і па ім бегаюць русалкі.

Паколькі дакранацца да заломаў вельмі небяспечна, а есці хлеб з яго зерня смяротна небяспечна, то людзі карысталіся рознымі спосабамі "абясшкоджвання" заломаў. Вырваць залом, "адрабіць" яго запрашалі знахара ці ведзьмара. Залом вырывалі асінавымі трэскамі ці палкамі, спальвалі яго, кінуўшы на залом пук саломы ці асінавыя трэскі. Украінцы прыкрывалі залом свіным гноем. Знахар голым падпаўзаў да залома і, вымаўляючы спецыяльныя замовы, клаў залом пад гнілую калоду, тапіў у рацэ, а часцей за ўсё вырываў з карэннем і спальваў. Тэксты наступных замоў сведчаць аб тым, што мэта "супрацьзаломнай" магіі — перадаць найгоршыя пажаданні, наклікаць хваробу і смерць на таго, хто зрабіў залом: "Мікулай-чудатворац і святы божы! І памілуй нас ад худога, ад ліхога, ад злога. Мікулай святы па межах ходзіць да рож росціць па цёплым начам па вутраннім зарам, а ліх чалавек па межам хадзіў да залом ламіў па цёплым начам, па халодным росам. А пашлі яму, Божа, на смерць, на балесць, а на куту ляжаць; яму хлеба ня з'ісць, вады ня піць, а ў магіле быць, а рабе Праскоўе здаровай быць, Мікалаю святому малебен служыць. Амень"; "Госпадзі Божа, благаславі, пасабі мне еты вянок вырваць (скруціць залом і наступіць на яго). Іду я па Юр'евай расе, па зямчужнай траве, Юр'евай расою ўмываюся, малебнаю скацеркаю ўціраюся, і пайду ў цэрквy-сабор. У том саборы стаіць гроб, у том грабу ляжыць мярцвец, у таго мерцвяца занямелі яго зубы і цела. Хто еты залом заламіў, занямей яго цела і кроў на векі вякоў, і амін яму!"

ТАЛАКА

Талака — калектыўная дапамога пры выкананні сельскагаспадарчых работ. У духоўнай культуры беларусаў звязвалася са шматлікімі ўяўленнямі, звычаямі, абрадамі і магічнымі дзеяннямі: рытуальным спажываннем на полі кашы, ужываннем гарэлкі, пляценнем вянка, качаннем (куляннем) па зямлі, абліваннем вадой.

Так, абліванне вадой суадносілася як з імітатыўнай магіяй (прыпадабненне вады дажджу), так і з прадуцыравальнай магіяй (вада забяспечвае ўрадлівасць). Уяўленні аб рытуальным паліванні апошніх каласоў (пры дажынкавай талацэ) адлюстроўваюць культавае ачышчальнае значэнне вады. Характэрнае для талочных дажынак качанне (куляние) па ніве сімвалізуе максімальнае зліццё з зямлёй і стымулюе паспяховы рост збожжа, а таксама мае на мэце прафілактычнае прадухіленне звязанай са жнівом хваробы і вяртанне патрачанай сілы. Качанне па "барадзе" выяўляе непасрэдную сувязь са шлюбна-эра-

тычнай тэматыкай, заснаваную на ўсведамленні апошніх каласоў як носьбітаў эратычнага сэнсу і як сімвала мужчынскага (апладняючага) пачатку. Вытокі гэтых уяўленняў — ва ўсведамленні "барады" як магічнага прадмета, які забяспечвае пладавітасць, пладаноснасць, урадлівасць.

Талака ў народнай свядомасці разглядаецца як агульнапрыняты сродак, які спрыяе перадшлюбным адносінам моладзі і значна палягчае выбар спадарожніка жыцця. Месца правядзення талакі станавілася своеасаблівай сцэнай шматлікіх абрадавых дзеянняў ярка выражанага шлюбна-эратычнага характару.

Асноўнае рытуальнае значэнне аднаго з цэнтральных талочных сімвалаў — вянка — увасабленне надзеі на новы ўраджай, плён, багацце. Вянок сімвалізаваў гаспадарчы кругаварот і цыклічнасць часу наогул. Акрамя таго, выява кола вянка як аховы ад небяспечных сіл, перажытак салярнага культу і сімвал дзявочай чысціні адыгрывала значную ролю ў талочнай абраднасці, садзейнічала замаўленню ўрадлівасці і дабрабыту, а таксама азначала канец паспяхова завершанай працы (параўн. дажынкавы вянок на ніве; вянок, які вешалі на дах пабудаванага дома, ускладалі на толькі што пакрытую страху і інш.).

Ужыванне ў час талакі кашы асэнсоўвалася не толькі як магічнае замаўленне гушчыні і ўрадлівасці пасеваў, але і як магічны кансалідуючы акт: сумеснае спажыванне кашы падкрэслівала прызнанне і зацвярджэнне кожнага ўдзельніка талакі ў прыналежнасці да данага калектыву. Частаванне гарэлкай мела на мэце закліканне вільгаці і плёну, падкрэслівала аднясенне талакі да ліку старажытных земляробчых абрадаў.

Абавязковым на талочным стале лічыўся сыр, які (часткова дзякуючы свайму беламу колеру) асацыіруецца з жыццём, актыўным прадукцыйным пачаткам, з мужчынскай сілай. Зыходзячы з укладання сыру ў "бараду", з тэкстаў тыпу "дасі сыру — родзіш сына", можна меркаваць, што сыр у народным уяўленні сімвалізаваў апладненне зямлі (жанчыны) і адначасова асэнсоўваўся як пасрэднік паміж светам рэальным і іншасветам (паводле Т.В. Валодзінай).

(Коваль, 1995. С. 20—21, 65—66, 150—151)

"ДОБРЫ ВЕЧАР, ТАЛАКА!"

Талака — апякунка жніва і пладавітасці...

Калі змяркаецца і дажынаюць ужо апошні загон (маленькі ўчастак), кожная са жней адкладвае па коласе для аднаго агульнага снапа, які прызначаецца ў гонар талакі. Сабраўшы такім чынам значную колькасць каласкоў, талачанкі звязваюць усе разам адзін агульны дажынкавы сноп. Між тым на ніве застаецца невялікі кавалак: з яго талачанкі (таксама разам) робяць вянок, уплятаючы ў яго розныя кветкі і пахучыя травы. Звязаўшы агульны сноп і зрабіўшы талаковы вянок, карагод талачанак кідае жэрабя, каму давядзецца быць "талакою". Выбраўшы "талаку", карагод упрыгожвае яе рознымі

кветкамі, дае ў рукі дажынкавы сноп, а на галаву яе кладзе талочны вянок з доўгім белым пакрывалам накшталт шаля. Пасля гэтага карагод акружае "талаку" і, пераплятаючыся вакол яе вянком, прыпявае:

Добры вечар, добры вечар!
Добры вечар, Талака!
Да ухараводзьжтка
Ты нас геценечкі вечар.
Да вазьмі ж ад нас, вазьмі
Гэты збожны ты снапок;
Да надзень жа, надзень
З краскамі прыгож вянок!

З гэтым добрым пойдзем жа мы
К пану да к гаспадару.
Прынясём жа мы яму
Шчасцейка тваё ў харамы.
Ён той пан гаспадарык
Справіць нам дажыначкі,
Выставіць пажытачкі
Ды з засекаў напіхалых.

Пасля гэтай песні карагод талачанак, выставіўшы наперад "талаку" і стаўшы за ёю папарна, адпраўляецца ў такім цырыманіяльным парадку ў хату гаспадара. Талачанкі спяваюць наступныя песні:

Выйдзі, выйдзі, гаспадарыку,
Спатыкаць з усякім збожжам
Талаку; раскрый жа хатачку
Да перад такім жа госцем.

Пакланіся ж, пані, Талацэ,
Пакланіся ёй найніжай,
Пасадзі яе да на куце,
Каб есць толькі да найвышай.

Выйдзі, выйдзі, гаспадынечка,
Спатыкаць з усімі госцьмі
Талаку ж у вароцечка;
Стань ёй борзна, на укосні.

Пакланіся ж, пані, Талацэ,
Пакланіся ж ты ёй каркам,
Выстаў, выстаў ёй да на стале
Саламашкі і з прысмакам.

(Драўлянскі, 1846)

[ЖНІЎНЫ ВЯНОК]

Пасля "завівання барады", скончыўшы работу, усе падымаюцца, і тая жніца, якая палола і "завівала бараду", бярэ вянок з калоссяў з рук тых, хто яго плёў, і кладзе сабе на галаву. Жніцы на чале з ёй адпраўляюцца да дому гаспадара павольным крокам, спяваючы доўгую песню. Калі на шляху сустрэнецца "свойскі" чалавек, то галоўная жніца здымае вянок са сваёй галавы і ўскладае яго на галаву "свойскага" сустрэчнага чалавека. У гэты час усе жніцы становяцца вакол "палоннага" і працягваюць песню да таго часу, пакуль ён не аддасць ім выкупу, які звычайна складаецца з грошай ці якіх-небудзь рэчаў. Толькі тады вянок здымаецца з яго галавы і ён атрымлівае свабоду.

Калі падышлі да хаты, жніцы спыняюцца і даканчваюць песню. Тады да іх падыходзіць гаспадар і запрашае ў хату. Скончыўшы песню, галоўная жніца здымае з галавы вянок і ўскладае яго на галаву гаспадара, і ў яго суправаджэнні ўсе ўваходзяць у хату. Гаспадыня сустракае іх у сенцах, трымаючы ў руках гарэлку, хлеб, сыр, якімі яна іх тут і частуе.

(Шэйн, 1887. Зап. М. Нікіфароўскі ў Віцебскай губ.)

СІМВАЛЫ ЎРАДЖАЮ Ў БЕЛАРУСКІМ АРНАМЕНЦЕ

Жыцень

Найбольш папулярны сімвал ураджаю — Жыцень — мае форму разеткі ў выглядзе ромба, ад вуглоў якога адыходзяць па два стылізаваныя жытнія каласы. Як ужо адзначалася, ён нагадвае дажынкавы вянок, які сімвалізаваў паспяховае заканчэнне жніва. Як сімвал ураджаю, вянок разам з дажынкавым снапом ставілі пад абразы на покуці.

А вось як услаўляецца Жыцень у народнай песні:

Дай жа, Божа,
на полі снапамі,
на гумне стагамі,
на таку ўмалотам,
у клеці — спорам.
У млыне прымолам,
у дзяжы — падходам,
у печы — з падростам,
на стале з прыбыткам,
з добрым ужыткам.

(Сенненскі р-н)

Узор Жыценя на тканых вырабах нярэдка спалучаецца з іншымі сімваламі ўраджаю: Зямлёй-Карміцелькай, Спарышом, Жаночай доляй.

Жыцень вельмі шанаваўся ў народзе, да яго звярталіся за дапамогай. Такія просьбы-звароты можна "прачытаць" на многіх посцілках (мал. 27, 28).



Мал. 27. К. Шацілава. Фрагмент посцілкі з матывамі Жыценя. Астрагляды Брагінскага р-на Гомельскай вобл.



Мал. 28. Е. Догель. Фрагмент посцілкі. Барсукі Сенненскага р-на Віцебскай вобл.

Спарыш

Спарыш — чаканы і жаданы госць у сялянскай сям'і. Ён прыносіць вялікі ўраджай, поўныя засекі збожжа, дабрабыт у гаспадарку. Недарэмна Спарыш часта згадваецца ў песнях:

Прыспары мне, Спарыш,
і ў доме, і ў полі,
і ў гумне, і ў двары,
і ў клеці, і ў печы,
і ў клеці карабом,
і ў печы пірагом.



Мал. 29. У. Капшуль. Абрус. Беразвеча Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.

Н. Каралькова (Слабада Рэчыцкага р-на), якая выткала посцілку з узорам Спарыша, зрабіла гэта для таго, "каб Спарыш не забываў нас, каб даваў спор у жыце, у ячмені і ў грэчцы, на ніве, на таку і ў клеці".

Узор мае выгляд разеткі з чатырох моцна стылізаваных каласкоў, вельмі падобны на зорку — сімвал чалавека, таму іх няцяжка зблытаць. Розніца між імі ўсё ж ёсць: у Спарыша лісты-каласы



Мал. 30. К. Ількавец. Фрагмент дэкору посцілкі з матывамі Спарыша і Зямлі-Карміцелькі. Каладзеевічы Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл.

крышку аддалены ад цэнтральнай разеткі, а ў зоркі — цесна змыкаюцца ў цэнтры.

Звычайна ўзор Спарыша спалучаюць з іншымі матывамі (мал. 29).

Спарыш — значыць здвоены, спорны. Каб выказаць яму сваю павагу, сімвал змяшчалі ў аблямоўку-гірлянду з кветак. Яна абвівае Спарыша, гэта яго вянок.

На многіх тканых і вышываных вырабах Спарыш суправаджаюць і іншыя сімвалы ўраджаю — Рай і Зямля-Карміцелька (мал. 30).

Рай

Гэты загадкавы вобраз некаторыя вучоныя лічаць адным са славянскіх багоў ураджаю. Рай згадваецца ў многіх беларускіх песнях, пры гэтым заўсёды звязваецца з багаццем, заможнасцю, дабрабытам...

Узор, што абазначае Рай, мае выгляд разеткі з чатырох каласоў, якія перасякаюцца пад прамым вуглом...

Жытняя Баба

Да калектывізацыі сялянскія нівы пасля жніва былі ўстаўлены бабкамі снапоў. Так дасушвалі зжатае жыта. У маладосці і мне неаднойчы даводзілася ставіць прыгажуні-бабкі. Яны і з'явіліся асновай для ўзнікнення яшчэ аднаго сімвала ўраджаю — Жытняй Бабы.

Акадэмік М. Нікольскі лічыў, што Жытняя Баба ў старажытных славян была багіняй урадлівасці (Никольский Н. Дохристианские верования и культы днепровских славян. М., 1929. С. 34). Ён параўноўваў Жытнюю Бабу з антычнай грэчаскай багіняй урадлівасці Дэметрай.

Жытнюю Бабу рабілі з вялікага дажынкавага снапа, перавязвалі яго ручніком, палівалі грамнічнай вадою і ставілі пад абразы на покуці. Прыкладна такі выгляд мае адлюстраванне Жытняй Бабы на ручніку, які вышыла Грамавік, 1885 г.н., Жыткавічы. Па яе словах, гэты матыў яна пераняла ў бабкі Іваніхі, якая памятала французаў. Тая лічыла, што Жытняя Баба вылечвае ад жаночых хвароб, дапамагае пры родах. Хто шануе Жытнюю Бабу, той заўсёды мае добры ўраджай на ніве.



Мал. 31. Ручнік з матывам Жытняй Бабы. Шаркоўшчынскі р-н Віцебскай вобл.

На ручніку Арлюковіч (в. Рэчкі Шаркоўшчынскага р-на) стылізаваныя сімвалы Жытняй Бабы ўтвараюць верхні рад (мал. 31). Ніжэй ідзе некалькі радоў з узорам Багача, таксама сімвала ўраджаю. У самым нізе — радок з сімвалам ўраджаю Ярылы.

Паміж радамі раскіданы сімвалы зерня. Як бачым, ручнік уяўляе сабой своеасаблівы гімн ураджаю.

(Кацар, 1996. С. 20—35)

Багач — дажынкавы сноп

Дажынкі — вялікае свята ў беларускай вёсцы. Успамінаю, як у маёй маладосці іх адзначалі. Калі жніво падыходзіла да канца, пакідалі нязжатай жменю жыта — дзедаву, ці божую, "бараду". Потым гэты кусцік зажыналі, перавязвалі стужкай, гаварылі замову, урачыста, з песнямі і жартамі, неслі дадому і ставілі пад абразы на покуці. Цяпер яго называлі Багачом. Бацька звяртаўся да яго з замоваю:

Багач, Багач!
Не забывай нашай нівы!
Дай ніве спор у снапах,
Стагам у гумне,
Зярном у клеці.

(Дзяржынскі р-н)

Потым наладжвалі ўрачыстую вячэру. Пачастунак ставілі і каля Багача.

...Сышоў з нашай нівы Багач. Але захаваўся яго сімвал у народным мастацтве. Ён мае выгляд разеткі з чатырох моцна стылізаваных каласоў, размешчаных крыжападобна...

ЧАМУ ЧАЛАВЕК ШАНУЕ ХЛЕБ

(легенда)

Быў час, калі на свеце нікога не было, апрача аднаго чалавека. У гэтага чалавека было многа ўсякага дабра, але найбольш хлеба. Кавалкі яго валяліся і па дварэ, і пад лаваю, і ў хляве — усюды. Убачыў Бог такую непавагу да хлеба і адабраў яго ад людзей. Настаў голад, і людзі памерлі б усе. Але іх кот і сабака ў той час, калі Бог адбіраў хлеб у чалавека, падышлі да яго і пачалі прасіць хлеба. Бог і даў ім па каласку. Чалавек адабраў у іх гэтыя два каласкі і пачаў сеяць. Прайшло некалькі год, і чалавек ізноў нажаў многа хлеба. Але з таго часу ён пачаў ужо шанаваць хлеб.

(Шэйн, 1902. Зап. у с. Навасёлкі Ігуменскага пав. Мінскай губ.)

ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І

Усе найважнейшыя работы ў полі (і асабліва жніво), распачатыя ў суботу, ідуць спорна, паспяхова, у панядзелак жа — наадварот.

Gloger, 1876, s. 378

Зажон робяць у аўторак, чацвер і, пераважна, у суботу. Можна рабіць зажон і ў пятніцу: тады зжатае збожжа не будуць есці мышы і скаціна, але затое страчваюцца іншыя выгоды ад зажону.

Ник., с. 110

Зажынкі робяць у аўторак або чацвер, то пагода будзе шанцаваць. Калі ж зажынаць у суботу, то жанцом не будзе балець сярэдзіна. Калі ж зажынаць у пятніцу, то хоць мышы не будуць есці збожжа, але жніво вельмі доўга працягваецца, бо паменшае непагадзь.

Серж., с. 67—68

Перад выпраўленнем на зажон "зажонніца" мые бажніцу, лавы і стол, які пакрывае белым абрусам дзеля прыёму "новага госціка" (гэты "новы госцік" — невялікі пучок каласоў, зжатых першым узмахам сярпа і адразу звязаных асобна, пасля зажону снопік прыносяць дадому і ставяць на бажніцу).

Ник., с. 111

Сваю выправу на зажон жняя прымяркоўвае такім чынам, каб нажаць цэлую бабку і каб захад сонца заспеў яе на палове работы: толькі тады можна лічыць зажон правільна пачатым.

Ник., с. 111

Любая стрэча, асабліва якая патрабуе спыніцца, настолькі несприяльная для зажону, што ў гэтым разе лепей вярнуцца дадому і адкласці работу да іншага дня.

Ник., с. 111

Жнеі павінны выбіраць такія шляхі, дзе не можа быць сустрэч з людзьмі, бо праз гэта, і асабліва калі стрэчны пяройдзе дарогу, яны будуць рэзаць сярпамі рукі.

Ник., с. 112

Перад жнівом на Палессі рэдка ў каго ёсць свой хлеб... Чакаюць — не дачакаюцца, пакуль жыта паспее. Кабета, выгаладаўшыся, хацела б пажаць і зеленаватага, але ёй гэтага не дазволяць, бо, згодна з народным павер'ем, "варта хоць раз разануць сярпом, нажаць хоць жменьку не ва ўрэмя — жыта стане сохнуць і высыпацца".

Косич, с. 22

Зажынкі робіць сама гаспадыня ці другая старшая жанчына. Яна чысценька ўмываецца, надзявае чыстую сарочку і святочную адзежку, бярэ з сабою хлеб, соль, сыр, хрэшчык, грамнічную свечку, вярбу і серп, каторы часамі яшчэ абгартае свянцоным зеллем. Каля поўдня яна йдзе на поле, дзе расце жыта, залазіць у яго на два-тры шагі ад дарогі ці суваратаў, перахрысціўшыся ды памаліўшыся, нажынае дзве жмені, каторыя кладзе на зямлю накрыж. Потым яна

есць хлеб, соль і сыр і, нажаўшы маленькі снопік, нясе яго дахаты і ставіць на покуці пад абразамі. Паложаныя накрыж дзве жмені жыта ляжаць датуль, пакуль не кончаць жаць. Тагды забіраюць іх і разам з тым снапком, што стаіць на покуці, выціраюць зярняты, свецяць іх і сыплюць у насенне, каб на другі год зарадзіла жыта.

Серж., с. 68

Калі ёсць прыхаваны велікодны хлеб, зажынальніца бярэ яго з сабою, калі ж яго няма, яна бярэ акраец звычайнага хлеба і разам з цэлым свежым сырам, адмыслова да гэтага дня прыгатаваным, нясе за пазухай на ніву, дзе, зрэзаўшы "каліў дзесяць Богу" і паклаўшы іх тут жа, кладзе на іх хлеб і сыр.

Ник., с. 111

У Себежскім павеце гаспадыні, выйшаўшы на ніву, становяцца тварам да сонца і моляцца, потым зажынаюць "бародку" са словамі: "Дай жа, Божа, каб лёгка жалась! Сярэдзінка не балела, ручанькі не млелі, ножанькі не дзервянелі, галава не гарэла!" На "бародку" зжынаюць тры жмені жыта, звязваюць іх у снапок і кладуць гаспадыні на плечы. Яна заносіць "бародку" дадому і кладзе на абразы, а жнеі пачынаюць работу. Строга сочаць, каб у гаспадыні, што зажынае жыта, была рука лёгкая — інакш жнеям будзе вельмі цяжка жаць. Калі ж сярод гаспадынь такой не знойдзецца, то зажынае жыта маладая дзяўчына.

Романов, 8, с. 240

Апранутая ў чыстае адзенне, зажынальніца павінна быць увішная ва ўсіх рухах. Так, яна павінна спяшацца ў час хатніх збораў, павінна ісці да нівы хуткай хадою, трымаючы серп у руцэ і на адлёце, на ніве павінна хутка скінуць з сябе верхняе адзенне і адразу ж пачынаць жаць. Тады ўсе жніўныя работы пойдуць хутка, бесперапынна.

Ник., с. 111

Калі дажынаюць жыта, у канцы поля, на мяжы, пакідаюць невялікае месца недажатае і кажуць: "Трэба пакінуці звяром, бо калі не было на свеце гэтум жыта, то звяры началі прасіці Бога чаго есці, а Бог ім кінуў жменьку жыта, штоб яны памялі, і адгэтуль распладзіўся хлеб".

Шейн, I, с. 270

Дажон падганяецца да захаду сонца. Жнеі пакідаюць нязжатымі некалькі сцяблін хлеба, звозяць каласы і перавязваюць іх чырвонаю жычкаю: гэта — "барада"... Гаспадыня ці іншая жанчына, якая замяняе яе, "поліць бараду", г. зн. вырывае між сцяблін пустазелле і ў сярэдзіну кладзе лустачку хлеба... Тая, што палола "бараду", адразу падразае яе, па магчымасці, ніжэй і, трымаючы "бараду" ў левай руцэ, праваю кідае серп убок ад жней як мага вышэй, а "бараду" кладзе ў сярэдзіну не звязанага да таго часу апошняга снапа. Вымалачаныя з гэтага снапа зярняты асвячаюцца на Спаса (19 жніўня) і

выкарыстоўваюцца для сяўбы. "Барадаты сноп" вязуць з поля на апошнім возе, "станьком", і да малацьбы ён стаіць на ганаровым месцы на таку.

Калі ў гэты час у доме ёсць жалоба, то "барадаты сноп" пакідаюць на полі, каб мышы і птушкі памянулі нябожчыка.

Ник., с. 114—115

Напрыканцы жніва трэба закапаць на ніве некалькі сцяблін з каласамі — менавіта мышам, каб яны не елі хлеба ў клуні. Часам гэта робіцца наступным чынам: апошняя жменя зжатага хлеба дзеліцца папалам, і ў зямлю закопваецца адна палова, а другая ўторкваецца ў сноп; часам на ніве цалкам пакідаюць апошні зжаты сноп.

У іншых мясцінах робіцца так: аддзеленую палову апошняй зжатай жмені разам з кавалкам хлеба і шчопаццю солі жнеі кладуць на тое месца, дзе была зжата гэтая жменя, і гавораць: "Наця вам, мышкі, на полі крышкі (г. зн. троху), тутацька вы спажывайця, а да гумна не бувайця!"

Ник., с. 114;
Вар.: Серж., с. 70

У большасці выпадкаў ніва ахвотна аддае гаспадару свае дары, — гэта выяўляецца ва ўласным жніве, сушцы збожжа на полі і інш. Але калі паспелую збажыну прыгнула да зямлі, калі дождж і вецер перашкаджалі жніву, сушцы і перавозу збажыны, калі жнеі рэзалі сярпамі рукі, гэта значыць, што поле разгневалася і яго трэба задобрыць. Адзіным сродкам для гэтага з'яўляецца раскідванне саломы па ржышчы.

Пасля таго як перавязуць збожжа, гаспадар запрагае каня ў воз, кладзе туды некалькі ахапкаў старой саломы, прывязвае і прыціскае "жардзёй" і вядзе каня з такім возам на ніву. Развязаўшы воз, гаспадар становіцца на салому і, раз'язджаючы "станьком" па ржышчы, раскідае ўсю салому, пасля чаго, не злазячы з пустога воза, вяртаецца дадому.

Ник., с. 116—117

Калі хто, жнучы, да забудзе на ніве жменю зжатага жыта, не звязаўшы яго ў сноп, а гэта паказвае, што на другое лета той чалавек не будзе жаць на той ніве: калі то дзеўка, то пойдзе замуж, а калі жанчына ці мужчына, то кудысь адлучыцца.

Серж., с. 70;
Вар.: Ник., с. 114

Калі часамі, дажынаючы свае постаці, дзве дзеўчыны кладуць свае жмені жыта ў адну кучку, то звязваць сноп павінна тая дзеўка, каторая звівала перавясла, бо як звяжа другая, то іх жаніхі адвяжуцца ды звяжуцца з другімі.

Серж., с. 70
(Васілевіч, 1996. С. 271—284)

ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ

Лепш ралля ранняя, чым позняя: на ранняй — пшаніца, на позняй — мятліца.
Калі добра ўзарэш, то і ўраджай збярэш.
Не той хлеб, што ў полі, а той, што ў свірне.
Не сей пшаніцы, калі людзі ідуць у суніцы.
Дзе арэ сошка, там хлеба нямножка.
Хто не сее, той не вее.
У парачку сей, зерне не жалей, жыта зжынай і зярняткі з каласкамі падбірай.
Калі хочаш смачна есці, трэба толькі раз у дзень прысесці.
Калі зерне ў каласку — не спі ў халадку.
Пакуль вочы — патуль свет, пакуль рукі — патуль хлеб.
Не чакай з неба дараванага хлеба.
Хоць ручкі чорныя, ды работа белая.
Як мукі скрыня, то і свіння гаспадыня.
За сваё жыта я стала біта.
Людзям засуха, папу — сноп.

(Мінская вобл.)

ЗАГАДКІ

Загадаю загадку, закіну за градку, пайшла мая загадка на ўвесь год гадаваць. (*Жыта*)
Сто братоў адным поясам абпярэзаныя. (*Сноп*)
Дзед гарбаты, маці пляската, а дзеці пакручаны. (*Гумно, ток, цапы*)
Ляцяць гускі, дубовыя наскі і гавораць: "Тук-ток-так". (*Цапы*)
Я сяку лес, лес вяне, а на тым месцы гара ўстане. (*Сенакос*)
Бягуць бягунчыкі, а за імі катунчыкі, нясуць рагацінку, колюць махнацінку. Ішлі плотнікі-бестапорнікі, зрубілі гарніцу без такойніцы. (*Касілка, граблі, людзі стог скідаюць*)
Шчука белавая лес паваляла, лес павяў, горад стаў. (*Каса, сена, стагі*)
Тры круты закруты. (*Саха*)
Бегла ваўкоў дваццаць пяць, ды і цяпер сляды знаць. (*Барана*)
Бегла шчучка па полі хутка, куды яна гляне, там трава вяне. (*Каса*)
Рагаты, ды не бык, ежу бярэ, а не сыты, людзям падае, а сам у куток ідзе. (*Вілы*)
Крывенькае, сляпенькае ўсё поле аббяжыць, а прыбяжыць — пад лаўкаю ляжыць. (*Серп*)

(Гомельская вобл.)

ПЕСНІ

Пара, маці, жыта жаці...



Пара, маці, жыта жаці, э[1],
Пара сярпы раскладаці.

Нема серпа залатога, э,
Нема жанца маладога.

Быў бы сярпок залаценькі, э,
Пры нім жанец маладзенькі!

(Мінская вобл.
Зап. у в. Вуглы Капыльскага р-на)

Я ў бару жыта жала...



[1] Першы радок кожнай страфы паўтараецца.



Я ў бару жыта жала[1],
Мне, маладой, бяда стала.
Стала свякроў на тын глядзець:
Ці скора нявестка жыта жнець?
Звалілася свякроў з тыну
Ў вялікую крапіву.
Не жаль мне свякроўкі,
А жаль мне крапіўкі.
Крапіўка — яда мая,
Свякроўка — журба мая.

(Мінская вобл.
Зап. у в. Іжа Вілейскага р-на)

Чыя гэта павалока, эй!



[1] Кожны радок паўтараецца.



Чыя гэта павалока, эй!
Яна доўга і шырока.

На ей жнейкі жыта жалі, эй!
А сярпочкі пагублялі.

Каторая сярпок знойдзя, эй!
Тая раней дамой пойдзя.

Каторай жа сярпа нету, эй!
Тая будзя до поўсвету.

(Мінская вобл.
Зап. у в. Даўгінава Уздзенскага р-на)



“ДЗЕ ПАЧУЮ ТАЛАКУ — ТУДЫ НОГІ ВАЛАКУ”

(сцэнарый для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту)

І сцэна

У хаце гаспадар, гаспадыня і іх дачка рыхтуюцца да свята.

Гаспадыня. Ну, дзякуй Богу, дачакалі.

Гаспадар. Дзякуй Богу.

Гаспадыня. Зара мая, зоранька, узыдзі рана, пастой позна, пакуль я прыбяруся, умяту двор мяцёлачкай, усцялю скацёрачкай.

Гаспадар. Будуць у нас сёння любыя госцейкі.

Гаспадыня. Дай, Божа, пагодачку ды на нашу работачку.

Гаспадар. Мы ж работачку рабіць будзем, а пагодачку хваліць будзем.

Дачка. Перагані, Божа, хмаркі на чужую староначку, дзе пакасілі, дзе снапочкі павязалі.

Гаспадыня (*гаспадару*). А ты, гаспадарочак-сакалочак, пераляці нашы палі, накажы старым бабкам, няхай да нас жанцоў склікаюць. Склікай усіх на талаку!

Гаспадар ідзе.

Дачка. Ах ты, хаціца мяцёная, а чым жа ты ўкрашоная? Ці цудам, ці музыкамі, ці мальцамі без’языкімі, а мо гаспадарамі руплівымі?

Чуецца музыка, прыходзяць хлопцы-музыканты, моладзь.

Старшая жняя. Просім гаспадара не хавацца, выйсці з намі павітацца.

Выходзяць гаспадары.

Гаспадар. Ішоў Бог дарогаю, з вялікаю талакою.

Гаспадыня. Добры дзень, а чые гэта талачане, што па полі блудзілі?

Гаспадар. Нашы пыталіся Лунінскага сяла Янускавага двара, а знайшлі наш Пацічэльскі двор, просім усіх на падворак.

Усе заходзяць на падворак.

1-ая жняя. А што ваша поле дрэмле?

2-ая жняя. Гэта Тадоркава поле дрэмле.

3-яя жняя. Бо там жнейкі ўсе старыя, сярпочкі лубяныя.

Ст. жняя. А чыё поле йграе?

4-ая жняя. Пацічэльскае поле йграе!

Гаспадыня. Бо жнейкі маладыя, сярпочкі залатыя.

Гаспадар пяе жнеям песню "А мае вы мілы бабачкі"[1].

Гаспадар. Жнейкі мае, мілыя жнейкі, прынясу вам мядочку чатыры збаночкі, сам пакаштую і вас пачастую.

Гаспадыня. Жнейкі мае, мілыя пташкі, навару вам кашкі, жнейкі мае, мілыя любы, навару вам бульбы.

Ст. жняя. Ці ў цябе, гаспадар, двор на памосце? Ці ў цябе нялюбыя госці? Чым яшчэ частаваць будзеш? Ці віном зялёным, ці мёдам салодкім?

Гаспадар. І віном зялёным, і мёдам салодкім.

Ст. жняя. Ай, знаць наш Іванька багата жывець, яго талака далёка слывець.

Гаспадыня. Кожны край мае свой звычай.

Гаспадар. Аднаму толькі лепей рыбу вудзіць і да дзяўчат заляцаца.

Ст. жняя. Сабака кудлаты — яму цёпла, гаспадар багаты — яму добра.

Гаспадыня. Калі робіш у купе — не баліць і ў пупе.

Дачка. У маіх бацькоў сёння новая брама, а з-пад той брамачкі два ручаёчкі бягуць: першы — зялёнае віно — кідальнічкам, другі — салодкі мядок — важтайчыкам.

Ст. жняя. Ой, патаргуешся ты, суседачка, з намі, паплаціш нам чырвонцамі, мы тваё полечка ўсё разведаем, мы твае нівачкі пазатрасаем, хлявочкі павычышчаем.

Гаспадар. Гутарка, гутарка, але і за працу час.

Жнеі ідуць на працу з песняй "Паплаціш, Іванька", талачанкі застаюцца працаваць на падворку.

II сцэна

1-ая талачанка (*з сітам*). Таўкучы, мелючы — дай замарылася, сеяла мучыцу — апылілася, выйшла на вуліцу — скалыхнулася. Работка мая ўся пыльная, суседзям дай не завідная.

2-ая талачанка. Мусіць, наш гаспадар, як мядзведзь, кару дзярэць, а Маруся ваду бярэць.

1-ая талачанка. Нашто мядзведзю кара? Нашто Марусі вада?

2-ая талачанка. Кара — у печы паліць, а вада — талачанкам есці варыць.

Пяюць гаспадару песню "Доля наша".

---

[1] Песенны матэрыял да сцэнарыя гл. на с. 121.

Гаспадар (*выходзіць*). Ах мае вы лябёдачкі, не гудзіце мне, прынясу я квасу — упаю я вас.

Выходзіць гаспадыня са збанком.

Гаспадыня. Упаі, Іванька, талаку сваю, каб твая талака вясёла была, каб ішлі з талакі — пахваляліся.

Да іх выходзяць яшчэ талачанкі.

3-яя талачанка. Талачу, талачу, не талочыцца, мо дзе мёд даюць — і мне хочацца.

4-ая талачанка. Мо дзе сыр ядуць — і мне хочацца.

5-ая талачанка. Сусед, а сусед? Чаму піва не варыш?

1-ая талачанка. Ці ў цябе ячмень не ўрадзіў?

Гаспадар. Не ўрадзіў ячмянёк, толькі пшоначка — не вяліць мне мая жоначка.

2-ая талачанка. Ці наша доля такая? Ці гаспадыня скупая?

3-яя талачанка. Што не прыходзіць, ні квасу, ні мёду не прыносіць.

4-ая талачанка. На полі хлопцы застаяліся, а мы розных песень наспяваліся.

Гаспадарам, якія нясуць пачастункі, пяюць песню "Таўкучы, мелючы".

1-ая талачанка. У нас сёння талака, шчука рыбу валакла. Гаспадар-салавей, паварочвайся жывей!

2-ая талачанка. Гаспадыня-вутка, паварочвайся хутка.

3-яя талачанка. Гэй, сусед, падвяжы штаны — прынясі нам квасу чатыры жбаны!

4-ая талачанка. Гэй, сусед, я ў цябе не адна, налівай усім да дна!

1-ая талачанка. Пайшоў па квас і сам згас!

Пяюць гаспадару песню "Доля наша худая" або прыпеўкі.

2-ая талачанка. Гэй, барджэй, весялей!

Выходзяць гаспадар і гаспадыня, якія частуюць усіх талачанак.

Гаспадар. Хто работу рабіў?

Талачанкі. Талачанкі.

Гаспадар. А хто мядок папіў?

Талачанкі. Прыхаджанкі.

3-яя талачанка. Як талачанкі за чаркі-ложкі, дык гаспадар у слёзкі.

4-ая талачанка. Дайце, дайце кісялю — усю талаку звесялю!

Пяюць песню "Не расці чабору" і танцуюць з гаспадаром.

III сцэна

Гучыць музыка або жніўная песня і на падворак прыходзяць жнеі са снапом і вянком, звітым з каласкоў.

Гаспадыня. Адчыняй, Іванька, вароты — ідуць жнеі з работы.

Гаспадар. Адчыняй, Маруся, і другія — ідуць маладыя.

Жнеі праходзяць у цэнтр падворка з песняй "Выйдзі, выйдзі, гаспадарочку".

Гаспадар. Да сюды, сюды з талакою, у нас і сталы засцелены, і кубкі паналіваны.

1-ая жняя. Гаспадыня-цяцера, а ці гатова вячэра?

2-ая жняя. Калі не гатова — не сядзі дома, уцякай пад печ, пад карыта — бо будзеш біта!

Гаспадыня. Абед не заяц — не ўцячэ.

Гаспадар. Мінулі тыя часы, калі лёталі каўбасы.

1-ая жняя. Ох, рада я, што дзянёк прайшоў, што вячорак прыйшоў, надаела мне жаркая спякота ды цяжкая работа.

Ст. жняя. Гаспадарочку, сустракай з усім збожжам талаку, пакланіся пані талацэ найніжэй, пасадзі яе на куце, што ёсць найвышэй.

2-ая жняя. Пакланіся пані талацэ каркам, выстаў ёй на стале саламашкі са шкваркай.

3-яя жняя. А ты, пані, палі свечку дай выходзь на сустрэчку. (*Гаспадар запальвае свечку.*) Найсвеншая Матка па небу хадзіла, калосся збірала, у вянок уплятала.

4-ая жняя. Не пытаіць гаспадыня, ці жывы-здаровы? Ці крэпкі, вясёлы?

5-ая жняя. Толькі пытаіць: "Ці многа ўвазілі, ці многа ўлажылі?"

Ст. жняя. Улажылі поле нязмернае дай вазы незлічоныя.

Гаспадар. Дзякуй табе, моцны Божа, што дапамог сабраць збожжа.

Ст. жняя. Дажалі мы жыта да самай граніцы, а ў нашай гаспадыні шырокія спадніцы.

1-ая жняя. Спадніцамі патрасець, нам, глядзіш, і закуску прынясець?

Гаспадыня. Жытца, ідзі дадому, настаялася ў чыстым полі, накланялася Госпаду Богу.

Ахінуўшы сноп світкаю або ручніком, аддавалі гаспадыні. Тая дарыла грошы ці палатно. Сноп гаспадар падкідаў тры разы ўгору.

Гаспадар. Прыляцелі жнейкі з поля — як вутачкі з мора. Ой, нясуць ядронае жыта, ды ўсё ў вянкі павіта.

Ст. жняя. А наш вяночак ядвабам віты, не аддамо яго за талер біты.

2-ая жняя. Ой выйдзі, гаспадарочак, на ганочак, прымі залаты вяночак.

Адзяваюць вянок гаспадару на галаву.

Гаспадар. Падзякуем Богу за яго выгоду, за цёплае лета, за буйнае жыта.

Гаспадыня. Жнеям дзякуй, яны ўсё поле зжалі, не ляжалі, усе каласкі сабралі.

Выходзяць дзеці і складваюць каласкі на ручнік.

Ст. жняя. Паздароў, Божа, гаспадару, хай ён свайго не страціць, нам за вянок заплаціць.

1-ая жняя. Хоць чырвоныя боты — для ахвоты. Жыту — на ўраджай, а гаспадарам — на доўгі век.

Ст. жняя. Віншую гаспадара вянком, а гаспадар нас — мядком!

Гаспадыня. Налівай, гаспадар, залаты кубак ды частуй старэйшую жнейку Пастаццяначку.

Гаспадар выносіць кубак квасу.

Гаспадар. Ой, кубак мой наліваны, кубак маляваны. Эх, як налью я яго да краю ды пастаўлю пасярод стала. (*Аддае гаспадыні, тая перадае старшай жняі.*)

Гаспадыня. Будзь жа здарова, старшая жняя Пастаццяначка!

Ст. жняя. На здароўе, мая гаспадынечка Сенатарачка! (*П'е.*) Дай, Божа, гаспадарам на жыццё, на доўгі век, на багацце і добры савет! (*Разглядае маляваны кубак.*)

1-ая жняя. Ай, ці поўна залатая чара мёдам налівана?

Гаспадыня. Ой, так поўна, што не скалыхнецца, не разальецца.

2-ая жняя. А ці поўна ў гаспадара ў гумне, ці добра навязёна?

Гаспадар. Ай, так поўна — ні ўвайсці, ні ўехаці. (*Да гаспадыні.*) Добра паглядзеці?

Гаспадыня. Ой, добра.

Гаспадары абдымаюцца.

3-яя жняя. Як пан пані абдымае, такое ён жыта мае.

4-ая жняя. Абдымай, пан, пані часцей, будзе жыта расці гусцей.

Спяваюць песню "Упаі, Іванька, талаку сваю" і танцуюць з гаспадарамі.

Ст. жняя. Ці не пчолка зазвінела звонка?

Гаспадар. То не пчолка, а гаспадыня, па двару хадзіла, ключыкі насіла, каморы адкрывала, гасцей частавала.

Гаспадыня ідзе рыхтаваць сталы.

Музыкі. У гаспадарцы — сыр на талерцы, а ў гаспадара — шапка з ліса, глядзіш, прынясе нам галушкі ў місе.

Гаспадар. Запрашаю ўсіх у хату (*або на падворак — за стол*).

Пяюць песню "Адчыняй, Іванька".

IV сцэна

Граюць музыкі, госці сядзяць за сталом.

Гаспадар. Жонка, ідзі ў піўніцу, утачы мёду дайніцу, наша талака п'е нямала, вып'ем мёду два вядры.

Ст. жняя. Эх, як сядзем мы на лавачцы. Эх, як вып'ем мы па чарачцы. Эх, як сядзем мы на раўненькай. Эх, як вып'ем мы па паўненькай!

Гаспадыня. Мілыя талачаначкі, мілыя жнеечкі, садзіцеся радком — частуйцеся мядком (*частуе ўсіх гасцей*).

Гаспадар. Эх, чарачка-каточак, каціся ў раточак, каб не балеў жываточак.

Гаспадыня. Талака, талака — талачыстая, даў мне Бог мужыка наравістага. Я яго норавы хутка разведала, сабрала дружыначку — ды паабедала.

Дачка. Ах вы, столікі мае цясовенькія, што ж вы стаіце, быццам бы не засланыя? А вы, госцейкі любоўненькія, чаго сядзіце невясёлыя?

1-ая талачанка. Бо гаспадынька сядзіць у куточку, дзяржыць бутэлечку ў падалочку. На мілага міргаіць, ківаіць: "Не пі, мілы, гарэлку — пакідай к заўтраму на пахмелку, будзем раненька ўставаці — усю талаку пахмяляці".

Гаспадыня. Гарэлачка ў бочачцы — напіся колькі хочацца. Напіся, праспіся — толькі са мною не сварыся.

2-ая талачанка. Ой, цяжка, цяжка, калі не поўная пляшка, няма каму даліваці — некага частаваці.

Гаспадыня. Гарэлка без агню нутро паліць.

Гаспадар. І певень бы піў, каб хто наліў. (*Налівае і частуе талачанак.*)

За сталом госці гамоняць, жартуюць, пяюць песню "Мы тваё полечка".

3-яя талачанка (*суседцы*). Панскіх груш не руш, калі пагніюць — самі дадуць.

1-ая жняя. Абяцаў Бог даць, але казаў пачакаць.

1-ая талачанка. Гаспадыня, нясі нам хоць малака!

Гаспадыня. Карова не доіцца.

2-ая жняя. Тады налівай смятаны!

Гаспадар. Хіба не бачыш, суседачку, клёцкі?

2-ая жняя. Дзякуй за клёцкі — паліўка ў зубы налезла.

Гаспадыня (*выносіць хлеб*). Частуйцеся, госцейкі, хлеб — не зяць, добрыя людзі з'ядзяць.

2-ая талачанка. З мядком і цвік праглынеш.

3-яя жняя. Добраму жывату і камень не пашкодзіць.

4-ая талачанка. Што праўда, то праўда, каб не ежка і адзежка — была б грошай поўная дзежка.

4-ая жняя. Просім гаспадара для рызыкі, каб зайгралі музыкі.

Ст. жняя. Гаспадарам паскакаць, нам добра пагуляць!

Гаспадар. Аказаўся я дома, але ж ездзіў да Шклова — чарачак пакупаці, талачаначак частаваці, музыкамі забаўляці. (*Падыходзіць да музыкаў, гаворыць з імі, выводзіць гаспадыню ў танец, танцуе, да іх далучаюцца іншыя пары.*)

Гаспадыня. Хто не ўмее танцаваць, таму нават хлеба не даваць!

Гаспадар. Ні капусты, ні бацвіння, хай гультай пасе свінні.

Гаспадары танцуюць.

Ст. жняя. Танец — не работа, але хто не ўмее — срамота.

Гаспадар запрашае на танец ст. жняю. Пяюць песню "Гэй, сусед".

Гаспадар. А што галаве да ног — няхай патопчуць.

Ст. жняя (*гаспадару*). Натачыў норкі да чужой жонкі.

Гаспадар. Чужая жонка — як асіна горка, а свая маладзенька — як мёд саладзенька.

1-ая талачанка. Эх, папалася ліса ў пастку ды кажа: "Хоць рана, а прыходзіцца заначаваць".

Гаспадыня. Ах, восень, восень — цемната, дзе, дзе падзелася мая красата? (*Ідзе да гаспадара.*) За табою мілы, за табою, за тваёй неразумнай галавою.

Ст. жняя. Жонка — не лапаць, з нагі не скінеш.

Гаспадыня (*у адказ*). Пасею я тры лёшкі цыбулі, каб мае асуднічкі судзілі, што я добрая гаспадыня, і паснулі. Пасаджу я тры лёшкі шалфею, каб асуднічкі ўсе пашалелі. Дай, Бог, таму трылетняя трасца, хто судзіць і гаворыць аб чужое шчасце.

Ст. жняя. Не гневайся, гаспадынечка, жартуем.

Гаспадыня. Давай лепш патанцуем!

Ст. жняя. Грай, музыка, каб ты здох, не шкадуй ты маіх ног!

Гучыць полька "Пасялушачка". Усе танцуюць.

Ст. жняя. Ну што ж, дзякуй вам, гаспадары!

1-ая талачанка. Бывайце здаровы, добрыя суседзі.

1-ая жняя. Просім не судзіць нас, спамяніце добрымі словамі.

2-ая талачанка. Дай, Божа, гаспадары, абсяваць, насяваць, а нам жаць-дажынаць.

2-ая жняя. Трэба развітацца.

3-яя талачанка. Дзякуем за пачастунак.

Гаспадар. Дзякуем вам, што дапамаглі.

Ст. жняя. Каб у вашым дамочку, садочку, хлявочку ўсё радзіла, пладзіла.

1-ая талачанка. Каб любіліся як галубочкі ў гняздочку.

Гаспадыня. А вам — шчасця і долю.

Гаспадар. І хлеба ўволю.

Гучыць развітальная песня "І спасіба і таму".

(Матэрыял выкарыстаны з тома "Восеньскія і талочныя песні". Мн., 1981. Музычная апрацоўка аўтара.)

Янка Кірчук

Песенны матэрыял да сцэнарыя "Дзе пачую талаку — туды ногі валаку"

А мае вы мілы бабачкі



А мае вы мілы бабачкі,
Вы пажніце маё жыцейка.
Вы пажніце маю белу яр.
Пабярыце канапелечкі,
Пакапайце мае градачкі,
Пакажыце мне парадачкі, парадачкі.

Паплаціш, Іванька



Паплаціш, Іванька, талачаначкам.
Маладым дзевачкам па чырвончыку,
Маладым важтайчыкам па рубельчыку.

Доля наша



Ці наша доля такая,
Што наша гаспадыня скупая?
Што да нас не прыходзіць,
Ні сыру, ні масла не носіць?
На полі хлопцы застаяліся,
Мы песень розных наспяваліся.

Таўкучы, мелючы



Таўкучы, мелючы, дай замарылася[1].
Сеяла мучыцу дай апылілася.
Выйшла на вуліцу — скалыхнулася.
Рабэтка мая уся, ой, пыльная.
Усім суседзям дай не завідная.

[1] Кожны радок паўтараецца два разы.

Доля наша худая

(*жартоўная*)



Доля наша, доля худая,
Гаспадынечка скупая, скупая.
Пад падолам бутэлькі хаваіць, хаваіць.
Свайму міламу міргаіць, міргаіць.
У кубэльцы хлеб і сыр хаваіць, хаваіць.
Свайму міламу міргаіць, міргаіць.

Не расці чабору

(*жартоўная*)



Не рас_ці ча_ бо_ ру бліз_ ка да_ро_ гі.
А у на_шых у хлап_цоў ды кры_ вы_я но_ гі.
Дай_це ім ды ка_чар_гу а_ пі_ ра_ ці_ ся.
Дай_це ім а_мыт_ ку аб_ці_ ра_ ці_ ся.
Та_ ла_ ка, та_ ла_ка, у нас та_ло_чыц_ ца,
Ой, а на_ шай та_ла_цэ ес_ ці хо_ чац_ ца.

Не расці чабору блізка дарогі.
А у нашых у хлапцоў ды крывыя ногі.
Дайце ім ды качаргу апірацца.
Дайце ім амытку абцірацца.
Талака, талака, у нас талочыцца,
Ой, а нашай талацэ есці хочацца.

Выйдзі, выйдзі, гаспадарочку



Выйдзі, выйдзі, выйдзі, гаспадарочку.
Спатыкай ты з усім збожжам талаку.
Пакланіся пані талацэ найніжэй.
Пасадзі яе на куце што ёсць найвышэй.
Пакланіся пані талацэ каркам.

Упаі, Іванька, талаку сваю



Упаі, Іванька, талаку сваю, сваю.
Каб твая талока вясёла была, была.
Каб ішлі з талакі, пахваляліся ўсе, усе.
Упаі, Іванька, талаку сваю, сваю.

Адчыняй, Іванька



Адчыняй, Іванька, вароты, вароты.
Ідуць жнеі з работы, з работы.
Адчыняй, Іванька, і другія, другія.
Ідуць жнеячкі маладыя, маладыя.
Ой, нясуць сярпочкі залатыя, залатыя.

Мы тваё полечка



Мы тваё полечка ўсё разведаем,
Мы твае нівачкі пазатрасаем,
Мы твае хлявочкі павычышчаем.
Заплаціш вазнічкам хоць па грыўнічку,
А сваім капачам па рубельчыку.

Гэй, сусед

(*талочная, жартоўная*)





Гэй! Гэй, сусед, сусед,
Падвяжы штаны.

Гэй! Гэй, сусед, сусед,
Прынясі нам квасу.

Гэй! Гэй, сусед, сусед,
Чатыры жбаны.

Гэй! Гэй, сусед, сусед,
Напаі ты нас.

Пасялушачка

(*жартоўная*)



На мяне казалі: пасялушачка.
Я у свайго таткі весялушачка.
На мяне казалі: па сялу хаджу.
А я у Івана работку раблю.
На мяне казалі: горка п'яніца.
Я у свайго таткі дай работніца.

І спасіба і таму



І спасіба і таму, у чыім мы даму.
Хлебам, соллю накарміў, півам, квасам напаіў.
Пугу ў ручкі ўсім нам даў і дарожку паказаў.
І спасіба і таму, у чыім мы даму!





СВЯТА САДАВІНЫ

Яблычны Спас (Спас, Другі Спас, Вялікі Спас, Іспас) — 6 жніўня ў каталікаў, 19 жніўня ў праваслаўных.

ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І

Калі кепска родзяць яблыні або грушы, то трэба дзерава абвязаць саломаю на тры Куцці: перад Калядамі, Вадохрышчам і Новым годам.

Серж., с. 73

На Куццю перад Калядамі абвязваюць у саду дзераўлякі саломаю, абсыпаюць іх куццёю, каб лепш радзілі.

Серж., с. 64

Дзеля захавання садоў ад веснавых маразоў, якія нішчаць цвет, ставяць на ноч бочачкі ці ночвы з вадою ці працягваюць уздоўж ці ўпоперак саду нітку.

З той жа мэтаю абвязваюць на другую Каляду кожнае дрэва саламяным вязьмом, што лічыцца захавальным сродкам і ад чарвякоў.

Романов. Внешний быт, с. 140

Калі "дуліна" (ігруша) ці яблыня гатовая ўсохнуць, трэба выліць пад корань цёплую цялячую кроў і бегчы прэч як мага хутчэй, не азіраючыся.

Ник., с. 127

Калі дзерава цвіце, але на ём не растуць ігрушы або яблыкі, то трэба пад корань падліць крыві тае свінні, якую колюць перад Калядамі.

З маладое яблыні або йгрушы трэба тры гады зрываць цвет, то на том дзераве потым будзе вялікі ўраджай.

Пакуль яблыкі або грушы не паспеюць, дзерава няможна трасці, бо на другі год нічога не ўродзіць, а трэба толькі зрываць рукамі ці абіваць аскабалкам.

Серж., с. 73

Як вясною стаіць сухавеіца, то ў садах усё прападзе.

Серж., с. 65

Жывой яблыні і грушы нельга ссякаць, бо, як вядома, на гэтых дрэвах звычайна адпачывае "Прачыста-Матка", калі сыходзіць на зямлю.

Ник., с. 127

Жанчына не павінна залазіць на садовыя дрэвы, бо высахнуць.

Wisła, XVII/3, s. 278

(Васілевіч, 1996. С. 332—333)

ДАКРАНІСЯ ДА ЯБЛЫКА

(*гульня*)

Для гульні патрэбна мець вяровачку даўжынёй 3—4 метры з прывязаным да аднаго з яе канцоў мячом (шапкай, шышкай і г.д.) — "яблыкам". "Яблык" перакідваюць цераз упор (галінку, сучок, крук), а канец вяровачкі прывязваюць да калочка, непадалёку ўбітага ў зямлю. "Яблык" падвешваюць на такой вышыні, каб яго, падпрыгнуўшы, мог дастаць самы малы гулец. Затым усе гуляючыя выстройваюцца ў шарэнгу ў адпаведнасці з ростам. Гульню пачынае самы малы. Прыгнуўшы з месца ўгору, ён павінен дакрануцца да "яблыка". Калі гэта зробіць, "яблык" падымаюць угору на адзін віток вакол калочка. Той, хто не змог дакрануцца да "яблыка", выбывае з гульні. Калі кожны гулец зробіць адну спробу, "яблык" падымаецца на некалькі віткоў угору, і гульня паўтараецца.

Перамагае той гулец, пасля ўдачнай спробы якога ніхто не зможа дакрануцца да "яблыка".

(Грудзінскі, 1993. Зап. у в. Дулебы Бярэзінскага р-на)

ЗАЛАТАЯ ЯБЛЫНЬКА

(*казка*)

Жыў дзед і баба. І былі ў іх дочкі — дзедава дачка і бабіна дачка. Дзедаву дачку звалі Галя, а бабіну — Юля.

Баба сваю родную дачку песціла, даглядала, а дзедаву ў чорным целе трымала і ўсё шукала прычэпкі, каб са свету яе звесці.

Пайшоў аднойчы дзед на кірмаш, купіў бычка-трацячка. Прывёў дахаты і кажа дочкам:

— Будзеце пасвіць яго па чарзе — адна дзень і другая дзень.

Пагнала ў першы дзень бычка на пашу дзедава дачка. Злая мачыха дала ёй верацяно і мех кудзелі.

— Глядзі, — кажа, — каб за дзень усю кудзелю спрала, кросны выткала, палатно выбеліла і ўвечары дамоў прынесла. А калі не зробіш — не жыць табе.

Вывела Галя бычка з хлява, пагладзіла па шыі і пагнала на пашу. Гоніць, а сама горкімі слязьмі заліваецца.

Бычок пытаецца:

— Дзеўка-дзявіца, русая касіца, чаго плачаш?

— Як жа мне не плакаць, бычок? Загадала мне мачыха мех кудзелі спрасці, кросны выткаць, палатно выбеліць і ўвечары дамоў прынесці... Ці ж зраблю я гэта за дзень?

— Не плач, — адказвае бычок, — гані мяне на шаўковую травіцу, на свежую расіцу, там мы што-небудзь прыдумаем.

Прыгнала Галя бычка на шаўковую травіцу, на свежую расіцу. Наеўся бычок, напасвіўся, а потым і кажа:

— Цяпер кладзі мне ў правае вуха кудзелю і верацяно. А сама хукні ў левае вуха і глядзі, што будзе.

Палажыла Галя бычку ў правае вуха кудзелю і верацяно, хукнула ў левае вуха і глядзіць. Аж там — кудзеля прадзецца, кросны ткуцца, палатно беліцца і ў сувой скочваецца.

Як усё было зроблена, выняла Галя гатовы сувой палатна і вясёлая пагнала бычка дахаты.

Злая мачыха сустрэла яе на двары:

— Ну што, спрала кудзелю?

— Спрала, — кажа Галя і падала ёй гатовы сувой палатна.

Мачыха аж за галаву хапілася: такую работу зрабіла яе падчарка! А тут і суседкі прыйшлі — дзівяцца, якое тонкае палатно выткала Галя. Усе хваляць яе, не нахваляцца.

Прыйшла чарга гнаць бычка бабінай дачцэ Юлі. Дала ёй маці верацяно і паўмеха кудзелі.

— Спрадзі, — кажа, — дачушка, гэтую кудзелю і вытчы палатно яшчэ лепшае, чым выткала твая нянародная сястра. Хачу, каб цябе людзі хвалілі, а не яе.

Узяла Юля тоўсты дубец і пагнала бычка. Гоніць ды ўсё хвошча яго дубцом. Бычок давай кідацца туды-сюды, а Юля бегае за ім, кляне на чым свет стаіць. Бегала, бегала і верацяно згубіла.

Прыгнала яна бычка сяк-так на голы выган, палажыла кудзелю, а сама спаць уклалася. Бычок пабэрсаў кудзелю нагамі і ў гразь утаптаў.

Прачнулася пад вечар Юля, глядзіць — кудзеля ў гразь утаптана... Схапіла яна дубец ды давай бычка біць. Бычок пабег дахаты, і яна за ім з крыкам.

Дома маці пытаецца ў яе:

— Ну як, дачушка, зрабіла работу?

— Ды не, — кажа дачка.

— Чаму?

— Бычок вінаваты. Праз яго я верацяно згубіла, а потым яшчэ ён і кудзелю маю ў гразь утаптаў...

Узлавалася мачыха на бычка. Пайшла да дзеда і кажа:

— Зарэж, дзед, бычка!

— Ці не здурнела ты, баба? — здзівіўся дзед. — Навошта нам яго рэзаць?

Тут баба як затупае нагамі, як накінецца на дзеда з кулакамі:

— Калі не зарэжаш, дык я цябе выганю разам з тваёю дачкою!

Нічога не парадзіш — згадзіўся дзед зарэзаць бычка.

Пачула гэта Галя, пабегла ў хлеў да бычка, абняла яго за шыю і залілася слязьмі.

— Дзеўка-дзявіца, русая касіца, чаго ты плачаш? — пытаецца бычок.

Расказала яму Галя, што надумалася зрабіць злая мачыха.

— Не плач, дзеўча, — кажа бычок. — Лепш паслухай, што я табе параю. Як зарэжуць мяне, вазьмі маю печань, і там знойдзеш залатое зярнятка. Пасадзі тое зярнятка ў садку каля хаты. Вось і ўсё.

Галя так і зрабіла, як сказаў бычок.

Выросла з зярнятка яблынька з залатымі яблыкамі.

Хто ні ідзе ці ні едзе каля садка — усе дзівяцца з залатой яблынькі.

Ехаў аднойчы з вайны прыгожы малады гусар. Убачыў яблыньку і спыніўся. Працягнуў руку да яе, каб сарваць залаты яблык. А яблынька — дзын, дзын, дзын! — і паднялася ўгору. Апусціў гусар руку — яблынька зноў стала на сваё месца.

Убачыла гэта праз акно Галя і кажа да мачыхі:

— Пайду я сарву гэтаму прыгожаму гусару адзін яблычак.

А мачыха як затупае на яе, як закрычыць:

— Я табе галаву сарву!

Схапіла яна Галю ды пасадзіла пад карыта, а ў садок паслала Юлю: няхай, думае, лепш родная дачка сарве гэтаму гусару яблыкі, можа, ён закахаецца ў яе...

Падышла Юля да яблынькі, а тая — дзын, дзын, дзын! — і паднялася ўгору. Узлавалася Юля, пачала яе лаяць апошнімі словамі.

А тут якраз па двары хадзіў пеўнік. Ускочыў ён на плот і кукарэкае:

— Ку-ка-рэ-ку! Дзедава дачка пад карытам схавана, а бабіна хоча яблыкі яе сарваць ды выйсці замуж за пана...

Пачуў гэта гусар, злез з каня і пайшоў у хату. Знайшоў там пад карытам дзедаву дачку. Як зірнуў на яе, дык і вачэй не можа адарваць: так яна яму спадабалася.

— Дзеўка-дзявіца, — пакланіўся ёй гусар, — сарві мне на памяць залаты яблык са сваёй яблынькі.

Падышла Галя да яблынькі — і ўсе яблыкі ўпалі да яе ног.

Сабрала яна іх у прыпол, прынесла гусару. Гусар падхапіў яе, пасадзіў на каня побач з сабою і павёз да сваіх бацькоў.

Дома яны згулялі вяселле і сталі жыць-пажываць у згодзе ды ў ладзе. Нарадзіўся ў іх сын, ды такі прыгожы, што бацькі не нацешацца з яго.

Тым часам злая мачыха ніяк не магла спаць ад зайздрасці, што гусар не яе дачку, а дзедаву замуж узяў. І ўсё думала, як жа яе са свету звесці.

Аднаго разу кажа яна сваёй дачцэ:

— Схадзі ты, дачушка, да сястры ў госці. Пакліч яе з сабою купацца ды ўтапі...

Паслухала Юля маці, пайшла ў госці да сястры. Падгаварыла яе купацца. І кажа:

— Сядзь ты, сястрыца, на кладцы, я табе плечы памыю.

Села Галя на кладцы, а Юля скінула яе ў ваду і пабегла дахаты. Чакаюць дома Галю — няма. Малы сын плача, ніхто суцешыць не можа. Узяла яго нянька на рукі, пайшла ўздоўж рэчкі гукаючы:

— Галя, Галюся, твой маладзён плача, есці хоча. Куры спяць, гусі спяць, адзін ён не ўсыпаецца, маткі не дачакаецца...

І чуе яна голас з вады:

— Ой цяжка мне выйсці да сына: камень ногі падбівае, вада вочы залівае...

Пачуў малы сынок матчын голас і яшчэ мацней заплакаў.

— Ой іду, сынок, ой бягу, — адгукаецца маці. — Слухаць плач твой, сынок, не магу.

Выйшла маці з вады, накарміла сына, — ён і заснуў. А сама назад пайшла.

Вярнулася нянька дадому, расказала, што было каля рэчкі.

Назаўтра сам бацька ўзяў залаты яблык і сына ды пайшоў да рэчкі. Прыйшоў на бераг і гукае:

— Галя, Галюся, твой маладзён плача, есці хоча. Куры спяць, гусі спяць, адзін ён не ўсыпаецца, цябе не дачакаецца...

Пачула маці сынаў голас і адказвае:

— Ой іду, сынок, ой бягу: слухаць плач твой, сынок, не магу.

Выйшла яна на бераг, накарміла сына, — ён і заснуў. Тады муж дастаў з кішэні залаты яблык і даў жонцы. Як толькі ўкусіла яна залаты яблык — адразу апрытомнела.

Зарадаваўся муж, прывёў яе дадому. Сталі яны зноў жыць добра і шчасліва.

А злую мачыху з яе дачкою больш да сябе і на парог не пускалі.

(БНК, 1990)

БЕЛАРУСКАЯ КУХНЯ

Грушы ў мёдзе

Плады без лупіны вараць у мядовым сіропе, напалову разбаўленым вадой. Калі грушы лёгка будзе пракалоць саломінкай, іх выкладваюць на бляху і ставяць у цеплаватую печ. Тым часам мядовы сіроп, дзе яны варыліся, даводзяць на агні да гушчыні чыстага мёду. Вынятыя з печы грушы абмакваюць у сіропе і зноў на блясе засоўваюць у печ. Гэта паўтараюць тры ці чатыры разы. Астуджаныя грушы захоўваюць у гаршках сухімі ці заліваюць тым загусцелым сіропам.

Апельсінавыя лупіны ў мёдзе

Лупіны з апельсінаў гатуюць у рачной вадзе. Як толькі яна пачне гарчыць, сцэджваюць, заліваюць лупіны свежай гарачай вадой і вараць у вялікай пасудзіне. Абавязкова сочаць, каб не прыгарэлі. Калі яны зробяцца мяккімі, іх раскладваюць на палатне і выціскаюць вільгаць. Потым высыпаюць у мядовы сіроп, ачышчаны кіеўскім спосабам[1], і павольна гатуюць, каб не пераварыліся і не сцвярдзелі. Вараныя толькі ў мёдзе без вады таксама сцвярдзеюць.

Яблычны мармелад

Кіслыя яблыкі, без лупіны і асяродка, разразаюць на чатыры часткі, кладуць у новы гаршчок і наліваюць столькі вады, каб яна пакрыла плады. Потым аблепліваюць пасудзіну цестам ці пакрываюць мокрым кавалкам палатна і ставяць у печ. Калі яблыкі адразу добра не спякуцца, засоўваюць у печ яшчэ раз. Пасля вымаюць, праціраюць праз сіта, дабаўляюць у ачышчаны мёд і гатуюць да належнай гушчыні, часта памешваючы, каб мармелад не прыгарэў. Перш чым зняць з агню, насыпаюць трохі апельсінавых лупін, што перад гэтым варыліся ў вадзе да мяккага стану. Астуджаны мармелад выкладваюць у каменныя ці паліваныя гаршкі і яшчэ раз ставяць у цеплаватую печ дзеля таго, каб паверхня яго згусцела і трохі засохла, што захавае мармелад ад псавання.

Часам працёртыя яблыкі кладуць у натуральны мёд, не разведзены вадой, — гэта робіць садавіну больш стойкай. Колькасць яго бяруць на свой густ. Хто любіць салодкасць, той дае мёду і яблык пароўну. Для менш салодкага варэння дастаткова ўзяць чацвёртую частку мёду і тры часткі яблык. Такая прапорцыя і для ўсіх ягад.

Гэткім жа чынам вараць мармелад з агрэсту.

Яблычны сыр

Гатуецца амаль што так, як і апісаны вышэй мармелад. Але печаныя яблыкі праціраюць праз больш густое сіта і дадаюць у падрумянены мёд без вады. Мёду і яблычнай масы бяруць аднолькавую колькасць. Вараць, увесь час мяшаючы, пакуль маса не будзе адставаць ад лыжкі. Перад тым як зняць з агню, акрамя апельсінавых лупін сыплюць яшчэ імбір, гваздзіку і англійскі перац. Потым выкладваюць масу ў папярэдне намочаную ў вадзе і адціснутую сурвэтку, перавязваюць яе і змяшчаюць пад прэс. Выняты з-пад яго сыр захоўваюць у шчыльна накрытай фаянсавай ці глінянай пасудзіне.

---

[1] Калі было цяжка дастаць цукар, яго замянялі мядовым сіропам, прыгатаваным на агні. Падрабязней можна прачытаць у кнізе "Літоўская гаспадыня" на с. 209.

Яблычныя кансервы, названыя ў рускіх пасцілой

Яблыкі добрага кіслага сорту пякуць без вады ў гаршку ці на блясе і праціраюць іх спачатку праз рэшата, а потым праз сіта. Масу адмерваюць, а затым моцна ўзбіваюць венчыкам, каб запенілася і пабялела. Мёду бяруць чацвёртую частку ад колькасці атрыманай масы і таксама расціраюць да пабялення. Потым змешваюць яго з яблыкамі і доўга яшчэ ўзбіваюць венчыкам, пакуль сумесь не зробіцца вельмі пышнай і белай. Тады зліваюць яе ў папяровыя скрыначкі, вышынёй у тры пальцы, ставяць на жалезную бляху, пасыпаную вотруб'ем, і засоўваюць у цеплаватую печ, як для бісквітаў. Праз некалькі гадзін дастаюць, астуджваюць, а потым знімаюць паперу і захоўваюць кансервы ў гаршках. Рускія пякуць іх у лубяных скрыначках, якія можна зрабіць са старых каробак ад капелюшоў.

NB. Для гэтых кансерваў можна ўзяць больш мёду, калі хто любіць салодкае. Напрыклад, на адну частку яго даць толькі дзве часткі яблык, а не тры, як гаварылася вышэй. З цукрам іх таксама можна рабіць. На шклянку масы сыплюць паўшклянкі цукру ці толькі чвэрць яе.

Фаршыраваныя яблыкі ў мёдзе

Абіраюць салодкія яблыкі, раздзяляюць на дзве часткі і, выразаўшы трохі асяродак, вараць у мядовым сіропе, напалову разведзеным вадой. Калі зварацца, кладуць у гэтыя "місачкі" яблычны мармелад, фармуючы з яго зверху даволі вялікія кучкі, і на блясе ставяць у цеплаватую печ пасля таго, як там спяклі хлеб. Калі яблыкі трохі падсохнуць, іх абмакваюць у мядовым сіропе, дзе яны варыліся, папярэдне згушчаным на агні, выкладваюць на жалезную бляху і зноў змяшчаюць у печ. Так робяць яшчэ і трэці раз. Ахалоджаныя яблыкі трымаюць у гаршках.

У кнізе "Літоўская гаспадыня" Ганны Цюндзявіцкай з-пад Менска таксама змешчаны парады, як захоўваць на зіму садавіну, як марынаваць, сушыць яе, варыць рознае варэнне, рабіць жэле, "яблычны сыр", "сыр са слiў", яблычны торт, наліўку, віно, сідр і шмат іншага.





ДАДАТАК

Назвы месяцаў

	Чэрвень	Ліпень	Жнівень
1	2	3	4
Протаіндыйскія	 Muk ul kat — “пара стаячых аблокаў”	 Vet kul — “сухія лісты”	 Kutu vai mal kul — “растучая лютасць навальніц, бура”
Лепясоўка (Кіеўшчына) IV ст.			
Старажытна-славянскія	Изокъ	Чръвенъ	Заревъ
Старажытна-беларускія	Чырвец	Липец	Серпень
Сербахарвацкія	Јун. Липањ	Јул. Српањ	Август. Коловоз
Украінскія	Червень	Липень	Серпень
Польскія	Czerwiec	Lipiec	Sierpień
Чэшскія	Červen	Červenec	Spren
Верхнелужыцкія	Smažnik	Pražnik	Znjeńc
Славенскія	Rožnik	Mali srpan	Welki srpan
Лацінскія (у гонар багіні Юноны ці першага рымскага консула Юнія Брута)	Junius	Quintilis (пяты), перайменаваны ў Julius	Sehstylis (шосты), перайменаваны ў Augustus

1	2	3	4
Нямецкія	Juni	Juli	August
Англійскія	June	July	
Французскія		Juillet	
Рускія	Июнь	Июль	Август
Славацкія	Jún	Júl	August
Балгарскія і македонскія	Юни. Јуні	Юли. Јули	Август
Старажытнаісландскія (год пачынаецца 14 красавіка)	Eggtîd (stecktîd) — "пара севу і нясення яек"	Selmânadr (sôlmanadr) — "пара выгану жывёлы на пашу"	Heyannir (midsumar — сярэдзіна лета) — "пара сенакосу і збору ўраджаю"
Кітайскія	"пачатак лета"— 6—7 мая, "малы дастатак"— 21—22 мая, "каласаванне хлеба" — 7—8 чэрвеня, "летняе сонцастаянне" — 21—22 чэрвеня	"малая спякота" — 7—8 ліпеня, "вялікая спякота" — 23—24 ліпеня	"пачатак восені"— 8—9 жніўня, "канец спякоты"— 23—24 жніўня
Мангольскія	Уер (уйры)	Гуран(хуран)— "дзікі казёл"	Бога "ізюбр"
Французскай рэвалюцыі (з 1793 г.)	Месідор "палявы" (з 19 чэрвеня)	Тэрмідор "спякотны"	Фрукцідор "пладаносны" (да 16 верасня)

Назвы месяцаў народаў Сібіры

Ненецкія	Ванды ирий — "незаконны (ацёл) месяц"	Ненянг ирий — "камарыны месяц"	Пилю ирий — "овадавы месяц" (сярэдзіна лета)
Паўночных селькупаў	Nɛnygal iräty— "камарыны месяц"	Wɔrgy kɔtty iräty — "вялікіх нарыхтовак месяц"(а таксама — вялікі, мошкі, сярэдзіны лета месяц)	Wenty iräty — "нельмы месяц"
Паўднёвых селькупаў	Тёпракрассе кутей ирэт — "ягада цвіце месяц"	— » —	Тёпанмизакунта ирэт — "ягаду збіраць месяц"

1	2	3	4
Ляпінскіх мансі	Лупта этпос — “лістоў месяц”	Ойтур этпос — “лугавых азёр месяц” (лавіць рыбу)	Вор тур — “лясныя азёры” (лавіць рыбу)
Эвенкійскія (Ніжняя Тунгуска)	(канец мая — пачатак чэрвеня) Мочун — “пара, калі пачынае выступаць трава”; (сяр. чэрвеня — сяр. ліпеня) Чарулин — “калі з дрэваў здабываюць сок”	(ліпень—жнівень) Канякит — “пара, калі капаюць сабе ў ежу корань сараны”	(сяр. жніўня — сяр. верасня) Иркин — “пара тлусцення аленяў і памяншэння камароў”
Пулымскіх татараў	Кыр дуг ай — “(маленькіх) берагавых загародаў (для лоўлі рыбы) месяц”	Улуг тугай — “вялікіх загародаў месяц”	Ахвалгай (ак палык ай) — “белай рыбы, нельмы месяц”
Тувінцаў-тоджынцаў	Бак тозаар ай — “дрэнна здзіраючай бяросты месяц”	Эки тозаар ай — “добра здзіраючай бяросты месяц”	Айлаар ай — “збору сараны месяц”

Назвы месяцаў ніўхаў Сахаліна і мацерыка

Усходні Сахалін	Аркаил лонг — “месяц карушкі”	Чо тагхр лонг — “міжрыбны месяц”	Машки лонг — “малы месяц”
Заходні Сахалін	Тыть лонг — “месяц лоўлі плаўнай сеткай”	Вал тенги лонг — “месяц лоўлі і сушкі гарбушы”	Пила чрар лонг — “вялікі перапынак у лоўлі”
Усходні Сахалін	Тэнги лонг — “месяц гарбушы”	Нгаскаф ксурк лонг — “растае тлушч на ластах здабытых нерпаў”, “самы спякотны месяц”	
Ракі Амур	Ческ лонг — “лоўля сеткай чэскаў” Ныкрш чэу лонг — “збор лопуху ныкш”	Тенги вота лонг — “лоўля, сушка гарбушы”	Лыгн вота лонг — “лоўля, сушка кеты”

МАЦЕЙ І АЎДЗЕЙ НА ВЯЧОРКАХ У ХРЫСЦІ

(сцэнарый для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту)

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Мацей
Жонка Мацея — Тэкля
Аўдзей
Жонка Аўдзея — Фёкла
Дачка Фёклы — Зося
Галя
Каваль
Хрысця
Музыкі або спеўны гурт

Здалёк чуецца песня "Паехаў Лэйзар на базар"[1]. На сцэну выходзяць Мацей і Аўдзей.

Мацей. Здароў, Аўдзей! Кажуць, хварэў?

Аўдзей. А, паправіўся ўжо — пляваў на грудзі, цяпер на бараду. Кепска мы жывём, Мацей, з нашымі бабамі. Вось калі ты еў курку?

Мацей. Калі быў хворы або курка хвора!

Аўдзей. А каб цябе рак убрыкнуў, які ты жартаўнік!

Мацей. А каб цябе качкі стапталі, пойдзем сёння на вячоркі?

Аўдзей. Пойдзем. Сёння збіраюцца ў Косціка Марашэўскага, а калі ў той раз былі ў Гэнека Пачапоўскага, дык у мяне ўкралі срэбну бранзалетку.

Мацей. Ну?!

Аўдзей. Дык я прапанаваў пагасіць святло, каб злодзей палажыў бранзалетку, але калі святло запалілі, дык знік і срэбны паднос.

Мацей. Во як?! Каб яму вочы павылазілі, але ж пойдзем.

У хаце ў Хрысці сядзяць дзяўчаты, спяваюць песню "Ой, на горы каліна". У хату заходзяць яшчэ дзяўчаты.

Дзяўчаты. Добры вечар у хату!

Хрысця. Добры-добры! Праходзьце, ды не тапчыцеся на парозе, як цецерукі пад кустом.

Зося. І чаго ж гэта наша Хрысця вясёлая? Смяецца, як свянцонае парася.

Хрысця. А мяне мужык адзеў з ног да галавы за адну палучку.

Зося. І што ж ён табе купіў?

Хрысця. Панчохі і грэбень!

Прыходзяць яшчэ дзяўчаты.

Дзяўчаты. Добры вечар, бабанькі!

Хрысця. Галя? Далібог, Галя! Але ж не пазнаеш! Кажуць, баба тады пышна, як замуж выйшла!

Усе смяюцца.

---

[1] Песенны матэрыял да сцэнарыя гл. на с. 143.

Галя. А вы б усё смяяліся, пакуль жываты не парваліся! Мацей і Аўдзей зноў на вячоркі пхнуцца!

Хрысця. Глядзіш, за імі і жонкі прыцягнуцца ды хоць налаюцца ўволю!

Галя. А ім з сямі вёсак сабак нагані, і то адбрэшуцца! Але давай, Хрысця, папяём!

Спяваюць песню "Ой, пайду я на място, на място". Стук у дзверы, заходзяць Мацей і Аўдзей.

Мацей і Аўдзей. Добры вам вечар, кабеткі вы нашы мілыя.

Галя. Ой, прыйшло гасцей з усіх валасцей!

Хрысця. Зараз прычэпяцца, як рапей да кажуха!

Зося. Адзін чорт іх маляваў!

Хрысця. Хай сядзяць, кажуць, чаго няма — таго хочацца!

Галя. Бабы, я такіх мужыкоў прадала б, як гусакоў!

Спяваюць песню "Жана мужа прадала". Чуецца песня "Ой, як я ехаў" — гэта на вячоркі ідуць хлопцы. Заходзяць у хату.

Хлопцы. Добры вечар, бабачкі!

Хрысця. Швэндаецеся, замружыўшы вочы, байбусамі павырасталі, а розуму не вынеслі.

Мацей. Чаго цябе разбірае? Хай сядзяць, бо хату растрасуць. Сядайце, хлопцы.

Галя. А-ёй, і каваль тут!

Каваль. Я і стар не магу, я і слаб не магу, а як пачую, што вячоркі, — ашалеўшы прыбягу!

Усе танцуюць і спяваюць песню "Кавыль-кавыль, кавылёчак".

Каваль. Як мне выразіць удзячнасць за такую добрую песню?

Хрысця. Ад таго часу як выдумалі грошы, гэтакіх пытанняў ніхто не ставіць!

Каваль. А што хочаце: пяцірублёвы залатнік чы папяровую пяцёрку?

Хрысця. Хочам залатнік, укручаны ў папяровую пяцёрку.

Каваль. Няхай вас, пачалі смаргонскую палітыку, ляпей спявайце што.

Спяваюць песню "Як паехаў малдаван ў чыста поле по бур'ян". Пакуль спяваюць гэту песню, на краі сцэны або ў зале сустракаюцца Тэкля і Фёкла.

Фёкла. А, Тэкля, куды ляціш?

Тэкля. А, шукаю свайго Мацея, кажуць, пацягнуўся з тваім на вячоркі.

Фёкла. Пойдзем разам. Даўно цябе не бачыла, як жывеш?

Тэкля. А! Мы з Мацеем сустракаліся, дык цалаваліся, а як у адну хату сышліся — дык за чубы ўзяліся!

Фёкла. А ў мяне? Ёсць што піць, ёсць што есць — ды няма з кім жыць! Мой Аўдзей — дурны, як варона, а хітры — як чорт, у будні хварэе, а ў свята дурэе.

Тэкля. У сям'і не без вырадка. Мой, як есць — дык пацее, а працуе — як старога за бараду цягне. Але ж пойдзем хутчэй!

Заходзяць у хату.

Фёкла і Тэкля. Добры вам вечар!

Усе. Добры.

Мацей. Буба бубу прывяла!

Фёкла (*убачыўшы сваю дачку*). І ты тут, гора маё чубатае, ніхто цябе не сватае?

Зося. Мама, Паўла просіць маёй рукі.

Фёкла. Во! Зяцем пахне! Але скажы яму, што я ў тваю руку нічога не палажу!

Спяваюць песню "Чобаты, чобаты вы мае!".

Мацей. Ляпей з мядзведзем павідацца, чым з цешчай знацца.

Аўдзей. Крумкач, маўчы, бо пачнуць таўчы!

Мацей. Барані, Божа, ад буры, агню і дурной бабы!

Фёкла. Заліў вочы? Дык зараз прытру рогі!

Мацей. А-ёй! Далікатнай псюрні цюцька! Ляпей спявайце.

Спяваюць песню "Ой, за гаем-гаем, гаем зеляненькім".

Аўдзей. Бабы, а хто з вас загадкі згадае?

Усе. Ну, ну!

Аўдзей. Жывы жывога есць і ў вочы ўзіраецца?

Хрысця. Хіба цмок які?

Аўдзей. Не! Гэта маці дзіця малое корміць.

Мацей. А каб цябе яма завярнула, як ты на гэтыя загадкі спрытны.

Аўдзей. Як змяя гляне, дык лес вяне. Што гэта?

Ціха, усе думаюць.

Аўдзей (*праз хвіліну*). Гэта каса.

Хрысця. Ну і Аўдзей, сам ні ў тры ні ў пяць, ды яшчэ як загадае якую дурніцу, дык не адгадаць! Давайце ляпей патанцуем!

Мацей. Во! Усё б скакалі, жартавалі, спейце што сумнае.

Спяваюць песню "Гаварылі людзі-саседзі".

Мацей. Усяляк людзі гавораць. Хрысця, кажуць, цябе мужык у нядзелю біў?

Аўдзей. Бо ў будні, мусіць, часу не мае.

Зноў спяваюць песню "Мужык жонку б'ець, катуець".

Хрысця. Добра, з мяне пасмяяліся, спейце яшчэ якую вясёлую!

Усе спяваюць песню "Узяў мужык жонку".

Мацей. Кажуць — абое рабое! Але ж тут ёсць і сапраўдная гаспадыня. (*Выводзіць Хрысцю.*) Сёння мы ў яе і папяём, і паскачам.

Усе спяваюць песню "Як у нашай Хрысці".

Мацей. Добра нам тут, у Хрысці, але ж трэба і развітвацца.

Аўдзей. Любіць наш народ папрацаваць, любіць у гэту зямлю душу ўлажыць. А чаму пасля працы ні адпачыць, ні пагуляць на вячорках?

Мацей. А калі ў вёсцы ёсць Мацей, Аўдзей, Тэкля з Фёклай — дык ад іх і жыццё весялей!

Усе выходзяць на край сцэны і спяваюць кант "Чалавек жыве на зямлі...".

Янка Кірчук

Песенны матэрыял да сцэнарыя “Мацей і Аўдзей на вячорках у Хрысці”

Паехаў Лэйзар на базар



Паехаў Лэйзар на базар[1].
Лада-дары, лада-роды,
Ой, Лэйзар на базар.

Кабыла яго, ой,упала.
Лада-дары, лада-роды,
Ой, яго, ой,ўпала́.

Сядзіць Лэйзар дай тужа.
Лада-дары, лада-роды,
Ой, Лэйзар дай тужа.

Маўчы, Лэйзар, не тужы.
Лада-дары, лада-роды,
Ой, Лэйзар, не тужы.

Кожу здымеш — прадасі.
Лада-дары, лада-роды,
Ой, здымеш — прадасі.

З галавы будзе самавар.
Лада-дары, лада-роды,
Ой, будзе самавар.

А з грывачкі шчотачка й.
Лада-дары, лада-роды,
Ой, з грывачкі шчотачка й.

З хваста будуць мяцёлкі.
Лада-дары, лада-роды,
Ой, будуць мяцёлкі.

А з ног будуць качэргі.
Лада-дары, лада-роды,
Ой, будуць качэргі.

Бацькі, матцы і жане.
Лада-дары, лада-роды,
Ой, матцы і жане.

Шчэ й астанецца й табе.
Лада-дары, лада-роды,
Ой, астанецца й табе.

[1] Першы радок кожнай страфы паўтараецца два разы.

Ой, на горы каліна



Ой, на горы каліна[1].
Каліна, каліна,
Чубарыкі-чубчыкі, каліна.

Цвет каліны ламала.
Ламала, ламала,
Чубарыкі-чубчыкі, ламала.

Дай ў пучочкі ўвязала.
Ўвязала, ўвязала,
Чубарыкі-чубчыкі, ўвязала.

На дарожку брасала.
Брасала, брасала,
Чубарыкі-чубчыкі, брасала.

Ды ў маёра попала.
Попала, попала,
Чубарыкі-чубчыкі, попала.

Ты, маёру, брацік мой.
Брацік мой, брацік мой,
Чубарыкі-чубчыкі, брацік мой.

Завядзі мяне дамой.
Мяне дамой, мяне дамой,
Чубарыкі-чубчыкі, мяне дамой.

Ой, пайду я на място, на място



[1] Першы радок кожнай страфы паўтараецца два разы.



Ой, пайду я на място, на място.
Куплю сабе курачку, курачку.
А курачка ходзячы: ту-ру-ру, ту-ру-ру[1].

Ой, пайду я на място, на място.
Куплю сабе качачку, качачку.
А у качкі ножкі плоскі[2],
А курачка ходзячы: ту-ру-ру, ту-ру-ру.

Ой, пайду я на място, на място.
Куплю сабе 'вечачку, 'вечачку.

[1] Апошні радок кожнай страфы паўтараецца два разы.
[2] Пашыраная кампазіцыя: новыя словы ў другой — сёмай строфах спяваюцца за кошт паўтору напеўкі, адзначанай у нотах зорачкамі.

Авечачка: вер-гер-гер,
А ў качкі ножкі плоскі,
А курачка ходзячы: ту-ру-ру, ту-ру-ру.

Ой, пайду я на място, на място.
Куплю сабе козаньку, козаньку.
А козанька: скіку-брыку,
Авечачка: вер-гер-гер,
А ў качкі ножкі плоскі,
А курачка ходзячы: ту-ру-ру, ту-ру-ру.

Ой, пайду я на място, на място.
Куплю сабе кароўку, кароўку.
А кароўка: рыку-рыку,
А козанька: скіку-брыку,
Авечачка: вер-гер-гер,
А ў качкі ножкі плоскі,
А курачка ходзячы: ту-ру-ру, ту-ру-ру.

Ой, пайду я на място, на място.
Куплю сабе коніка, коніка.
А конічак: тупу-тупу,
А кароўка: рыку-рыку,
А козанька: скіку-брыку,
Авечачка: вер-гер-гер,
А ў качкі ножкі плоскі,
А курачка ходзячы: ту-ру-ру, ту-ру-ру.

Ой, пайду я на място, на място.
Куплю сабе возіка, возіка.
А возічак: тара-ра,
А конічак: тупу-тупу,
А кароўка: рыку-рыку,
А козанька: скіку-брыку,
Авечачка: вер-гер-гер,
А ў качкі ножкі плоскі,
А курачка ходзячы: ту-ру-ру, ту-ру-ру.

Жана мужа прадала



Жана мужа прадала,
прадала, прадала,
прадала, дала, дала,
прадала.

Як ўзяла йна пітуха,
пітуха, пітуха,
пітуха, туха, туха,
пітуха.

Дай купіла два пыля,
два пыля, два пыля,
два пыля, пыля, пыля,
два пыля.

Пасеяла грэчыху,
грэчыху, грэчыху,
грэчыху, чыху, чыху,
грэчыху.

Ні ўрадзіла грэчыха,
грэчыха, грэчыха,
грэчыха, чыха, чыха,
грэчыха.

Яй ўрадзіла лібіда,
лібіда, лібіда,
лібіда, біда, біда,
лібіда.

Дай цяпер жа ні біда,
ні біда, ні біда,
ні біда, біда, біда,
ні біда.

Што й прадала мужыка,
мужыка, мужыка,
мужыка, жыка, жыка,
мужыка.

Ой, як і ехаў

Не вельмі скора





Ой, як і ехаў казак на даліну
на сваім быстрым вараным кані.
Ой, ды ён паехаў — Радзіму пакінуў, —
ў край не вярнуўся, у край свой радны.
Ой, яго казачка — жана маладая,
з вутра да вечара на север глядзіць.
Яна ж паглядзіць на север далёкі,
Мужа паджыдаіць, ці скора прыляціць.

Кавыль-кавыль, кавылёчак



Кавыль, кавыль, кавылёчак[1],
Кавылёк, кавылёк, кавылёчак.

Пойдзем, мілы, у садочак,
У садок, у садок, у садочак.

Сарвём, мілы, васілёчак,
Васілёк, васілёк, васілёчак.

Ну-ка, мілы, весяліся,
Весялісь, весялісь, весяліся.

Каб галоўка не балела,
Каб галоў, каб галоў не балела.

Каб душа твая запела,
Каб душа, каб душа, каб запела.

[1] Кожны радок паўтараецца два разы.

Як паехаў малдаван ў чыста поле по бур'ян



Як паехаў малдаван ў чыста поле по бур'ян.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.
Бур'яну ён не прывёз — паламаўся яго воз.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.

А ні вала, а ні спіц, поўна брычка маладзіц.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.
Усю ноч ён піраваў, па тры рублі дараваў.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.

Асталося тры чырвонцы, куплю хусту сваёй жонцы.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.
Вазьмі, жанка, завяжысь дай да кума пакажысь.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.

Ой, пайду я да папа, а у папа гоп-па-па.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.
Як прыйшла я ад папа: мужычочак, я слаба.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.

Мужычочак, я слаба — баліць мая галава.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.
Баліць мая галава, шчэй калена, шчэй нага.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.

Лягай, жонка, ў падушкі, я паеду па лекі.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.
Як паехаў у лясок, нарубаў ён палачок.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.

Нарубаў ён палачок, ад дзявочых балячок.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.
Як пачаў ён лекаваць — стала й шкура адставаць.
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.

А хто ж цябе так вучыў, штоб ты мяне так лячыў?
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.
Вучыў мяне поп і дзяк, бо ён сваю тожа так!
Тра-ля-ля-ля-ля-ля-ля.

Чобаты, чобаты вы мае



А дзе ж тыя чобаты, што зяць даў,
А за тыя чобаты дачку ўзяў?
Чобаты, чобаты вы мае,
Ў чом дзела не робіцца за мяне?

Я павешу чобаты на кручку,
Пайду дзела дзелаці за дачку.
Чобаты, чобаты вы мае,
Ў чом дзела не робіцца за мяне?

Я на рэчку йшла, чобаты рыпелі,
А як з рэчкі йшла, дык слёзкі хліпелі.
Чобаты, чобаты вы мае,
Нарабілі клопату, ой, вы мне!

Ой, за гаем-гаем, гаем зеляненькім



Ой, за гаем-гаем, гаем зеляненькім,
Там арала дзяўчоначка волікам чарненькім.

Ой, яна й арала, дай ня ўмела раці,
Дай наняла дударыка на дудачцы граці.

А дударык грае, дзевачак гуляе,
Чорт яго бацька знае, на каго маргае?

Ці на сівы валы, ці на каровы,
Ці на маё бела лічка, ці на чорны бровы?

“Я й ні на вала, я й ні на карову,
А на тваё бела лічка і на чорны бровы.

Ой, дзевачка Галя, хадзем валандаймо,
Пакуль волы паядуць, то мы пагуляймо”.

Гаварылі людзі-саседзі



Гаварылі людзі-саседзі, што да мяне брацейка едзе.
Я яго ждала, ўсю ночку не спала, варата пааткрывала.
Ка мне брацец едзе ды едзе, варота мінае, мінае.
Ночка цёмна, а зоранька ясна — така мая доля нішчасна.

Гаварылі людзі-саседзі, што да мяне баценька едзе.
Я яго ждала, ўсю ночку не спала, варата пааткрывала.
Ка мне бацька едзе ды едзе, варота мінае, мінае.
Ночка цёмна, а зоранька ясна — така мая доля нішчасна.

Гаварылі людзі-саседзі, што да мяне мамінька едзе.
Я яе ждала, ўсю ночку не спала, варата пааткрывала.
Ка мне маці едзе ды едзе, усё людзей пытае, пытае:
“Як мая дочка й, дочка адзіночка, на чужбіне пражывае?”

Гаварылі людзі-саседзі, што да мяне міленькі едзе.
Я яго ждала, ўсю ночку не спала, варата пазакрывала.
Ка мне мілы едзе ды едзе, вароты ткрывае, ткрывае!
Ночка цёмна, а зоранька ясна — така мая доля прэкрасна!

Мужык жонку б'ець, катуець



Мужык жонку б'ець, катуець, ніхто ж яе не ратуець.
"Свякроўка, матухна, паратуй мяне, маладую!"
Свякровачка выбягаець, нагаечку падымаець:
"Бей, сынку, бей, бей, навучай, на свой абычай пераварачай".

Мужык жонку б'ець, катуець, ніхто ж яе не ратуець.
"Свекарка, татухна, паратуй мяне, маладую!"

А свекарка прыбягаець, нагаечку падымаець:
“Бей, сынку, бей, бей, навучай, на свой абычай пераварачай”.

Мужык жонку б’ець, катуець, ніхто ж яе не ратуець.
“Дзеверка-брахнейка, паратуй мяне, маладую!”
Дзеверачка прыбягаець, нагаечку падымаець:
“Бей, брацец, бей, бей, навучай, на свой абычай пераварачай”.

Мужык жонку б’ець, катуець, ніхто ж яе не ратуець.
“Залоўка-сястрыца, паратуй мяне, маладую!”
Заловачка прыбягаець, нагаечку атымаець:
“Ох-ох-ох, гора мне, на чужой старане будзе гэта мне”.

Узяў мужык жонку



Узяў мужык жонку, не знае, што рабіці,
Запрагае ў барану, едзе бараніці.
Ой, ты, Галя, Галя маладая,
Тра-ля-ля, ля-ля, ля-ля-ля-ля,
Тра-ля-ля-ля, ля-ля[1].
Выпрагае з бараны, запрагае ў плужа:
"Ары, ары, мая міла, пакуль яшчэ дужа!"

Прыехаў дадому, падае салому:
"Ежы-ежы, мая міла, ты цяжка рабіла!"

"Я не хочу есці, дай мне толькі сесці.
А ты ехаў, а я йшла, чуць не вылезла й душа!"

Як у нашай Хрысці



Як у нашай Хрысці ўсё было скаціны:
Ой да Хрысцюшка, Хрысця — добра гаспадыня!
Карова Алена, бык та быў Ярома,
Кабыла ляніва, жарабец Гаўрыла,
Свіння та Аксіння, бораў быў Васілій,
Вутка та Агатка, селезень Ігнатка,
Курыца квахтуха, пятух быў Міцюха.
Як у нашай Хрысці што было скаціны!
Пасудзіце самі, што за гаспадыня!
На вячорках сёння ўсіх сяброў сабрала!

[1] Прыпеў "Ой ты, Галя..." паўтараецца пасля кожнай страфы.

Кант



Чалавек жыве на зямлі, як трава расце.
Ўсяка слава чалавека, яка цвет цвіце.

Хай будзе ён як дрэва пры патоках вод:
Ліст не вяне, ўсё, што робіць ён, — ўсё паспее.

Ад усходу да захаду хай будзе слава
Чалавеку, чыі жытніцы поўняцца хлебам!

(Песенны матэрыял узяты з архіва ІМЭФ НАН, апрацоўкі Янкі Кірчука, 1985 г.)

Крыніцы і іх умоўныя скарачэнні

Аляхновіч, 1991 — Аляхновіч А.М. Народныя песні ў мастацкай самадзейнасці. Мн., 1991.

Анічэнка, 1992 — Анічэнка У.В., Малюк А.К. Народныя прыкметы. Мн., 1992.

Арлова, 1995 — Арлова Г. Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы. Мн., 1995.

Берман, 1869 — Берман Иоанн. Порядок народного времяисчисления и праздничные обычаи в Северо-Западной Руси. Вильно, 1869.

БК, 1943 — Беларускі каляндар "Гаспадар". Беласток, 1943.

БНК, 1990 — Беларускія народныя казкі: Для дашкольнага ўзросту / Апрац. А. Якімовіча; Уклад. М.А. Казбярук. Мн., 1990.

БСК, 1937; 1939 — Беларускі сялянскі каляндар на 1937 г.; 1939 г. Вільня, 1937; 1939.

Булгакоўскі, 1890 — Булгаковский Д.Г. Пинчуки. СПб., 1890.

Бывалькевіч, 1891 — Бывалькевич П. Иван Купала // Этнографический сборник. 1891. №4.

Бяссонаў, 1871 — Бессонов П. Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, очерками народного обряда, обычая и всего быта. М., 1871.

Васілевіч, 1996 — Зямля стаіць пасярод свету... Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1 / Уклад. У. Васілевіч. Мн., 1996.

Гомельская вобл. — Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / Уклад. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцьвінка. Мн., 1989.

Вількін, 1970 — Вількін Я.Р. Беларускія народныя гульні. Мн., 1970.

Грудзінскі, 1993 — Грудзінскі У. Беларускія народныя гульні. Дулебы, 1993.

Дабравольскі, 1891; 1894; 1903 — Добровольский В.Н. Смоленский этнографический сборник. СПб., 1891; 1894; 1903.

Дабравольскі, 1914 — Добровольский В.Н. Смоленский областной словарь. Смоленск, 1914.

Дамбавецкі, 1882 — Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилевской губернии. Могилев-на-Днепре, 1882.

Дзмітрыеў, 1869 — Дмитриев М.А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края. Вильно, 1869.

Дзіцячы фальклор / Склад. Г.А. Барташэвіч, В.І. Ялатаў. Мн., 1972.

Драўлянскі, 1846 — Древлянский П. Белорусские народные поверья // Журн. Министерства народного просвещения. СПб., 1846. Прибавления. Кн. 1, 14.

Загадкі, 1972 — Загадкі / Склад. М.Я. Грынблат, А.І. Гурскі. Мн., 1972.

Земляробчы — Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / Уклад. А.І. Гурскі. Мн., 1990.

Зяленін, 1927 — Зеленин Д.К. Восточнославянская этнография. Пер. с нем. текста 1927 г. М., 1991.

КЗ, 1977 — Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы (конец XIX — начало XX в.): Весенние праздники. М., 1977.

КЗ, 1978 — Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: Летне-осенние праздники. М.: Наука, 1978.

КЗ, 1983 — Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: Исторические корни и развитие обычаев. М.: Наука, 1983.

Касько, 1997 — Касько У.К. Святло далёкай зоркі. Мн., 1997.

Кацар, 1996 — Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка. Мн., 1996.

Кіркор, 1858 — Киркор А.Г. Этнографический взгляд на Виленскую губернию // Этнографический сборник. Вып. 3. СПб., 1858.

Коваль, 1995 — Коваль У.І. Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы. Гомель, 1995.

Корава, 1861 — Корева А. Материалы для географии и статистики России. Виленская губерния. СПб., 1861.

Косіч, 1901 — Косич М.Н. Литвины-белорусы Черниговской губернии, их быт и песни // Живая старина. СПб., 1901. № 3—4.

Крачкоўскі, 1874 — Крачковский Ю.Ф. Очерки быта западнорусского селянина. М., 1874.

Легенды і паданні — Легенды і паданні / Склад. М.Я. Грынблат, А.І. Гурскі. Мн., 1983.

Ліс, 1974 — Ліс А.С. Купальскія песні. Мн., 1974.

Ліс, 1985 — Купальскія і пятроўскія песні / Уклад. А.С. Ліса, С.Т. Асташэвіч, Г.В. Таўлай. Мн., 1985.

Ліс, 1989 — Ліс А.С. Валачобныя песні. Мн., 1989.

Ліс, 1992 — Паэзія беларускага земляробчага календара / Уклад., уст. арт. А.С. Ліса. Мн., 1992.

Ліс, 1993 — Ліс А.С. Жніўныя песні. Мн., 1993.

Ліс, 1998 — Ліс А.С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў. Мн., 1998.

Літоўская гаспадыня — Літоўская гаспадыня, ці Навука аб утрыманні ў добрым стане хаты... / Пер. з польскай мовы П.Р. Казлоўскага, В.В. Нядзвецкай. Мн., 1993.

Лозка, 1993 — Лозка А. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993.

Лозка, 1996 — Гульні, забавы, ігрышчы / Скл. А. Лозка. Мн., 1996.

Ляснічы, 1990 — Ляснічы М.Я., Севярынец К.П. З глыбінь жыватворных. Мн., 1990.

Мажэйка, 1983 — Можейко З.Я. Песни Белорусского Полесья. Вып. 1. М., 1983.

Машынскі, 1928 — Moszczyński K. Polesie wschodnie. Warszawa, 1928.

Мінская вобл. — Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыцыйныя жанры: Мінская вобласць / Уклад. В. Дз. Ліцьвінка. Мн., 1995.

Невяровіч, 1859 — Неверович В. О праздниках, поверьях и обычаях у крестьян белорусского племени, населяющих Смоленскую губернию // Памятная книжка Смоленской губернии на 1859 год. Смоленск, 1859.

Ненадавец, 1993 — Ненадавец А.М. Святло таямнічага вогнішча. Мн., 1993.

Нікіфароўскі, 1897 — Никифоровский Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. Витебск, 1897.

Паўлюкоўскі, 1934 — Паўлюкоўскі У. Народны каляндар // Шлях моладзі. Вільня, 1934. № 1—13.

Помнікі этнаграфіі — Помнікі этнаграфіі / Пад. рэд. В.К. Бандарчыка. Мн., 1981.

Пракопчык, 1981 — Пракопчык Л. Адкуль у вёскі імя: Нарысы. Мн., 1981.

Проп, 1963 — Пропп В.Я. Русские аграрные праздники: Опыт историко-этнографического исследования. Л., 1963.

Прыказкі і прымаўкі — Прыказкі і прымаўкі: У 2 кн. / Склад. М.Я. Грынблат. Мн., 1970.

Пяткевіч, 1928 — Pietkiewicz Czesław. Polesie Rzeczyckie. Kraków, 1928.

Пяткевіч, 1938 — Pietkiewicz Czesław. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego. Materialy etnograficzne. Warszawa, 1938.

Раманаў, 1912 — Романов Е.Р. Белорусский сборник. Вып. 1—9. Вильно, 1886—1912.

Сакалова, 1979 — Соколова В.К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. М., 1979.

Санько, 1990 — Санько В., Шомадзі В. Народныя прыкметы // Беларусь, 1990.

Сахараў, 1936 — Беларускі каляндар. 1937 год / Уклад. С.Сахараў. Рыга, 1936.

Сахараў, 1940 — Сахараў С.П. Народная творчасць латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў. Рыга, 1940.

Сахараў, 1944 — Сахараў С.П. Народная творчасць латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў. Вып. 2. Рукапіс 1944 г. Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН.

Сержпутоўскі, 1911 — Сержпутовский А.К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков. СПб., 1911.

Сержпутоўскі, 1914 — Сержпутовский А.К. Бортничество в Белоруссии // Материалы по этнографии России. СПб., 1914. Т. 2.

Сержпутоўскі, 1930 — Сержпутоўскі А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Мн., 1930.

Слупскі, 1892 — Слупский А.И. Народный календарь // Альманах Северо-Западного календаря на 1892 г. Мн., 1892.

Сысоў, 1997 — Сысоў У.М. З крыніц спрадвечных. Мн., 1997.

Талстая — Толстая С.М. Полесский народный календарь. Д. —И. // Славянское и балканское языкознание. М., 1986.

Талстая, 1986 — Толстая С.М. Полесский народный календарь. Материалы к этнодиалектному словарю (К—П) // Славянский и балканский фольклор. М., 1986.

Тураўскі сл. — Тураўскі сл.: У 5-ці т. / Уклад. А.А. Крывіцкі, Г.А. Цыхун, І.Я. Яшкін і інш. Мн., 1982—1987.

Тышкевіч, 1847 — Tyszkiewicz E. Opisanie powiatu Borysowskiego. Wilno, 1847.

Уласаў, 1993 — Власов В.Г. Формирование календаря славян: Ранний период // Календарь в культуре народов мира. М.: Наука, 1993.

Усаў, 1997 — Русский народный православный календарь: В 2-х т. / Авт.-сост. В.В. Усов. М., 1997.

Цітоў, 1994 — Цітоў В.С. Народная спадчына. Мн., 1994.

Чурко, 1994 — Чурко Ю.М. Вянок беларускіх танцаў. Мн., 1994.

Шырма, 1947 — Шырма Р. Беларускія народныя песні, загадкі, прыказкі. Мн., 1947.

Шэйн, 1887; 1893; 1902 — Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 1, ч. 1. СПб., 1887; Т. 2. СПб., 1893; Т. 3. СПб., 1902.

Ярмолаў, 1901 — Ермолов А. Народная сельскохозяйственная мудрость в пословицах и поговорках и всенародный месяцеслов. СПб., 1901.



ЗМЕСТ

Укараненне ў практыку адукацыі традыцый народнай педагогікі. *Алесь Лозка* 5
Летні народны каляндар. *Алесь Лозка* 12
Метадычныя рэкамендацыі, сцэнарыі і дадатковы матэрыял 43

ДЗЕНЬ ІЛЬНУ 43
Адлюстраванне тэмы льну ў земляробчым календары. *Алесь Лозка* 43
Ткацтва 50
Прыкметы і павер'і 55
Гульні 56
Карагоды, танцы 57

КУПАЛЛЕ 63
З этнаграфічнай спадчыны Аляксандра Сержпутоўскага . 65
Купала 66
Іван Купала 68
Купалле на Шклоўшчыне 70
Гульня каля кастра на Купаллі 71
Купалле ў народнай мастацкай творчасці 71
Легенды 73
Гульні і забавы. *Алесь Лозка* 76
Песні 78

СВЯТА МЁДУ 83
Звініць-гудзе маленькая пчала 83
З этнаграфічнай спадчыны Аляксандра Сержпутоўскага . 85
Пчала 86
Бортніцтва 87
Пчала як сімвал працавітасці 92
Легенды 94
Прыкметы і павер'і 94
Загадкі 95
Прыказкі 96
Лічылка 97
Беларуская кухня 97

ЗАЖЫНКІ – ДАЖЫНКІ 99
"Барада" 99
Залом 100
Талака 101

"Добры вечар, Талака!" 102
Жніўны вянок 104
Сімвалы ўраджаю ў беларускім арнаменце 104
Чаму чалавек шануе хлеб (*легенда*) 107
Прыкметы і павер'і 107
Прыказкі і прымаўкі 111
Загадкі 111
Песні 112
"Дзе пачую талаку — туды ногі валаку" (*сцэнарый для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту*). *Янка Кірчук* . . 115

СВЯТА САДАВІНЫ 130
Прыкметы і павер'і 130
Дакраніся да яблыка (*гульня*) 131
Залатая яблынька (*казка*) 131
Беларуская кухня 134

ДАДАТАК 137
Назвы месяцаў 137
Мацей і Аўдзей на вячорках у Хрысці (*сцэнарый для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту*). *Янка Кірчук* 140

Крыніцы і іх умоўныя скарачэнні 157

Л52 **Летнія святы**: Дапам. для настаўнікаў і выхавальнікаў /Аўт.-уклад. А.Ю. Лозка. — Мн.: Беларусь, 2001. — 162 с.: іл. — (Бібліятэчка народных святаў і прысвяткаў).

ISBN 985-01-0009-5.

У дапаможніку змешчаны матэрыялы па летнім народным календары, метадычныя рэкамендацыі, сцэнарыі і іншыя матэрыялы для вывучэння і правядзення летніх святаў і прысвяткаў з арыентацыяй на традыцыйную культуру, здабыткі народнай педагогікі.

Адрасуецца педагогам і выхавальнікам.

УДК 371.893:398.332.1(=826)(072)
ББК 74.200.58

Вучэбнае выданне

Бібліятэчка народных святаў і прысвяткаў

ЛЕТНІЯ СВЯТЫ

Дапаможнік для настаўнікаў і выхавальнікаў

Аўтар-укладальнік **Лозка** Алесь Юр'евіч



Рэдактар *В. Я. Кудзіна*
Мастак *У. І. Сытчанка*
Мастацкія рэдактары *А. Г. Дашкевіч, А. П. Макаўцоў*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютэрная вёрстка
С. Л. Печанёвай, Ж. М. Голікавай
Карэктары *Л. Р. Кузьміна, Л. Б. Шынкевіч,*
Р. П. Іваненка, Н. Н. Масарэнка
Аператары *І. Л. Жукоўская, Т. А. Касцяневіч*

Падпісана да друку з арыгінала-макета 12.07.2001. Фармат $60\times90^{1}/_{16}$. Папера газетная. Гарнітура Таймс. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 10,25. Ум. фарб.-адб. 10,75. Ул.-выд. арк. 9,85. Тыраж 3738 экз. Зак. 1768.

Падатковая льгота — Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 007-98, ч. 1; 22.11.20.600.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларусь" Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 2 ад 31.12.97. 220004, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Друкарня "Перамога". 222310, Маладзечна, В. Таўлая, 11.



ISBN 985-01-0009-5

9 789850 100092 >

МІНСК
«БЕЛАРУСЬ»